ЧЫРВОНКА
Чырвонае Змена

Чым запомнілася сёлетняе цэнтралізаванае тэсціраванне? Нестандартныя сітуацыі, казусы, вынесеныя ўрокі.

Сярод усіх ягадных культур самай працаёмкай па барацьбе са шкоднікамі і захворваннямі з'яўляецца трускалка. Што трэба рабіць, каб атрымаць здаровыя і прыгожыя ягады?

СТАР. 5

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 25°
Віцебск	+23°
Гомель	+25°
Гродна	+ 17°
Магілёў	+20°
Мінск	+17°

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 21.06.2012 г.

Долар ЗША	8280,00	▼
Еўра	10500,00	▲
Рас. руб.	254,50	▼
Укр. грыўня	1024,94	▼

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр ЯКАБСОН, старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь:

На сёння ў Беларусі ўжо дакладна адпрацавана схема правядзення цэнтралізаванага тэсціравання, якая працуе без збояў, выключае магчымасць з'яўлення нейкіх карупцыйных момантаў, парушэнняў выяўляецца вельмі мала. У той жа час незалежны кантроль за гэтай важнай кампаніяй апраўданы. Гэта дае магчымасць забяспечваць аб'ектыўнасць, празрыстасць правядзення ўступных іспытаў. І кантрольную функцыю, якую выконвае сёння КДК, Міністэрству адукацыі перадаваць яшчэ рана.

ISSN 1990 - 763X

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

21 ЧЭРВЕНЯ 2012 г. ЧАЦВЕР № 118 (27233) Кошт 1200 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

КУРС ДЗЯРЖАВЫ НА ПАЛЯПШЭННЕ ЖЫЦЦЯ ЛЮДЗЕЙ

БУДЗЕ ПРАЦЯГНУТЫ І ПАСЛЯ ПАРЛАМЕНЦКІХ ВЫБАРАЎ

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу Беларусі Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА ў эксклюзіўным інтэрв'ю «Звяздзе» расказаў пра новыя заканадаўчыя рашэнні і падзяліўся думкамі па некаторых пытаннях парламенцкага жыцця.

— Уладзімір Паўлавіч, мяркуючы па нядаўняй бойцы дэпутатаў у Вярхоўнай Радзе Украіны, ды і па падобных падзеях у некаторых іншых парламентах, залы парламенцкіх пасяджэнняў пры пэўных абставінах становяцца даволі рызыкоўным месцам для работы. Ці мо гэта наўмысны дэпутацкі піяр?

— Я не хачу каментаваць тое, што па-за маральнымі абмежаваннямі. Мой калега, Старшыня Вярхоўнай Рады Украіны Уладзімір Літвін даў ацэнку гэтаму факту.

— Вы лічыце такія шакіруючыя прэцэдэнты непрымальнымі для беларускага парламентарызму?

— Не толькі для парламентарызму, а і ўвогуле для ўзаемаадносін паміж людзьмі.

— Што ж, на ваш погляд, застрахоўвае беларускі парламент ад вострых эмацыянальных сутычак, так сказаць, на грані, а то і за гранню фолу?

— Заканадаўчую справу як справу дзяржаўную катэгарычна нельга рабіць закладнікам распаленых эмоцый. Дэпутаты, да іх гонару, гэта разумеюць. Для нас галоўнае не спрэчкі дзеля спрэчак, людзям на пацеху, а кансалідаваная работа, якая прыносіла б адчувальны вынік.

— А як жа тады дыскусіі?

— Дыскусіі ў заканадаўчым органе ўлады — справа нармальная і неабходная. У Палаце прадстаўнікоў гэта неад'емны складнік заканатворчага працэсу. Кожны законапраект, асабліва які мае шырокае грамадскае значэнне, да ўнясення яго на разгляд дэпутатаў праходзіць некалькі этапаў абмеркаванняў, пачынаючы з так званага нулявога чытання з распрацоўшчыкамі. Затым праект заканадаўчага акта прапрацоўваецца на ўзроўні рабочых груп, спецыялістаў нашага Сакратарыята, профільных камісій, сумесных пасяджэнняў некалькіх камісій, прычым з удзелам адказных асоб міністэрстваў, ведамстваў, Савета Міністраў, Адміністрацыі Прэзідэнта, а таксама грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў.

СТАР. 2

ЯК ВЫ ВЫКАРЫСТОЎВАЕЦЕ МАГЧЫМАСЦІ САМЫХ ДОЎГІХ ДЗЁН ГОДА?

Наталля МАТЫЛІЦКАЯ, фальклярыстка, спявачка беларускіх песень:

— Цяпер перыяд доўгіх дзён — перадкупальскі, згодна з прыродным цыклам, летнім сонцазваротам. Традыцыйна гэты час выкарыстоўвалі для збору зёлак — яны набываюць самую моц. Таксама гэта час збору суніц. Зараз час росквіту ў прыродзе, яна аддае чалавеку найбольш сваёй моцы. Сучасныя людзі не ўсе пра гэта ведаюць. Нават тыя, хто ведае, не ўсе карыстаюцца гэтым, бо сучасны чалавек вельмі шмат працуе, не паспявае пабыць сам-насам з прыродай. Сёлета мне пашанцавала: я зараз на радзіме, на Случчыне. Стараюся атрымаць энергію ад сонца, ветру, нават дажджу. Адчуваю не толькі моц прыроды, але і моц малой радзімы, і моц успамінаў пра дзяцінства. Беларусам трэба ўспамінаць повязь з роднай зямлёй, напоўніцу атрымаць яе сілу ў гэтыя перадкупальскія дні.

Алена САЛАЎЁВА, шматдзетная маці, выхавальніца ў санаторнай школе-інтэрнаце № 9 г. Мінска:

— Мы не задумваліся пра тое, што зараз самыя доўгія дні, але, напэўна, падсвядома адчуваем гэта і сапраўды імкнёмся выкарыстаць — каб паболей бываць на прыродзе. Мы з дзецьмі зараз адпачываем у вёсцы, таму ёсць цудоўная магчымасць наталіцца радасцю, якую дорыць лета: вечар наступае пазней, больш светлага дня. Удзень цяпер вельмі горача, таму ходзім на рэчку. Асабліва меншым сынам гэта падабаецца — з вады не выцягнеш. Яшчэ ёсць магчымасць сабраць і пакаштаваць клубніцы, чарэшні. У гэтыя дні нам тут шчасціць з надвор'ем.

Міхась БАШЛАКОЎ, паэт:

— Як любы чалавек выкарыстоўваю — жыву. Трэба жыць. Як любіў паўтараць Леў Мікалаевіч Талстой: «Трэба рабіць, што трэба, і хай будзе, што будзе». І гэта ж любіў паўтараць Янка Брыль. Я паўтару за імі. Трэба рабіць тое, што наканавана. І не важна, ці гэта доўгі дзень, ці кароткі — усё адно трэба рабіць столькі, колькі можаш: чытаць, пісаць, хадзіць, адпачываць і гэтак далей. Я лічу, што трэба кожны дзень пражыць, і пражыць па магчымасці годна. А мы не заўсёды гэта ўмеем. І не хапае гэтага чалавечага жыцця з поўным наборам пачуццяў, таму што вельмі яно складанае і часам няўдзячнае. Але нават і тады трэба жыць...

Ларыса ЦІМОШЫК.

КАРАТКА

Па выніках саміту G-20, які ўчора завяршыўся ў мексіканскім Лос-Кабасе, члены «Вялікай дваццаткі» прынялі рашэнне аб выдзяленні дадаткова больш як $450 млрд у Міжнародны валютны фонд для пашырэння яго магчымасцяў у процідзеянні ўзнікаючым крызісам і іх прадухіленні.

У Мінску за студзень—май гэтага года ад фізічных асоб, якія атрымліваюць даходы ад здачы ў наём памяшканняў, у бюджэт горада паступіла Br11,2 млрд падаходнага падатку.

«Беларусбанк» адмяніў спагнанне ўзнагароджанняў за разгляд пакета дакументаў і суправаджэнне крэдытаў, прадастаўленых насельніцтву, што істотна скараціла памер штомесячных плацяжоў за карыстанне крэдытам.

УЛАДЗІМІР МАКЕЙ ПРАВЁЎ ПРЫЁМ ГРАМАДЗЯН У ВЁСЦЫ АЛЬШАНЫ СТОЛІНСКАГА РАЁНА

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Уладзімір Макей па даручэнні Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі правёў 19 чэрвеня прыём грамадзян у аграгарадку Альшаны Столінскага раёна, паведамляе тэлеканал «Беларусь-1».

На асабісты прыём да Уладзіміра Макея прыйшлі некалькі дзясяткаў чалавек. У час прыёму ўзніміліся пытанні выдзялення зямлі прыватнікам, размова ішла аб праблемах ЖКГ, добраўпарадкавання аграгарадка і яго поўнай газіфікацыі. Нагадаем, што ў Альшанах з рабочай паездкай у красавіку гэтага года пабываў Прэзідэнт Беларусі. Тады ён сустрэўся з мясцовымі жыхарамі, якія расказалі аб праблемах асабістых і ўсёй вёскі. Аляксандр Лукашэнка даручыў накіраваць у Альшаны для дэталёвага вывучэння сітуацыі рабочую групу. Па выніках сустрэчы Уладзіміра Макея з мясцовымі жыхарамі ў Альшаны будуць накіраваны спецыялісты, усе пытанні павінны быць вырашаны да восені, калі, як плануецца, Аляксандр Лукашэнка зноў наведае гэты край.

АЛЕГ СЛІЖЭЎСКІ НАЗВАЎ УМОВУ ПЕРАХОДУ НА ПРАПАРЦЫЯНАЛЬНУЮ ВЫБАРЧУЮ СІСТЭМУ

Каб у Беларусі дзейнічала прапарцыянальная або змешаная выбарчая сістэма, партыйны складальнік павінен быць высокага ўзроўню, гэта значыць партыі павінны мець рэальную сацыяльную падтрымку. Аб гэтым заявіў у час online канферэнцыі на сайце БЕЛТА міністр юстыцыі Алег Сліжэўскі.

Паводле яго слоў, пераход на нейкі іншы ўзровень выбарчай сістэмы патрабуе больш дасканалага вывучэння. Прычым у будучым гэта пытанне можа быць разгледжана. У грамадстве дэбаты на гэту тэму ўжо вядуцца. У прыватнасці, абмяркоўваецца пытанне, ці варта пераходзіць з мажарытарнай на прапарцыянальную або змешаную сістэму. «На сёння ў рэспубліцы добра зарэкамендавала сябе мажарытарная сістэма, якая дае магчымасць любому выбаршчыку ведаць у твар кандыдата, за якога ён галасуе, — адзначыў міністр. — Увядзенне прапарцыянальнай або змешанай сістэмы прадугледжвае, што галасаванне будзе весціся за нейкую канкрэтную партыю, яе палітычную праграму. Грамадзянін не заўсёды ўжо будзе ведаць, хто непасрэдна персанальна трапіць у парламент».

У Беларусі зарэгістравана 15 палітычных партый. Колькасць большасці з іх нязначна перавышае мінімальна ўстаноўленую заканадаўствам планку 1 тыс. чалавек. «Аб чым гэта сведчыць? Нейкай сур'ёзнай падтрымкі з боку насельніцтва палітычныя партыі не маюць», — лічыць Алег Сліжэўскі.

АЛІМЕНТЫ ПРЫВЯЖУЦЬ ДА СЯРЭДНЯЙ ЗАРПЛАТЫ ПА КРАІНЕ

Аб гэтым паведаміў міністр юстыцыі Алег Сліжэўскі. У ліпені 2012 года ўступае ў сілу закон, які ўносіць змяненні ў Кодэкс аб шлюбе і сям'і. У прыватнасці, ён зменіць парадак разліку запазычанасці па аліментах. «Пасля ўступлення ў сілу адпаведнай нормы пры разліку запазычанасці па аліментах судовы выканаўца будзе зыходзіць з сярэдняй заработнай платы работніка ў цэлым па рэспубліцы, а не з сярэдняй зарплаты ў тым рэгіёне, дзе пражывае даўжнік (такая норма дзейнічае цяпер. — **Заўвага БЕЛТА**)». Такое рашэнне было прынята, каб пазбегнуць сітуацыі, калі бакі будуць пражываць у розных рэгіёнах з розным узроўнем сярэдняй зарплаты.

Гэтыя змяненні будуць датычыцца толькі тых выпадкаў, калі даўжнік не працуе. Калі ж ён мае пастаянны даход, то будзе дзейнічаць ранейшы парадак — адпаведны працэнт будзе вылічаны з яго заработнай платы.

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

22 чэрвеня 2012 года ў 15.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) адбудзецца пасяджэнне восьмай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

КУРС ДЗЯРЖАВЫ НА ПАЛЯПШЭННЕ ЖЫЦЦЯ ЛЮДЗЕЙ БУДЗЕ ПРАЦЯГНУТЫ І ПАСЛЯ ПАРЛАМЕНЦКІХ ВЫБАРАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Уяўляеце, якая гэта карпатлівая, працяглая і, я сказаў бы, шматслойная экспертыза, прычым як у перыяд да першага чытання законапраекта, так і да другога? Тут і сутыкненні розных думак, і кансультацыі, і ўзгадненні, і, бывае, работа над дакументам, як кажуць, ідзе па новым крузе. Гэта асноўная частка заканатворчага працэсу, хаця і нябачная збоку. А разгляд законапраектаў у Авальнай зале завяршае і падсумоўвае іх прапрацоўку, калі ўсе прынцыповыя пытанні ўжо ўзгоднены, таму праходзіць у дзелавым тонусе.

— Непаразуменні ў ходзе абмеркавання узнікаюць?

— А што такое, скажыце, непаразуменні, як не роскід думак? Але мы разам з нашымі партнёрамі па заканатворчасці заўсёды імкнёмся адшукаць у ім найбольш істотны канструктыў, залатую сярэдзіну, прымальную для ўсіх, і прыходзім да згоды.

— І які галоўны крытэрый гэтай залатой сярэдзіны?

— Карысць заканадаўчых прапаноў для развіцця краіны, для эканомікі ці іншага сегмента грамадскага жыцця, карысць для людзей.

— Калі з гэтай пазіцыі паглядзець на заканатворчы прадукт, створаны за мінулы перыяд падыходзячай да завяршэння дзясятай сесіі Палаты прадстаўнікоў, то што вы акцэнтуеце ў ім?

— Вельмі вялікая комплексная работа была праведзена па праекце новага Жыллёвага кодэкса. У працэсе яго абмеркавання з актыўным удзелам грамадскасці паступіла больш за 4 тысячы заўваг і прапаноў. Усе яны былі разгледжаны і прааналізаваны профільнай камісіяй. Самае канструктыўнае зафіксавана ў канчатковым тэксце дакумента. Яшчэ адзін законапраект вялікага і доўгачасовага значэння, прыняты на сесіі, — «Аб дзяржаўнай інавацыйнай палітыцы і інавацыйнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь», які пацвярджае неаслабную ўвагу дзяржавы да стымулявання інавацыйнага развіцця эканомікі і краіны. Істотнымі новаўвядзеннямі папоўніўся Банкаўскі кодэкс, адкарэкціраваны ў першым чытанні. Навацыі паспрыяюць умацаванню фінансавай сістэмы і павышэнню яе эфектыўнасці ў вырашэнні эканамічных задач.

Што датычыцца іншых напрамкаў удасканалення прававой базы, то я адзначыў бы ў першую чаргу рашэнні, накіраваныя на замацаванне пазітыўных працэсаў у дзелавым клімаце. Гэта прававая рэгламентацыя камерцыйнай тайны, эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтва), папраўкі ў заканадаўства аб прававой ахове аб'ектаў прамысловай уласнасці, аб прыродакарыстанні, аб аўдытарскай дзейнасці, аб рынку каштоўных папер, у кодэксы аб зямлі і аб недрах. Адзначу таксама ратыфікацыю новых пагадненняў удзельнікаў Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы Беларусі, Расіі і Казахстана, пагадненняў па эканамічных пытаннях з Расійскай Федэрацыяй і Украінай, пагаднення з фінансавай структурай Арганізацыі Аб'яднаных Нацый — Шматбаковым агенцтвам па гарантыях інвестыцый і Дагавора аб зоне свабоднага гандлю.

Умацоўваецца прававое поле нацыянальнай бяспекі. Мы завяршылі карэкціроўку заканадаўства аб прафілактыцы безнагляднасці і правапарушэнняў непаўналетніх, па пытаннях абароту зброі і ахоўнай дзейнасці, дзейнасці органаў унутраных спраў. Працэдуру першага чытання прайшоў праект Закона «Аб наркатычных сродках, псіхатропных рэчывах, іх пракурсорах і аналагах». Ствараецца прававая аснова дзейнасці Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь.

У сацыяльным блоку заканадаўчых рашэнняў выдзелю новыя прававыя меры па стварэнні дзяржавай дадатковых гарантый забеспячэння занятасці насельніцтва, па аптымізацыі сацыяльнага абслугоўвання, па пытаннях трансплантацыі органаў і тканак чалавека, а таксама змяненні і дапаўненні ў шэраг законаў культурнай сферы.

— Важнай падзеяй у ходзе гэтай сесіі Палаты прадстаўнікоў стала Пасланне кіраўніка дзяржавы А.Р. Лукашэнкі беларускаму народу і парламенту. Па якой траекторыі ў заканатворчай рабоце рэалізуюцца ідэі, выказаныя ў Пасланні?

— Яна адпавядае задачам, пастаўленым Прэзідэнтам, і прыярытэтам сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, вызначаным на чацвёртым Усебеларускім народным сходзе. Прапануемыя ў заканадаўства новаўвядзенні мы разглядаем найперш праз прызму іх карысці для рэальнага сектара эканомікі і сацыяльнай палітыкі, для суб'ектаў гаспадарання і з улікам комплексу іншых фактараў, ад якіх залежыць эфектыўнасць нарматыўна-прававога рэгулявання. На першым плане своечасовасць і запатрабаванасць прававых навацый, іх абгрунтаванасць і яснасць.

— У маі ў Санкт-Пецярбургу адбыліся традыцыйныя парламенцкія мерапрыемствы па лініі міжпарламенцкіх асамблей Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Еўразійскай эканамічнай супольнасці і Парламенцкай асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, у якіх удзельнічала і беларуская дэлегацыя. Як вы лічыце, Уладзімір Паўлавіч, ці не зменшылася роля шырокафарматных сустрэч цяпер, калі эпіцэнтр міжпарламенцкага супрацоўніцтва відавочна змясціўся ў больш вузкі, але больш значны фармат Адзінай эканамічнай прасторы Беларусі, Расіі і Казахстана, якая ў недалёкім будучым стане Еўразійскім эканамічным саюзам?

— Значэнне міжпарламенцкага ўзаемадзеяння не зменшылася. Наадварот, такі шырокі дыялог парламентарыяў неабходны ўсім яго ўдзельнікам. 20-гадовы вопыт Міжпарламенцкай асамблеі СНД і маладзейшых асамблей ЕўрАзЭС і АДКБ сведчыць, што міжпарламенцкія сувязі адыгрываюць асаблівую ролю ў міждзяржаўных адносінах, перш за ўсё ў гарманізацыі нацыянальнага заканадаўства. Стварэнне Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы Беларусі, Расіі і Казахстана адкрыла новыя магчымасці для дасягнення якасна больш высокага ўзроўню адносін нашых трох парламентаў. Разам з тым гэта і дадатковы рэсурс для паглыблення ўзаемадзеяння парламентарыяў у кантэксце ЕўрАзЭС і СНД. Такая формула нарошчвання міжпарламенцкіх сувязяў мне бачыцца перспектыўнай.

— Не за гарамі стварэнне парламенцкай структуры Адзінай эканамічнай прасторы? Гэта будзе Еўразійская міжпарламенцкая асамблея?

— Давайце не апярэджваць падзеі. На сустрэчы кіраўнікоў парламентаў дзяржаў-удзельніц АЭП мы дамовіліся, што свае прапановы выкажа спецыяльна сфарміраваная для гэтага рабочая група. У нас агульная думка, што дыялог заканадаўцаў Беларусі, Расіі і Казахстана павінен узмацніцца. У парламентарыяў наперадзе шмат разнастайнай і насычанай работы.

— Бліжэйшыя месяцы стануць перыядам падрыхтоўкі да маючых адбыцца восенню выбараў у Палату прадстаўнікоў. Радыкальныя апазіцыйныя колы ўжо раскручваюць свае паліттэхналогіі.

— На пустой рыторыцы далёка не заедзеш. Калі няма шырокага даверу людзей, то ніякія паліттэхналогіі не дапамогуць. Я ўпэўнены, што выбаршчыкі аддадуць перавагу тым кандыдатам у дэпутаты, якія ў раёнах і гарадах маюць заслужаны аўтарытэт, сталую дзелавую рэпутацыю, могуць вырашаць канкрэтныя пытанні і па сваім патэнцыяле дастойны прадстаўляць інтарэсы людзей у парламенце.

— Як вы мяркуеце, чым, акрамя палітычных мэтаў, тлумачыцца негатыўнае стаўленне радыкальнай апазіцыі да дзейнай улады, у тым ліку і Палаты прадстаўнікоў, прычым па любых пытаннях?

— Тым, што ўлада не дапусціла і не дапусціць аддзялення дзяржавы ад людзей. Тым, што ўсе галіны ўлады кансалідавана вырашаюць існуючыя праблемы, праводзяць узаемна адказную, зразумелую людзям палітыку.

— Вы, Уладзімір Паўлавіч, рэгулярна наведваеце працоўныя калектывы, сустракаецеся з вяскоўцамі, рабочымі, інтэлігенцыяй. Напэўна, у вас цікавяцца і парламенцкімі выбарамі. Ці сфарміравалася ў вас меркаванне, што ў выбарчай кампаніі будзе для людзей галоўным?

— Для абсалютнай большасці людзей, як я пераканаўся, галоўным з'яўляецца тое, каб ажыццяўляемы дзяржавай курс на захаванне палітычнай і грамадскай стабільнасці, на паляпшэнне якасці жыцця ў краіне працягваўся. Я ўпэўнены, што так і будзе.

Аляксандр ФІЛІМОНАЎ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ГЕРМАНІІ НЕ ВЫЖЫЦЬ БЕЗ ІМІГРАНТАЎ?

Два нямецкія публіцысты левага толку — Маціас Цімэ і Піт фон Бебенбург — напісалі кнігу «Германія без замежнікаў», у якой паспрабавалі ацаніць наступствы гіпатэтычнай высылкі ўсіх імігрантаў з ФРГ, піша The Local. На думку аўтараў, апынуўшыся без турак, арабаў, афрыканцаў і выхадцаў з Усходняй Еўропы, Германія апынецца ў бядотным становішчы. Даследчыкі лічаць, што рэзка скароцяцца паступленні ў бюджэты ўсіх узроўняў, могуць знікнуць цэлыя галіны, якія залежаць ад таннай рабочай сілы, ВУП краіны скароціцца на 8 працэнтаў, пенсійны ўзрост будзе павышаны да 67 гадоў, а ў краіне вырасце ўзровень злачыннасці.

Акрамя таго, аўтары папярэдзілі, што масавая дэпартацыя іншаземцаў можа прывесці да грамадзянскай вайны, паколькі многія адмовяцца з'язджаць. Акрамя таго, падобны крок прывядзе да выхаду Германіі з ЕС, увядзення супраць яе эканамічных санкцый, міжнароднай ізаляцыі і пагаршэння іміджу краіны ў свеце.

ЧЫРВОНЫ ПЕРАЦ, БУЛЬБА І КУРЫНАЯ ГРУДКА ПАМЯНШАЮЦЬ ХРАНІЧНАЕ ЗАПАЛЕННЕ

Недахоп вітаміну B_6 можа стаяць за хранічным запаленнем, робяць выснову даследчыкі. Хранічнае запаленне павышае рызыку хвароб сэрца, інсульту і дыябету 2 тыпу, піша WebMD. У ходзе даследавання, вынікі якога выйшлі на старонках часопіса Journal of Nutrition, эксперты параўналі паказчыкі вітаміну і 13 розных індыкатараў запалення ў 2229 чалавек. Аказалася, уладальнікі самых значных паказчыкаў агульнага запалення вызначаліся самай нізкай канцэнтрацыяй вітаміну ў крыві. Вітамін B_6 можна знайсці ў курынай грудцы, рыбе, бабовых, гародніне, уключаючы чырвоны перац і бульбу. Гэты вітамін важны для нармальнага праходжання больш за 100 абменных працэсаў.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

КАНДЫДАТ У ПРЭЗІДЭНТЫ ЗША: РАСІЯ — НАШ ГЕАПАЛІТЫЧНЫ ПРАЦІЎНІК

Кандыдат у прэзідэнты ЗША ад Рэспубліканскай партыі Міт Ромні раскрытыкаваў кіраўніцтва Расіі. У прыватнасці, амерыканскі палітык ахарактарызаваў РФ як «геапалітычнага суперніка» і падкрэсліў, што Масква праводзіць курс, які «цалкам супрацьлеглы» палітыцы ЗША, паведамляе CBS News. «Краіна, якая на міжнароднай арэне пастаянна ўстае на нашым шляху — гэта Расія. Вядома, мы не ворагі, мы не вядзём баявых дзеянняў адзін супраць другога, і гэта не «халодная вайна «, але не варта сумнявацца, што Расія — наш геапалітычны праціўнік», — заявіў Ромні. «Я думаю, што гэта было вялікай памылкай — здаць свае пазіцыі і дазволіць ім (РФ) атрымаць тое, што яны маюць зараз. Прэзідэнт праявіў празмерную наіўнасць, перастаўшы правільна ацэньваць сілы», — дадаў палітык, каментуючы, на яго думку, занадта мяккую палітыку, якая праводзіцца цяперашнім прэзідэнтам Баракам Абамам.

Адзначым, што, паводле апытанняў, рэйтынг кандыдата-рэспубліканца крыху адстае ад рэйтынгу дзейнага прэзідэнта Б. Абамы. Не выключана, што менавіта Ромні пасля лістападаўскіх выбараў можа стаць гаспадаром Белага дома на наступныя чатыры гады.

■ Купалавыя дні

34 НЕВЯДОМЫЯ

НОВЫЯ дакументы сталі даступнымі даследчыкам творчасці Янкі Купалы.

Не арыгіналы, але копіі дакументаў, знойдзеных у расійскіх архівах, перадаў у Дзяржаўны музей Янкі Купалы **Уладзімір АДАМУШКА, дырэктар дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Беларусі.** Гэта адбылося на адкрыцці X Міжнародных Купалаўскіх чытанняў.

Гэта раней невядомыя дакументы, якія датычацца біяграфіі Янкі Купалы, але не знайшлі свайго адлюстравання ў яго поўным зборы твораў. Дакументы з расійскіх архіваў удалося атрымаць дзякуючы сумеснаму супрацоўніцтву архівістаў. Арыгіналы захоўваюцца ў Дзяржаўным архіве Расійскай Федэрацыі і Расійскім дзяржаўным архіве літаратуры і мастацтва. Самыя раннія з іх адносяцца да 1911, 1918, 1919 гадоў.

— Гэта лісты Мікалая Андрэевіча Янчука — вядомага вучонага-славіста, фалькларыста, этнографа, пісьменніка, які пісаў на рускай, украінскай, беларускай, польскай мовах і роднай палескай гаворцы — і Фёдара Фёдаравіча Турка — гісторыка і грамадскага дзеяча, прафесара — да перакладчыка, складальніка і рэдактара першага зборніка твораў Купалы на рускай мове, — тлумачыць Уладзімір Адамушка. — У лістах адлюстравана гісторыя зборніка ад ідэі да яе канчатковай рэалізацыі. 19 лістоў Янчука датуюцца 1911-м і 1919-м гадамі. Гэта перапіска двух даўніх знаёмых і сяброў, якія, акрамя прыватных спраў і агульных праблем таго часу, абмяркоўваюць і «беларускае пытанне», выданне часопіса, кніг і інш. Ёсць у лістах старонкі, звязаныя з імем Янкі Купалы, адлюстравана рэалізацыя падрыхтоўкі да выдання названага зборніка. Сярод лістоў ёсць тры вершы Янчука на палескай гаворцы, у тым ліку прысвечаныя Янку Купалу. Сярод копій дакументаў прысутнічаюць і тры невядомыя дароўныя надпісы Янкі Купалы Міхаілу Ісакоўскаму. У летапісе жыцця і творчасці ўсе тры аўтографы не значацца... Не менш цікавай і каштоўнай часткай копій з'яўляецца пратакол агульнага сходу пярвічнай арганізацыі Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР ад 14.08.38 года і матэрыялы аб дзейнасці Янкі Купалы і іншых пісьменнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Пратакол ад 4 жніўня 1938 года адлюстроўвае вельмі трагічны перыяд у жыцці пісьменніцкай арганізацыі БССР. Абмяркоўвалася пытанне аб стварэнні пры Саюзе пісьменнікаў групы спачуваючых. Для таго, каб вырашыць канчаткова: «яны з намі ці яны павінны адысці ад нас?» У гэтую групу залічваліся Янка Купала з Якубам Коласам. Для індывідуальнай палітычнай працы з імі прымацоўваліся праверанае камуністы...

З іншымі дакументамі перыяду Вялікай Айчыннай вайны перададзены пратакол ад 5.10.41 года ўстаноўчага сходу прадстаўнікоў славянскіх народаў у Маскве. Сярод прысутных вядомых пісьменнікаў славянскіх краін, такіх як Талстой, Карняйчук, Васілеўская, Фадзееў, Стаянаў, значыцца і Янка Купала. Як і ўсе іншыя, ён стаў членам Усеславянскага камітэта. Гэта дата ў летапісе жыцця і творчасці таксама не адзначана.

Дырэктар музея Янкі Купалы Алена ЛЯШКОВІЧ не хавала ўзрушэння ад падарунку. Цяпер варта чакаць, што скажуць даследчыкі пасля вывучэння гэтых дакументаў. Таму што ўвага навукоўцаў да творчасці Янкі Купалы вельмі вялікая. І ў ёй далёка яшчэ не ўсё вядома. Зрэшты, дзеля таго, каб ліквідаваліся прабелы, белыя плямы, каб лепш разумець нейкія спрэчныя моманты ў творчасці Песняра, і ладзяцца Купалаўскія чытанні. Сёлета ў іх бяруць удзел навукоўцы з Беларусі, Украіны, Польшчы.

Нічога дзіўнага: Купала належыць не толькі Беларусі, але і Еўропе. Гэта адзначыў, напрыклад, **Мар'ян СЕРВАТКА**, пасол Славакіі ў Беларусі, якога асабліва прывабіла магчымасць пачытаць вершы Янкі Купалы на беларускай мове. Але спадар пасол паразважаў на прыкладзе нашага паэта пра тое, што лёс народаў бывае вельмі падобны:

— Абодва нашыя народы прайшлі праз выпрабаванне. Славакам таксама пагражала знікненне роднай мовы. За выкарыстанне славацкай мовы можна было трапіць у турму, было шмат арыштаў і ахвяр... Мы мала ведаем адзін пра аднаго. Але насамрэч у малых славянскіх народаў ёсць глеба і жаданне супрацоўнічаць. Напрыклад, у гуманітарнай сферы: з'яўляюцца пераклады, манаграфіі, кнігі. Мы вітаем ініцыятывы, каб пацвердзіць феномен надзвычайнай існасці моў нашых народаў. Асабліва хачу падзякаваць Міколу Трусу, аўтару кнігі «Янка Купала ў Славакіі».

Калі для беларусаў Янка, то для славакаў і ўкраінцаў — Янко. **Прафесар Раман ЛУБКІЎСКІ**, прадстаўнік Украіны, сказаў, як паэт пра паэта:

— Янка Купала — сімвал нацыянальнага адраджэння беларускага народа. Прадцеча адноўленай незалежнай дзяржавы Беларусі. Гэта аксіёма. Аднак трагедыя яго жыцця — асабістага і грамадскага, — не прачытана яшчэ так грунтоўна, каб назаўсёды адкінуць папярэднюю ідэалогію, штампы і клішэ, якія наклаліся на вобраз генія свайго часу. Беларускія патрыярхі слова, асабліва Купала, абавязаны былі гаварыць голасам цэлага народа, усёй нацыі, пазбаўленай калісьці права «людзьмі звацца», а ў 30-40 гады мінулага стагоддзя права і на нацыянальную ідэнтычнасць, на родную мову, на культуру. Паўнацэнны, сапраўдны, вялікі, бессмяротны Купала яшчэ паўстане перад сваім народам, перад Еўропай і цэлым светам — калі будзе здзейснены поўны грунтоўны аналіз усёй творчай спадчыны пісьменніка, калі адкрыюцца ўсе дакументы і матэрыялы, якія не ведаем дагэтуль... Мысленне Янкі Купалы планетарнае. Але яно беларускае, укаранёнае ў родную зямлю. І нам ва Украіне да гэтай асобы трэба прыглядацца: асабліва зараз, калі ўзнікае неабходнасць адстойваць ужо сваю мову, якой, здавалася, за дваццаць гадоў незалежнасці нічога не пагражае.

Тадэвуш СТРУЖЭЦКІ, намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь:

— Беларускі народ мае сваю плеяду нацыянальных дзеячаў, адданых інтарэсам сваёй радзімы: геніяў, якім яшчэ ў старажытнасці далі трапнае найменне — прарокі. Сярод іх народны паэт Беларусі Янка Купала, 130-годдзе якога адзначаецца не толькі ў нашай краіне, але і ва ўсім свеце. Творчая спадчына Песняра — прыклад адданасці і непахіснай веры ў будучыню свайго народа, у росквіт беларускай дзяржавы. Таму юбілей Купалы адзначаецца так, як і павінен ушаноўвацца Пясняр беларускай зямлі, чалавек, які ўнёс не толькі незвычайна важны ўклад у развіццё беларускай літаратуры. Але гэта і чалавек, які спрыяў і сёння спрыяе фарміраванню, узвышэнню нацыянальнай самасвядомасці беларусаў. Я думаю, што, дзякуючы юбілейным мерапрыемствам, у нас гэтыя пачуцці будуць узбуджацца.

Кожны, хто хоча прычыніцца да святкавання, можа гэта зрабіць. 5 ліпеня адбудзецца ўрачыстае ўскладанне кветак да помніка Купалы ў Мінску. 7 ліпеня ў Вязынцы адбудзецца вялікае літаратурнае свята. Можна прыехаць у прыгожы куточак і далучыцца да паэтычнай спадчыны Купалы і адчуць дух, водар беларускай зямлі, на якой нарадзіўся і выхаваўся наш слынны паэт.

Ларыса ЦІМОШЫК

■

■ Працяг тэмы

ІНТРЫГА ВАКОЛ МІНСКАГА МІКРАРАЁНА УРУЧЧА-2 ЯШЧЭ ЗАХОЎВАЕЦЦА

20 чэрвеня ў Мінскім гарвыканкаме адбылася прэс-канферэнцыя з нагоды забудовы мікрараёна Уручча-2, у якой прынялі ўдзел прадстаўнікі Мінскага гарадскога камітэта архітэктуры і горадабудаўніцтва, «Мінскграда», Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

Старшыня Камітэта архітэктуры і горадабудаўніцтва, галоўны архітэктар г. Мінска Аляксандр ПЯТРОЎ агучыў журналістам звесткі, паводле якіх будаўніцтва запланаваных дамоў у гэтым мікрараёне не супярэчыць нарматывам і не з'яўляецца пераўшчыльненнем. (Газета «Звязда» падрабязна пісала аб гэтай праблеме ў сваіх мінулых выпусках — глядзіце артыкул **«Вокны з відам на гмах». Мінск працягвае ўшчыльняцца. Гараджане пратэстуюць...» ад 19 чэрвеня і артыкул «Мінск — горад з самай шчыльнай забудовай сярод еўрапейскіх гарадоў-мільённікаў» ад 20 чэрвеня**).

Па словах Аляксандра Пятрова, на Захадзе кожны шматпавярховы дом мае пэўныя межы зямельнага ўчастка, і людзі ведаюць, што ўсё, што ў гэтых межах — іх тэрыторыя, а вось за гэтымі межамі пачынаецца тэрыторыя горада. Там прысутнічае дакладнае разуменне свайго і чужога. У нас гэтага няма, таму што тэрыторыя замацавана за дамамі толькі па перыметры будынка. Гэта адбываецца таму, што ў савецкі час практыкавалася мікрараённая забудова, якая з'яўляецца прамым працягам сацыялістычнага падыходу да праблемы жылля. Тэрыторыі мікрараёнаў у нас забяспечаны ўсімі неабходнымі сацыяльнымі дабротамі згодна з прынятымі нарматывамі. Але ўсё гэта разлічана не на канкрэтныя дамы, а прызначана ў цэлым для мікрараёна. На мікрараён разлічваліся ўсе параметры: і азеляненне, і насычанасць дзіцячымі пляцоўкамі і інш. Сёння вылучыць кожнаму дому сваю асобную тэрыторыю, захаваўшы пры гэтым сацыяльныя стандарты, практычна немагчыма.

— У выніку нашымі людзьмі ўсё, што яны бачаць са свайго акна, успрымаецца як іх уласнасць, — наракае галоўны архітэктар сталіцы. — Хоць пры гэтым за дадатковыя тэрыторыі ніхто не плаціць. Камусьці пашанцавала, і ў яго каля дома знаходзіцца вялікая зялёная тэрыторыя, а ў кагосьці праз дарогу — завод, але ён плаціць за кватэру столькі ж, колькі першы. Таму што ў квартплату ўваходзіць плата за ўсё, што знаходзіцца па перыметры жылога дома — за астатняе плаціць горад. Але ў гэтым, на думку А. Пятрова, ёсць пэўная несправядлівасць.

— Пытанне можа хутка быць вырашана, — кажа галоўны сталічны архітэктар. — Мясцовай адміністрацыі дастаткова разлічыць рэальныя зялёныя тэрыторыі, свабодныя ад забудовы, і раскласці кошт аплаты за іх на жыхароў бліжэйшых дамоў. Паверце, 90% жыхароў тут жа скажуць: нам не патрэбна гэтая тэрыторыя. Гэта маё меркаванне...

Аляксандр Пятроў адмёў папрокі жыхароў у тым, што нікога не хвалюе, што інжынерныя сеткі старыя і могуць не вытрымаць нагрузкі. «Калі мы размяшчаем дамы, першае, што мы пачынаем ацэньваць — гэта магчымасць дадатковай нагрузкі на сацыяльныя ўстановы і інжынерныя камунікацыі», — заявіў старшыня Мінскага гарадскога камітэта архітэктуры і горадабудаўніцтва.

Ён нагадаў, што цяпер на кожнага жыхара Уручча-2 прыпадае 15,8 м² зялёных насаджэнняў. Калі б усе запланаваныя дамы былі пабудаваны, то стала б 13,6 м²/чал. У той жа час нормы патрабуюць мець зялёных насаджэнняў 9-10 м²/чал.

Адзначыў А. Пятроў і тое, што «мы не можам кінуць тых дольшчыкаў, якія плануюць там будавацца і ўжо ўнеслі грошы».

Як заяўляюць прадстаўнікі Мінгарвыканкама, пытанне з Уруччам-2 будзе вырашана з максімальным улікам інтарэсаў усіх бакоў. Максімальным, але не поўным, таму што ў гэтай сітуацыі ўсіх задаволіць немагчыма. Ужо цяпер А. Пятроў паабяцаў, што ўсе запланаваныя дамы пабудаваны не будуць, але колькі іх будзе ўсё ж узведзена ў мікрараёне, ён пакуль сказаць не можа, таму што гэта пытанне яшчэ разглядаецца.

Мяркуючы па ўсім, сённяшняя прэс-канферэнцыя мае мэтай падрыхтоўку грамадскай думкі да ўспрыняцця рашэння, якое хутка павінны абвясціць мінскія ўлады. Сітуацыя павінна вырашыцца на працягу бліжэйшых некалькіх дзён. Мы паведамім нашым чытачам аб прынятым рашэнні па забудове Уручча-2.

Святлана БУСЬКО.

ХТО ЗНЯВЕЧЫЎ БАКЛАНАЎ

Па факце жорсткага абыходжання з бакланамі ў Чашніцкім раёне на возеры Лукомскае міліцыя праводзіць праверку, паведаміў БЕЛТА начальнік Чашніцкага РАУС Міхаіл Дзядзічкін.

У РАУС паступіла заява з мясцовага сельсавета аб тым, што ў калоніі бакланаў і чапляў на возеры Лукомскае выяўлены дзясяткі птушанят бакланаў з адрэзанымі наддзюбкамі. Гэта стала падставай для праверкі. Першапачатковыя следчыя дзеянні прадугледжваюць выяўленне кола асоб, якія могуць мець дачыненне да гэтага факта. Цяпер апытваюцца паляўнічыя, рыбакі, адпрацоўваюцца бліжэйшыя населеныя пункты і прадпрыемствы, якія займаюцца гадоўляй рыбы, растлумачыў начальнік РАУС. Ён не выключыў, што запыты па гэтым факце будуць накіраваны і ў суседнія рыбгасы.

Бакланы харчуюцца рыбай і наносяць адчувальную шкоду рыбнай гаспадарцы. У сувязі з гэтым птушка аднесена да непажаданых відаў. Начальнік РАУС не выключыў таго, што некаторыя рыбгасы або прыватныя арандатары могуць прымаць часткі тушак бакланаў як доказ іх адстрэлу і, зыходзячы з гэтага, выплачваць паляўнічым узнагароду.

На правядзенне праверкі адводзіцца дзесяць дзён, пасля чаго матэрыялы будуць перададзены ў Следчы камітэт для прававой ацэнкі. У адпаведнасці з заканадаўствам, за жорсткае абыходжанне з жывёламі прадугледжана адміністрацыйная адказнасць — пакаранне ў выглядзе штрафу.

Як паведаміў **начальнік Чашніцкай раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Юрый ЧАРНАВУСАЎ**, раённай камісіяй па дапамозе дзікім жывёлам прынята рашэнне аб адлове знявечаных птушанят і іх забойстве. Пакуль іх кормяць бацькі, але птушаняты вось-вось павінны пачаць есці самастойна. «Гэта адзінае выйсце, каб не даць ім памерці пакутлівай галоднай смерцю», — перакананы суразмоўца. Да ўдзелу ў аперацыі будуць прыцягнуты эколагі, ветэрынарны ўрач і супрацоўнікі МНС.

Першымі пра бакланаў з адрэзанымі наддзюбкамі даведаліся арнітолагі, якія прыбылі на востраў для вывучэння змяшанай калоніі птушак: белай і шэрай чапляў і бакланаў. На іх думку, дзюбы птушанятам адрэзалі ў ноч на 16 чэрвеня

■

МАЛАНКА ЗАБІЛА ДАГЛЯДЧЫКА ЖЫВЁЛЫ

Бяда здарылася а палове восьмай гадзіны вечара паміж вёскамі Ясень і Асяродак у Асіповіцкім раёне.

Тут пры выпасе кароў разрадам маланкі быў забіты 32-гадовы мужчына, даглядчык жывёлы сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва «Калгас «Ясень». Малады чалавек пражываў адзін у вёсцы Ясень.

Сяргей РАСОЛЬКА.

АБЗАЦ

◢ Аб'ём набытай фізічнымі асобамі ў банкаў Беларусі наяўнай замежнай валюты за студзень—май 2012 года знізіўся на 36,5 працэнта ў параўнанні з аналагічным перыядам 2011-га і склаў $1753,8 млн у эквіваленце. Пры гэтым за май гэтага года было куплена $452,2 млн, што ў 4,8 раза перавышае вынік мая 2011-га і на 33,4 працэнта больш за паказчык красавіка 2012 года.

◢ **Аднапавярховы будынак для часовага ўтрымання катоў і сабак на перыяд адсутнасці іх уладальнікаў будуюць на вул. Гурскага ў Мінску. У гасцініцы змогуць адначасова знаходзіцца ў індывідуальных боксах 72 жывёліны. Тут будуць пляцоўкі для выгулу, ветлячэбніца, мыйка і цырульня для жывёл, крама аксесуараў, кармоў і ветпрэпаратаў, кухня, памяшканне для спецыялістаў. Мяркуецца, што заатэль пачне працаваць да канца 2013 г.**

ПОЎНЫ АБЗАЦ

◢ Зафіксаваны ўзровень шуму на стадыёне «Данбас Арэна» падчас матча Еўра-2012 Украіна — Англія пераўзышоў шум Ніягарскага вадаспада. Пра гэта паведаміў учора журналістам мэр Данецка Аляксандр Лук'янчанка. «Балельшчыкі зборнай Украіны ў Данецку на стадыёне паказалі небывалую падтрымку сваёй каманды. Узровень акустычнага шумавога фону зафіксаваны на адзнацы 123 дБ. Мы зусім крыху недацягнулі да рэкорда, які складае 131 дБ. Я лічу, што ў нас яшчэ ўсё наперадзе», — адзначыў мэр. Між тым шум Ніягарскага вадаспаду дасягае 90-100 дБ.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

■ Прэзентацыі

ЛЮБЯЧЫ, НЕ АДМАЎЛЯЮЦЦА!

Што ні горад, то, згадзіцеся, пэўныя асацыяцыі. І ў кожнага свае. Кшталту: Брэст — крэпасць, Віцебск — «... базар», Ветка — музей, Мядзел — Нарач, Орша — Караткевіч, Астравец — будпляцоўка АЭС...

Асіповічы, пасля «раскруткі» нова-га і сапраўды досыць добрага пральнага парашка, сталі — ну падобна ж на тое? — горадам, дзе «нараджаецца» «Мара»...

Хоць магла, відаць, і «Мечта»?.. Бо, прынамсі, тут, як і ў многіх іншых куточках краіны, у большай пашане мова руская: на ёй — размовы на вуліцах і ў крамах, на ёй — шыльды і ўся інфармацыя, якая можа спатрэбіцца чалавеку, што завітаў, напрыклад, у райвыканкам.

Таму першым пытаннем да людзей, што сышліся ў актавую залу (у тым ліку і на прэзентацыю «Звязды»), было: «Ці зразумеюць жа нас, калі будзем гаварыць па-беларуску?».

Прысутныя — да радасці — адказалі нам самымі шчырымі ўсмешкамі і досыць дружным: «Ну вядома...».

Гэта было стымулам, стымулам да выступленняў, да расказаў пра газету, да правядзення віктарыны, да... творчасці. Так, так, «Звязду» і ў гэтай паездцы «суправаджаў» часопіс «Вожык» — у асобе мастака-карыкатурыста Аляксандра Каршакевіча. А гэта значыць, што, пакуль мы распавядалі пра 95-гадовую гісторыю газеты, яе традыцыі, калектыў і змест, ён маляваў. І тым самым, несумненна, знаходзіў падпісчыкаў. Бо хто ж гэта, атрымаўшы падарунак у выглядзе цудоўнага сяброўскага шаржа, не захоча паглядзець: а што ж ён малюе яшчэ?

Прыкладна такія ж спадзяванні былі і ў журналістаў газеты, якія прадстаўлялі, вядома ж, не чужыя ім (і прысутным) укладкі «Мясцовае самакіраванне», «Чырвонка», тэматычныя старонкі «Краіна здароўя», «Жыранадоля», «Ігуменскі тракт», «Алімпіец», рубрыкі «Гаспадары», «Жыццялюбы», «Пытальнік», «Крынічка», «Хатняя энцыклапедыя»... Што ўжо казаць пра свае, адмысловыя «Фотаслова», альбо «Простую мову» ці «Алё, народ на провадзе!»...

Што абнадзейвала, нас уважліва слухалі. Прычым, пераважна, тыя, хто атрымлівае газету не дома, а па месцы працы. А таму і чытае, як правіла, вельмі выбарачна... Тое, што найперш кідаецца ў вочы, прыцягвае ўвагу...

Пасля сустрэчы, хочацца верыць, «методыка» гэтая зменіцца.

Як, магчыма, і само кола чытачоў. Бо яно ж і насамрэч грэх выракацца роднае мовы, не размаўляць на ёй... Ці хаця б не чытаць...

А тым больш (аб'ектыў жа не падманеш?) любячы.

Валянціна ДОЎНАР,
Уладзімір ЗДАНОВІЧ,
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

НА ЗДЫМКАХ: фірменны сувенір за перамогу ў віктарыне — намесніку дырэктара ТАА «Асіповічыгазбуд» Тадэвушу Баршчэўскаму; падпіску (на любы тэрмін, у тым ліку і на «Звязду«) ахвотна прымае пашальён ДАПС-3 Людміла Дрэнь; абы-якавых падчас прэзентацыі газеты «Звязда», здаецца, не было; сяброўскі шарж — сяброўскі здымак

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

«БЕЛАВІЯ» НАБЫЛА ЧАРГОВЫ САМАЛЁТ

Боінг-737-300 выпушчаны ў 1995 годзе, машыне 17 гадоў. Самалёт можа ўмясціць 148 пасажыраў у эканамічным і бізнэс-класах. Гэта васямнаццатае па ліку паветранае судна ў флоце Нацыянальнай авіякампаніі. Па словах генеральнага дырэктара «Белавія»Анатоля Гусарава, самалёт прайшоў поўны неабходны тэхнічны агляд з боку спецыялістаў і адпавядае ўсім міжнародным стандартам бяспекі. Выкарыстоўваць Боінг-737-300 збіраюцца на рэйсах, якія ў сезон адпачынку набываюць асаблівую папулярнасць (Балгарыя, Грэцыя, Турцыя, Егіпет). Сярод рэгулярных рэйсаў, на якіх будзе выкарыстоўвацца самалёт, — Ларнака, Тэль-Авіў, Тбілісі і Рым.

Ганна ГАРУСТОВІЧ.

5-ГАДОВЫ ХЛОПЧЫК САМ ВЫЙШАЎ З ЛЕСУ

У Асіповіцкім раёне хлопчыка, які заблукаў у лесе, шукалі выратавальнікі, міліцыя і мясцовае насельніцтва. А дзіця выйшла з масіву самастойна...

— Паведамленне пра здарэнне паступіла ў службу выратавання ў 13.30: у лясным масіве ў раёне вёскі Перажкі прапаў хлопчык 2007 года нараджэння. Ён разам з бацькам прыехаў у лес з пасёлка Дружны Пухавіцкага раёна, — распавёў падрабязнасці старшы інспектар цэнтра прапаганды МНС Алег Малевіч. — Для правядзення пошукавых мерапрыемстваў былі задзейнічаны пяць адзінак тэхнікі Асіповіцкіх райаддзелаў — міліцыі і надзвычайных сітуацый, 43 супрацоўнікі з іх, а таксама два дзясяткі мясцовых жыхароў. У 14.47 дзіця знайшлося: хлопчык выйшаў з лесу самастойна.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ДРЭВА ПАШКОДЗІЛА ТРЫ АЎТО

З-за ўрагану ў Віцебску ў двары дома па вуліцы «Праўды» адбылося падзенне дрэва на некалькі аўтамабіляў.

— Пра тое, што ўпала дрэва, у службу выратавання паведамілі а шостай гадзіне вечара. Атрымалі пашкоджанні тры легкавыя аўтамабілі. Пасля прыбыцця да месца выкліку падраздзялення МНС было ўстаноўлена, што дрэва ўпала на легкавікі, прыпаркаваныя ў двары жылога шматпавярховага дома: «KIA-Сарэнта», «Опель-Вектра», «Фальксваген-Пасат», — паведамілі ў Віцебскім абласным упраўленні па надзвычайных сітуацыях. — Правадзіліся работы па распілоўцы дрэва і ліквідацыі яго з выкарыстаннем механізаванага інструмента і аўтакрана. Аўтамабілі атрымалі механічныя пашкоджанні.

АДКУЛЬ СЫР?

У вёсцы Рэдзькі Дубровенскага раёна супрацоўнікі Віцебскай мытні і ДАІ затрымалі аўтамашыну з кантрабандным сырам коштам 766 мільёнаў рублёў. За рулём аўто «Сканія» знаходзіўся жыхар Мінска. Ён без адпаведных суправаджальных дакументаў перавозіў 18,8 тоны сыру. А ў Віцебску міліцыянерамі была затрымана аўтамашына «Фальксваген», якая належыць грамадзяніну Расіі — ён перавозіў 1150 пачкаў цыгарэт вытворчасці Рэспублікі Беларусь. Таксама без адпаведных дакументаў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!

ПАДПІСКА НА 4-ы КВАРТАЛ 2012 ГОДА
Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)

Індэкс	месяц	квартал
63850 (індывідуальны)	24800	74400
63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў)	22500	67500
63858 (ведамасны)	45000	135000
63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры)	40500	121500

Падпіска «Да запатрабавання» праз кіёскі РУП «Белсаюздрук»

Індэкс	месяц	квартал
63850 (індывідуальны)	20600	61800
63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў)	18450	55350
63858 (ведамасны)	34900	104700
63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры)	30670	92010

Заставайцеся з намі!

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2012 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 6 ліпеня** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Сярод падпісчыкаў 10.07.2012 г. будуць разыграны 7 прасаў, 7 чайнікаў, 7 кухонных машын, 1 пыласос для Мінскай вобласці і суперпрыз — печ ЗВЧ. Вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **да 21.07.2012 г.**

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі **па 30 верасня 2012 г.** пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2012 года і пашпарта. **Пасля 30 верасня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Правілы гульні чытайце ў газеце «Звязда» за 5.05.12 г.

Тэрмін правядзення гульні — з 5.05.12 па 30.09.12.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 2008 ад 20.04.12, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

5 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2012 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска афармлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)

_____ **на III кв. або 2-е паўг. 2012 года**

Хатні адрас і тэлефон _____ _____
(індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

РТУЦЬ У ХЛЯВЕ

У вёсцы Вялікія Сцяпанішкі Мастоўскага раёна жанчына, прыбіраючыся ў сваім хляве, знайшла 150 грамаў ртуці.

— Вадкі метал стаяў у шкляной бутэльцы на паліцы. Праліваў ртуці, на шчасце, не было. Домаўладанне раней належала бацьку гаспадыні, які пайшоў з жыцця некалькі гадоў таму. А сам дом выкарыстоўваўся як лецішча, — расказаў журналісту «Звязды» старшы інспектар цэнтра прапаганды Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Алег Малевіч. — Ёмістасць з ртуццю была дастаўлена ў Мастоўскі раённы аддзел па надзвычайных сітуацыях для далейшай утылізацыі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЗАТРЫМАЛІ «ВЕЛАСІПЕДНЫХ» ЗЛАЧЫНЦАЎ

Аператыўнікі аддзела крымінальнага вышуку Цэнтральнага РУУС сталіцы затрымалі трох падлеткаў, якія здзяйснялі крадзяжы веласіпедаў у розных раёнах горада.

— Толькі ў Цэнтральным раёне яны «адзначыліся» чатыры разы. Падлеткі выбіралі дамы элітнай забудовы і з раніцы адпраўляліся на пошукі падыходзячай ахвяры. Знайшоўшы яе, здзяйснялі крадзеж, — паведаміла прэс-афіцэр Цэнтральнага РУУС г. Мінска Святлана Кабкова. — Украдзеныя двухколавыя «машыны» зламыснікі рэалізоўвалі на адным з рынкаў сталіцы па 70-100 долараў за адзінку.

Вылічыць выкрадальнікаў веласіпедаў атрымалася дзякуючы відэакамеры, якая была ўстаноўлена на адным з пад'ездаў, дзе было здзейснена чарговае злачынства.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Паважаную **Тамару Мікалаеўну МІХАЙЛОЎСКУЮ** віншуем **з днём нараджэння!** Жадаем моцнага здароўя, сямейнага дабрабыту.

Сын Алег,
нявестка Насця,
унук Кірыл,
сваты Сарокі.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

21 ЧЭРВЕНЯ 2012 г.
ЧАЦВЕР
№ 11 (15697)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Будзем знаёмыя!

ЭЛЕКТРОННАЕ ГУЧАННЕ KOSTYA OUTTA

Як напісаць свой трэк і выступіць з ім у клубе?

Kostya Outta — саўндпрадзюсар, дыджэй, удзельнік live-праекта «Aaronautica». Яго электронныя трэкі выдаюцца на шматлікіх музычных лейблах, ён заўзятар начных электронных вечарынак у клубах Мінска. А ў гэтым годзе стаў удзельнікам «May Day» — аднаго з самых «крутых» фестываляў электроннай музыкі ў нашай краіне.

А яшчэ Косця — хлопец з маёй «паралелі». З ім разам мы сустракалі наш школьны выпускны. Мы сядзелі на самым версе высокага жалезнага турніка — я ў пышнай паласатай сукенцы з чырвоным бантам, ён у цёмным касцюме — і, па традыцыі, любаваліся світаннем, а яшчэ... слухалі яго электронныя трэкі.

Я слухала яго мелодыі — і было ў іх нешта вельмі пазітыўнае, такое, што заўсёды прыемна здзіўляла сваёй жыццясцвярджальнасцю. І колькі бачыла яго пасля — ён заўсёды заставаўся верным сабе: музыка. Як можа быць іначай, ён і не ўяўляў.

Зараз сустрэла Косцю, ён увесь у яркай вопратцы — падбірае яе пад свае трэкі. Я ўпэўнена, што не наадварот. Мы пагутарылі. Калі дома паслухала, гэты тэкст мне захацелася зрабіць як інтэрв'ю наадварот. Я прадстаўлю яго вам з канца да пачатку — ад размовы сяброўскай да больш афіцыйнай, ад думак, якія проста прыходзяць у галаву, да аповеду з канкрэтнымі фактамі.

(Заканчэнне на 6-й стар.«ЧЗ».)

Прыёмная кампанія—2012

НА ЦТ АБІТУРЫЕНТЫ ДАПУСКАЮЦЬ ПАМЫЛКІ НАВАТ У СВАІМ ПРОЗВІШЧЫ

«Як пішацца «некто» і «нечто» — разам ці асобна? А дзе трэба ставіць націск у словах «плесневеть» і «кухонный»? — такую гутарку давялося падслухаць у метро. Адна адну «кансультавалі» дзве маладыя дзяўчыны, якія, без сумнення, ехалі здаваць цэнтралізаванае тэсціраванне па рускай мове і напаследак, перад экзаменам, гарталі свае канспекты. Але куды больш уразіла карціна каля газетнага кіёска побач са станцыяй метро «Каменная Горка», дзе выстраілася чарга з маладых людзей, якія цікавіліся ў прадаўца: «Скажыце, ці ёсць у вас чорныя гелевыя ручкі?» Як вядома, для запаўнення бланка адказаў на ЦТ без чорнай гелевай ручкі проста немагчыма абысціся. Да ЦТ заставалася ўсяго паўтары гадзіны, таму можна зразумець адчай маладых людзей, якія чулі ў адказ, што ручак няма. Асабіста для мяне так і засталося незразумелым, як гэты важны пункт падрыхтоўкі да ЦТ можна было адкласці на самы апошні момант. Між іншым, арганізатары цэнтралізаванага тэсціравання могуць прыгадаць шмат нестандартных і нават казусных сітуацый, звязаных з рэгістрацыяй і здачай ЦТ.

Так, даволі нечаканае практычнае прымяненне атрымала сістэма электроннай рэгістрацыі абітурыентаў на цэнтралізаванае тэсціраванне. З яе дапамогай два гады таму ў вялікім горадзе ўдалося знайсці маладую дзяўчыну, якая прыехала ў Беларусь з Расіі, каб зарэгістравацца для здачы цэнтралізаванага тэсціравання. Прыбыўшы ў Мінск, дзяўчына патэлефанавала бацькам, супакоіла іх, а затым... знікла амаль на тыдзень. Ці варта казаць, што бацькі месца сабе не знаходзілі, таму праз сваю знаёмую выйшлі на Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў. Яго спецыялісты тут жа «зазірнулі» ў агульнарэспубліканскі банк звестак удзельнікаў ЦТ і высветлілі, што «прапажа» наведала пункт рэгістрацыі ў Акадэміі кіравання, зарэгістравалася там на адзін тэст-экзамен, затым яна наведала ўжо пункт рэгістрацыі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, дзе аформіла яшчэ два пропускі на ЦТ. Арганізатарам тэсціравання былі вядомыя не толькі дзень, але і час афармлення пропускаў. Але самай каштоўнай аказалася інфармацыя, якую абітурыент пакідае арганізатарам тэсціравання для зваротнай сувязі. На шчасце, дзяўчына ўжо паспела на той момант арандаваць пакой у Мінску, таму паведаміла рэгістратару свой мінскі тэлефон. А далей усё было, як у сацыяльнай рэкламе: «Даражэнькая, калі ласка, патэлефануйце сваім бацькам...»

У 2010 годзе ў філіяле БДЭУ на тэсціраванні па англійскай мове арганізатары высветлілі, што за абітурыентку здае экзамен... студэнтка другога курса Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта.

(Заканчэнне на 4-й стар.«ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
21 06 2012 г.

СТУДЭНЦКІ АТРАД: ВОПЫТ + РАМАНТЫКА + НЕБЛАГІЯ ГРОШЫ

Нягледзячы на тое, што большасць студэнтаў яшчэ карпеюць над сваімі канспектамі і здаюць экзаменацыйную сесію, асобныя прадстаўнікі студэнцкай моладзі ўжо сабралі свае чамаданы і адправіліся на заробкі ў складзе студэнцкіх атрадаў у Расію.

Фота БЕЛТА.

— У Краснадарскім краі сёння працуе мінскі педагагічны атрад у складзе 130 чалавек. Яшчэ 63 гомельскія студэнты шчыруюць у Тындзе. Пэўная колькасць студэнтаў прыступіла да работы на расійскай чыгунцы, — расказвае **другі сакратар ЦК БРСМ Альбіна СЫЧЭЎСКАЯ.** — Натуральна, што ўсе яны загадзя здалі сесію і не маюць у сваіх навучальных установах ніякіх «хвастоў». Але асноўны наплыў ахвотных паўдзельнічаць у працоўным семестры мы чакаем пасля 25 чэрвеня, калі ва ўсіх у ВНУ скончыцца сесія. Бясспрэчна, вываз студэнцкага атрада за межы краіны — вялізная адказнасць. Для гэтага неабходна дакладна прапрацаваць пытанні захавання працоўнага заканадаўства, стварэння для студатрадаўцаў нармальных бытавых умоў. І, галоўнае, дабіцца выканання дасягнутых дамоўленасцяў. Таму да выбару такіх аб'ектаў мы заўсёды падыходзім вельмі адказна. Увогуле ў нас сёлета ёсць дамоўленасці па выездзе за межы Беларусі студэнцкіх атрадаў у колькасці 2900 чалавек. Але большасць беларускіх студэнтаў будуць шчыраваць на радзіме: іх чакаюць на рэканструкцыі Купалаўскага тэатра, будаўніцтве музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, студэнцкай вёскі ў Мінску, Лядовага палаца ў Оршы, малочнатаварных фермаў. Таксама яны прымуць удзел у падрыхтоўцы Горак да рэспубліканскага фестывалю «Дажынкі».

Большасць беларускіх студэнтаў будзе шчыраваць на радзіме: іх чакаюць на рэканструкцыі Купалаўскага тэатра, будаўніцтве музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, студэнцкай вёскі ў Мінску, Лядовага палаца ў Оршы, малочнатаварных фермаў. Яны прымуць удзел і ў падрыхтоўцы Горак да рэспубліканскага фестывалю «Дажынкі».

Па словах Альбіны Сычэўскай, у гэтым годзе ў параўнанні з мінулым працоўных дагавораў на рабочыя месцы са студэнтамі і навучэнцамі заключана ў 2 разы больш. Прычым з 11 тысяч маладых людзей, якія ўжо адкрылі для сябе летні працоўны сезон, 3700 складаюць падлеткі: колькасць непаўналетніх, што жадаюць працаўладкавацца, сёлета таксама павялічылася ў 2 разы. У складзе студатрадаў сёння працуюць 1105 падлеткаў. Такая сітуацыя тлумачыцца ўступленнем у дзеянне Указа кіраўніка дзяржавы № 181 ад 15 красавіка 2012 года «Аб арганізацыі дзейнасці студэнцкіх атрадаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь». Згодна з гэтым дакументам, у студэнцкія атрады цяпер могуць уключацца маладыя людзі ва ўзросце ад 14 да 31 года. Акрамя таго, пералік аб'ектаў і аб'ёмаў работ сёння зацвярджаецца не ўрадам і не Міністэрствам адукацыі, а мясцовымі выканаўчымі органамі ўлады. Такім чынам, калі з 1 мая па 30 верасня ў краіне з'явіцца новы аб'ект, дзе знойдзецца работа для студэнцкіх рук, ён будзе неадкладна ўнесены ў пералік аб'ектаў для працаўладкавання моладзі.

На чэрвень-ліпень штаб працоўных спраў БРСМ заключыў дагаворы на 19100 працоўных месцаў, але дагаворная кампанія на жнівень-верасень яшчэ працягваецца — адпаведна, у маладых людзей яшчэ ёсць магчымасць стаць удзельнікам студатрадаўскага руху. Запісацца і паўдзельнічаць у рабоце студэнцкага атрада можа кожны малады чалавек. Тэарэтычна гэта могуць быць нават маладыя людзі, якія нагогул нідзе не вучацца. Але паколькі атрады фарміруюцца пярвічнымі арганізацыямі БРСМ вышэйшых навучальных установ, то пераважную большасць іх «байцоў» складаюць усё ж такі студэнты.

На думку **консультанта аддзела праграм садзейнічання занятасці ўпраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Жанны ШЧАМЯЛЁВАЙ,** часовая занятасць падлеткаў з'яўляецца, у першую чаргу, элементам іх прафесійнай арыентацыі. Не выключана, што калі-небудзь першы працоўны досвед стане штуршком для выбару той ці іншай прафесіі. З іншага боку, важнае разуменне, што грошы трэба менавіта зарабіць, што для гэтага неабходна прыкласці пэўныя намаганні, што любая праца патрабуе павагі... Дарэчы, сёлета памер фінансавых сродкаў, выдаткаваных Фондам сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь на арганізацыю часовай занятасці моладзі, вырас у 2 разы ў параўнанні з 2011 годам: калі летась гэтая сума складала 9,3 млрд рублеў, то ў гэтым годзе — 18,2 млрд.

Безумоўна, абсалютна ўсіх падлеткаў і студэнтаў ці не ў першую чаргу цікавіць пытанне: а колькі ж рэальна летам зарабіць? Калі размова ідзе пра непаўналетніх са скарочаным працоўным днём, то іх заробак стартуе ад 400-500 тысяч рублёў. А ў складзе студэнцкіх будаўнічых атрадаў можна зарабіць і да 6 мільёнаў рублёў, сцвярджае Альбіна Сычэўская. Прынамсі, такую зарплату навучэнскай моладзі прапаноўваюць сталічныя прадпрыемствы — транспартна-лагістычны цэнтр «24» і піўзавод «Аліварыя» за грузапагрузачныя работы (пры ўмове выканання вызначанай наймальнікам нормы).

«У складзе студэнцкіх будаўнічых атрадаў можна зарабіць і да 6 мільёнаў рублёў. Прынамсі, такую зарплату навучэнскай моладзі прапаноўваюць сталічныя прадпрыемствы — транспартна-лагістычны цэнтр «24» і піўзавод «Аліварыя» за грузапагрузачныя работы»

Пры будаўніцтве і рэканструкцыі малочнатаварных фермаў, на жаль, такіх «залатых гор» студэнтам не абяцаюць, затое ў рабоце за горадам ёсць свае відавочныя плюсы: гаспадаркі прадастаўляюць маладым людзям бясплатнае трохразовае харчаванне і забяспечваюць пражыванне. Адным словам, усім «байцам» такіх атрадаў гарантавана непаўторнае моладзевае асяроддзе, прырода, прыгоды і незабыўныя ўражанні.

— Мы сёння актыўна развіваем унутры краіны сістэму выязных студэнцкіх атрадаў. Імкнёмся да таго, каб студэнты з аднаго рэгіёна працавалі ў іншым, бо гэта дае магчымасць атрымаць як новыя ўражанні, так і новы вопыт, — кажа Альбіна Сычэўская. — Дарэчы, студэнты сталічных ВНУ зусім не супраць працаваць у гаспадарках Міншчыны. А яшчэ мы плануем адрадзіць злёты студэнцкіх атрадаў....

Таксама ў штаба працоўных спраў БРСМ ёсць магчымасць працаўладкаваць і маладых людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Гэта можа быць работа дыспетчарам, на камп'ютары або ў сэрвісным атрадзе. Для таго, каб азнаёміцца з пералікам вакансій, медыцынскімі патрабаваннямі, якія прад'яўляюцца да той ці іншай работы, і прыкладнай заработнай платай, трэба зайсці на **партал «Моладзь Беларусі» (www. brsm.by)** або звязацца з абласным штабам студэнцкіх атрадаў. Школьнікі таксама могуць звярнацца або ў БРСМ, або ў моладзевую сацыяльную службу (Мінск, вуліца Чапаева, 3, тэл. 233-94-76, (029) 354 45 42, (029) 577 45 42), або ў цэнтры занятасці насельніцтва.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Зараз ужо заключана 448 дагавораў з наймальнікамі для працаўладкавання амаль што 22 тысяч навучэнцаў. У Гомельскай вобласці, напрыклад, яны дапамогуць адрамантаваць школьную мэблю і пабудаваць дэкаратыўныя агароджы на прышкольных участках. У Драгічынскім раёне сфарміраваны банк звестак на 80 вучняў, якія жадаюць працаваць у час летніх канікулаў, прычым 67% з іх адносяцца да групы рызыкі (гэта дзеці, якія знаходзяцца на ўліку ў інспекцыі па справах непаўналетніх альбо выхоўваюцца ў нядобранадзейных ці няпоўных сем'ях). У Ваўкавыскім раёне плануецца добраўпарадкаваць і азеляніць тэрыторыю дзіцячага дома з удзелам 25 школьнікаў. У Іўеўскім раёне дзяўчаты будуць шыць бялізну для дапаможнай школы-інтэрната. Па сутнасці, гэта тое ж, што у школе называецца грамадска карыснай працай (рамонт кніжак ў школьнай бібліятэцы, мэблі, работа ў майстэрнях, вырошчванне сельгаспрадукцыі, выраб мяккіх цацак і сувеніраў), але за пэўную плату. Па Мінску ўжо заключана 25 дагавораў аб працаўладкаванні амаль 3 тысяч навучэнцаў

ВІДЫ РАБОТ, ЯКІЯ ПРАПАНУЮЦЦА НАВУЧЭНСКАЙ МАЛАДЗІ Ў СТАЛІЦЫ:

будаўнічыя работы
падсобныя работы
прыбіранне тэрыторыі
прыбіранне палат, санвузлоў
упакоўка прадукцыі
камплектаванне тавару
касьба газонаў, комплексная ўборка
работа медыцынскага рэгістратара
дарожна-будаўнічыя работы
пагрузачна-разгрузачныя работы
выкладка тавару
мыццё посуду, інвентару
апрацоўка, дастаўка і ўручэнне друкаваных СМІ і карэспандэнцыі
сарціроўка паштовых адпраўленняў
рэалізацыя білетнай прадукцыі (кандуктар)
афармленне дакументаў (лабарант)
работа праваднікамі на чыгунцы ў Расійскай Федэрацыі (аплата 60 расійскіх рублёў за гадзіну, мінімальны аб'ём работ — 550 гадзін)

Марыя ВАШЧУК, студэнтка будаўнічага факультэта, Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт:

— Пачынаючы з 2 курса, у нас кожны год праходзіць вытворчая практыка. Усе ахвотныя ідуць у будаўнічыя атрады. Нам прысвойваюць разрад маляра, і мы працуем на будаўніцтве. У брыгадах прыкладна па 25 чалавек. Калі студэнт хоча быць камандзірам свайго атрада, то можна падаць адпаведную заяўку ў БРСМ. Камандзірамі могуць быць толькі пасля 3 курса. Спачатку сутыкаешся з тым, што прыходзіш да людзей, якія займаюцца гэтай працай не першы дзень, а ты амаль што нічога не ведаеш з практыкі, толькі тэорыю. Ёсць пэўны страх... Калі я прыйшла ў будаўнічы атрад першы раз, то нам выдзелілі чалавека, які сачыў за намі, дапамагаў і тлумачыў усё, што падавалася незразумелым. Між тым, будаўнічы атрад — добрая магчымасць зарабіць і пазнаёміцца з новымі людзьмі. Ды і працаваць там весела.

Ліза ПІСКУНОВА, студэнтка гуманітарнага факультэта, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт:

— Трапіла ў будаўнічы атрад падчас адбору ад студэнцкага савета. Свайго роду бонусам было тое, што пасля гэтага гарантавана можна было атрымаць месца ў інтэрнаце на наступны год. У атрадзе са мной былі дзве дзяўчыны, а ўсе астатнія — хлопцы. І таму атрымалася так, што фізічная праца легла на мужчынскія плечы, а дзяўчаты займаліся прыгатаваннем абедаў. Хоць і былі ў маіх сяброўках напачатку памкненні працаваць з хлопчыкамі нароўні, ды ў працэсе зразумелі: фізічна гэта цяжка. У першыя дні мы знаёміліся паміж сабой, бо да гэтай пары адно аднаго не ведалі. Розныя факультэты, розныя інтэрнаты. Са многімі сябруем і дагэтуль. Калі сустракаемся недзе, ёсць што ўспомніць. Шкадую, што не адкрыла для сябе будаўнічы атрад раней. Бо той энтузіязм, які прачынаецца ў табе падчас працы, нельга ні з чым параўнаць. А сяброўства на глебе агульнай справы мае непаўторную атмасферу.

Андрэй ШАТНЕНКА, студэнт факультэта радыёфізікі, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт:

— Мой вопыт працы ў будаўнічым атрадзе не пакінуў станоўчых уражанняў. Я, хутчэй, расчараваўся. Пасля першага курса ў мяне з'явілася ідэя застацца ў інтэрнаце на лета. Мне падказалі, што як варыянт можна пайсці ў будаўнічы атрад. Выбраў атрад БРСМ з надзеяй на большы заробак. А потым пачалося невясёлае жыццё. Мяне і майго аднагрупніка адправілі на будаўнічы аб'ект. Я пайшоў на адбойны малаток, а таварыш насіў блокі. Давялося сутыкнуцца з рэчаіснасцю: працаваць даводзілася ва ўмовах парушэння тэхнікі бяспекі, а на адпачынак часам заставалася ад сілы тры гадзіны ў суткі. Таму мая выснова такая: будаўнічы атрад — гэта не заўсёды месяц цікавай працы і новых знаёмстваў, ён здольны расчараваць, калі не сустракаеш разумення і падтрымкі на месцы працы.

Алена ДРАПКО.

РЭАЛЬНЫ ХЛОПЕЦ ТОЛЯ

...Пачыналася ўсё пяць гадоў назад, калі Анатоль Богач прыйшоў маладым спецыялістам у «Лядзенскі» па размеркаванні пасля Мар'інагорскага аграрна-тэхнічнага каледжа. Хлопец ён старадарожскі, але так на Чэрвеньшчыне і застаўся. Чаму б не? Гаспадарка амаль адразу выдзеліла новы дом, працу прапанавалі на пасадзе агранома. Потым знаёмства з будучай жонкай Насцяй, вяселле, цешчыны бліны — прыгажосць!..

Гэтую «цукерачку» Анатоль сабраў уласнымі рукамі.

А адно з самых дарагіх багацяў цяпер ужо навучылася бегаць па двары — гэта сынок Мацвей. Хлопчыку год і восем, кожны дзень у яго маленькім жыцці — новыя адкрыцці і дасягненні, якія радуюць тату і маму. Праз пару месяцаў, якраз да Толевага дня нараджэння, Богачы стануць яшчэ багацейшымі: у іх з'явіцца другое дзіця.

Толькі адна акалічнасць даволі доўга мучыла Толеву душу. Што працаваў ён на пасадзе агранома, а цягнула не да раслін, а да тэхнікі. У рэшце рэшт Богач адмовіўся ад аграномскай пасады і перайшоў у майстэрню. Цяпер ён вечна ў масле і салідоле. Ды яшчэ і хлеб механізатарскі такі, што з вясны да восені ад світанку да світанку ты ў полі на трактары або ў майстэрні пад трактарам. Той вольны час, калі ўдаецца зняць прамасленую «рабочку» і адцерці пальцы ад мазуту і масла, даводзіцца яшчэ і дзяліць паміж сям'ёй, гаспадаркай, сябрамі ды захапленнямі. Так і атрымліваецца, што жыве Толя Богач побач з возерам, а на сваёй любімай рыбалцы быў сёлета толькі пару разоў, два ляшчы па паўкіло выцягнуў — на тым пакуль усё. Астатнія вольныя хвілінкі Толя прысвячае сям'і. І ў гэтым таксама яго багацце — пасля доўгага працоўнага дня вярнуцца ў дом, дзе цябе чакаюць родныя, любімыя людзі, і нарэшце-такі прысесці адпачыць...

Асаблівы гонар былога агранома Анатоля — уласнымі рукамі зроблены трактар. Калі гэты цуд бачыш упершыню, памылкова пачынаеш думаць, што ён або з выставы, або цацачны — такі прыгожы, акуратны, увесь блішчыць і ззяе кожнай дэталькай! Але не, гэта цалкам рабочы агрэгат: у любую секунды хоць бульбу акучваць, хоць дровы вазіць. Проста гаспадар з такой любоўю ставіцца да тэхнікі і асабліва да свайго дзецішча, што трактар у яго — як «цукерачка».

Калегі Анатоля, акрамя працавітасці і цягі да тэхнікі, таксама адзначаюць сціпласць хлопца, неканфліктны, спакойны характар і любоў да сям'і, жонкі і сына. «Любімы ў цешчы зяць, яна душы ў ім не чуе, так і пішыце!» — дабрадушна ўсміхаліся калегі Толі на машынным двары. Ну і хто пасля гэтага яшчэ будзе сумнявацца ў багацці Богача?

Наталля КАРАЛЬКЕВІЧ. Фота аўтара. *Чэрвеньскі раён.*

ВЕЛАСІПЕД У СТАЛІЦЫ: РЭЛАКСАЦЫЯ ЦІ СТРЭС?

Адзін з сямейных прынцыпаў Яўгена і Святланы — здаровы лад жыцця

ВЕЛАСІПЕДНЫ рух у Мінску стаў развівацца адносна нядаўна — на пачатку 2000-х гадоў. З тых часоў у некаторых раёнах горада з'явіліся веласіпедныя дарожкі, пункты пракату, ды і колькасць саміх аматараў двухколавага транспарту значна павялічылася. Але сталічнае кіраўніцтва не мае намеру спыняцца на гэтых дасягненнях. Начальнік упраўлення фізічнай культуры, спорту і турызму Мінгарвыканкама Аляксей Пракаповіч паведаміў, што рашэннем Мінгарвыканкама зацверджаны план мерапрыемстваў па аздараўленні гараджан на адкрытых пляцоўках. У тым ліку, і на веласіпедных дарожках.

Ініцыятыва ад улады — гэта, безумоўна, добра. Але як самі мінчане ставяцца да пашырэння веласіпеднага руху? Каб вызначыць гэта, я адправілася ў парк Горкага і пагутарыла з яго наведнікамі.

Вынікі маёй міні-апытанкі супалі з вынікамі сацыялагічнага даследавання Беларускай асацыяцыі экспертаў і сюрвееру на транспарце (БАЭС), якая займалася вывучэннем веласіпеднага руху ў Мінску. Згодна з яе інфармацыяй, да 2/3 жыхароў сталіцы лічаць неабходным наяўнасць веласіпеда.

Відавочна, што веласіпедны рух у Мінску будзе развівацца за кошт інфраструктуры, якая ўжо існуе. Гэта значыць, гарадское асяроддзе будуць прыстасоўваць для зручнасці веласіпедыстаў, як гэта зроблена на некаторых участках праспекта Незалежнасці. А пакуль што ў аматараў двухколавага транспарту шмат прэтэнзій да арганізацыі веласіпеднага руху ў горадзе.

Маладая сямейная пара — Яўген і Святлана — шмат ездзяць на веласіпедах.

Галоўная праблема, на думку маладых людзей, заключаецца не ў адсутнасці парковак і не ў высокіх бардзюрах, а ў недасведчанасці гараджан.

— Было б цудоўна, калі б як-небудзь інфармавалі людзей, што веласіпедысты — паўнапраўныя ўдзельнікі дарожнага руху. І што разметка нанесена на асфальце не проста так, веласіпедныя дарожкі — для веласіпедыстаў, а не для пешаходаў, — падвёў вынік Яўген.

Другі мой суразмоўца, актыўны веласіпедыст Андрэй, адзначае, што веласіпед дае яму адчуванне свабоды.

— Але гэтае адчуванне псуецца з-за дрэннай якасці дарог і тратуараў — яміна на яміне. Таму самая распаўсюджаная паломка ў веласіпедах — «васьмёрка» кола. Добра, што хоць ёсць майстэрні, у якіх могуць усё адрамантаваць, але каштуе гэта нятанна. А яшчэ вельмі нязручна спешвацца (напрыклад, на пераходах), каб пераканаціць веласіпед. Тое самае і ў падземных пераходах.

Я паспрабавала паспрачацца з меркаваннем наконт дрэннай якасці дарог, прывёўшы ў якасці прыкладу раўнюткія веласіпедныя дарожкі ўздоўж Свіслачы. Аднак Андрэй прывёў слушны аргумент:

— Па веласіпедных дарожках, безумоўна, можна куды-небудзь даехаць, нягледзячы на тое, што яны ў нас маюць даволі стыхійную арганізацыю. І ўсё ж па горадзе ехаць хутчэй, чым па дарожцы. З часам прыстасоўваешся, ведаеш, як аб'ехаць нейкія праблемныя мясціны, але ўсё роўна шмат нязручнасцяў.

у Лондане і шэрагу іншых еўрапейскіх гарадоў веласіпеды маюць аднолькавыя правы з наземным транспартам. Там на дарогах ёсць спецыяльныя палосы для аўтобусаў, па якіх могуць ездзіць і веласіпедысты.

Аднак акрэсленыя вышэй праблемы — гэта яшчэ не ўсё. Каб атрымаць больш поўную карціну, я звярнулася да веласіпедыста з вялікім стажам. Канстанцін расказвае, што пачаў ездзіць на веласіпедзе, калі яшчэ гаварыць толкам не навучыўся. За апошнія 12 гадоў захапленне перарасло ў сур'ёзны занятак: малады чалавек бярэ ўдзел у шматлікіх веласіпедных марафонах. На пытанне, як можна ацаніць стан Мінска з пункту гледжання зручнасці для веласіпедыстаў, Косця адказаў так:

Спецыяльная разметка для веласіпедыстаў на тратуары.

З другога боку перахода да парку Горкага ўсё-такі прадугледжаны нізкі з'езд. Аднак ідзе ён чамусьці па дыяганалі, што не вяжацца з правіламі дарожнага руху.

— Менш чым здавальняюча, на жаль. Вядома, за апошнія пяць гадоў ёсць пэўны прагрэс. Палепшылася якасць асфальту, пабудавалі дарожкі. Але яшчэ існуе шмат нявызначанага ў тых жа правілах дарожнага руху ў дачыненні да веласіпедыстаў. Напрыклад, у Лондане і шэрагу іншых еўрапейскіх гарадоў веласіпеды маюць аднолькавыя правы з наземным транспартам. Там на дарогах ёсць спецыяльныя палосы для аўтобусаў, па якіх могуць ездзіць і веласіпедысты.

Не пакінуў Канстанцін без крытыкі і злашчасныя веласіпедныя дарожкі.

— Пры іх праектаванні былі дапушчаны памылкі. Дарожкі падзелены на дыстанцыі, дзе-нідзе проста абрываюцца. Да таго ж няма знакаў папярэджвання аб паваротах ці абмежаванні хуткасці.

Дзіяна СЕРАДЗЮК, фота аўтара.

ШТО РАБІЦЬ?

Што ж, праблемы ў сферы двухколавых сродкаў перамяшчэння большменш акрэслены. Застаецца толькі вызначыць, як іх вырашаць. Альбо данесці да тых, хто можа вырашыць.

— Ёсць афіцыйна зарэгістраванае грамадскае аб'яднанне — «Мінскае веласіпеднае таварыства». Менавіта гэтая арганізацыя і займаецца вырашэннем вышэйназваных пытанняў, — кажа Косця. — Там ладзяць зборы подпісаў, і, як афіцыйнай арганізацыі, ім прасцей, чым асобным аматарам, данесці пэўныя прапановы да чыноўнікаў.

Я папрасіла свайго суразмоўцу паразважаць наконт таго, якія мерапрыемствы, на яго погляд, змогуць прыцягнуць увагу грамадскасці і кіраўніцтва горада да складанага становішча аматараў веласіпедаў.

— Летась ужо ў пяты раз адбылося адкрыццё веласіпеднага сезона. Гэтая імпрэза спрыяе зменам у свядомасці людзей, яны пачынаюць крыху па-іншаму, больш сур'ёзна, успрымаць веласіпеды. Гэта адно з самых важных і яркіх мерапрыемстваў. Акрамя таго, штогод ладзяцца розныя марафоны, прыгодніцкія гонкі для аматараў і спартсменаў. Гэта вельмі цікава. Напрыклад, нядаўна адбыўся марафон у Налібоцкай пушчы — жамчужыне беларускага краю.

Было б карысным, каб ДАІ распрацавала комплексныя правілы для веласіпедыстаў, кшталту тых, што існуюць для кіроўцаў матацыклаў. А ўвогуле, самая лепшая мера — гэта перасесці на веласіпеды прадстаўнікам улады. Я ўпэўнены, калі хтосьці з іх праедзе на веласіпедзе, яму абавязкова гэта спадабаецца і паступова ўсялякія праблемы будуць вырашаны.

НА ЦТ АБІТУРЫЕНТЫ ДАПУСКАЮЦЬ ПАМЫЛКІ

НАВАТ У СВАІМ ПРОЗВІШЧЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Амаль кожны год здараюцца выпадкі, калі за аднаго чалавека спрабуе прайсці на экзамен іншы. Так, у 2010 годзе ў філіяле БДЭУ на тэсціраванні па англійскай мове арганізатары высветлілі, што за абітурыентку здае экзамен... студэнтка другога курса Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта. Цікава, што адна з дзяўчат была бландзінкай, а ў другой былі цёмныя валасы. На што яны спадзяваліся? Быў выпадак, калі ў адным з рэгіянальных пунктаў правядзення цэнтралізаванага тэсціравання арганізацыйная камісія выявіла і не дапусціла да ўдзелу ў тэсціраванні цэлую сям'ю: на экзамен спрабавалі прайсці маці, бацька (абодва настаўнікі гісторыі) і іх дачка-абітурыентка.

У іншым пункце правядзення ЦТ пільныя члены арганізацыйнай камісіі разгледзелі «жывую энцыклапедыю», ролю якой выконвала абітурыентка, якая ўсе гістарычныя даты занатавала на сваім целе. Яшчэ адзін малады чалавек спрабаваў выкарыстаць шпаргалкі, зробленыя ў выглядзе наклееных на лісты старонак з падручніка. Але сапраўднай загадкай стаў для арганізатараў ЦТ малады чалавек, які прыхапіў з сабой калькулятар на тэсціраванне... па біялогіі.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Інфармацыя аб выніках ЦТ арыенціровачна будзе прадстаўлена:

па беларускай мове — 27 чэрвеня
рускай мове — 27 чэрвеня
біялогіі — 28 чэрвеня
матэматыцы — 29 чэрвеня
грамадазнаўстве — 29 чэрвеня
хіміі — 1 ліпеня
сусветнай гісторыі навейшага часу — 1 ліпеня
фізіцы — 2 ліпеня
гісторыі Беларусі — 2 ліпеня
замежных мовах — 3 ліпеня
геаграфіі — 4 ліпеня
вынікі дапушчаных да здачы ЦТ у рэзервовы дзень — 7 ліпеня.

ды чалавек вырашыў адлучыцца... на перакур. Прычым ён пакінуў не толькі аўдыторыю, але выйшаў з будынка. (Паводле правілаў, абітурыент можа выйсці з экзаменацыйнай аўдыторыі толькі ў прыбіральню, прычым у суправаджэнні аднаго з арганізатараў.) Натуральна, што для гэтага абітурыента прыёмная кампанія скончылася яшчэ на самым старце.

Вельмі крыўдны выпадак здарыўся з хлопцам, вынікі работы якога былі анулюваны пасля шматразовых патрабаванняў здаць экзаменацыйную работу. У адпаведнасці з Палажэннем аб правядзенні ЦТ, адказныя арганізатары, якія прысутнічаюць у аўдыторыі, павінны інфармаваць за 15 і 5 хвілін аб заканчэнні часу, адведзенага на выкананне педагагічнага тэста, што яны і зрабілі. Але і пасля заканчэння 120 хвілін, якія даюцца на выкананне тэста па беларускай і рускай мовах, хлопец спрабаваў дапісаць сваю работу, не звяртаючы ўвагі на патрабаванні арганізатараў. Гэта з'яўляецца грубым парушэннем правілаў удзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні, таму анулюванне вынікаў тэставай работы абітурыента стала цалкам заканамерным і справядлівым пакараннем.

Гадоў пяць-шэсць таму ў прыёмнай камісіі ВНУ была выяўлена падробка сертыфіката ЦТ — дакладней, у ім былі падпраўлены балы. Работнікі Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў тут жа «прабілі» звесткі па сваёй базе і ўстанавілі, колькі балаў на самой справе набраў абітурыент. Для яго прыёмная кампанія на гэтым завяршылася. Між іншым, амаль кожны год, як толькі абітурыенты атрымліваюць на рукі свае сертыфікаты, з лёсавызначальнай паперай пачынаюць здарацца містычныя сітуацыі: то зальюць яе зялёнкай, то сертыфікат становіцца «ахвярай» сабакі, а некаторыя і ўвогуле ўмудраюцца яго згубіць.

Забаронена мець пры сабе ў экзаменацыйных аўдыторыях мабільныя тэлефоны не толькі абітурыентам, але і педагогам-арганізатарам, якія сочаць падчас выпрабаванняў за парадкам у аўдыторыях. Ім нельга мець з сабой таксама ручкі (гелевыя ці капілярныя) чорнага колеру, каб ніхто і ні ў чым іх нават не западозрыў. І «профіль» падрыхтоўкі педагога не павінен супадаць з профілем экзаменацыйнай дысцыпліны: скажам, філолагі прысутнічаюць на ЦТ па матэматыцы, а матэматыкі — на гісторыі Беларусі...

Не здзіўляюцца ў Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў ужо даўно і памылкам, якія абітурыенты ўмудраюцца дапускаць пры напісанні ўласнага прозвішча ці імені. Слова «Надежда» пішуць як «Надежа», у імені па бацьку «Віктаравіч» ці імені «Дзяніс» дапускаюць ажно тры памылкі. Ёсць абітурыенты, якія ўвогуле забываюць з-за хвалявання запоўніць у бланку вобласць рэгістрацыі. Пэўная колькасць абітурыентаў здаюць абсалютна чысты бланк адказаў, прычым і на «чарнавіку» не назіраецца «слядоў» інтэлектуальнай работы. Арганізатары заўважылі

Выяўленне мабільнага тэлефона ў экзаменацыйнай аўдыторыі заўсёды азначае толькі адно — адхіленне ад далейшага ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні і выдаленне з аўдыторыі. Прычым не мае значэння: званіў тэлефон ці не, карыстаўся абітурыент сваім мабільнікам падчас экзамену ці проста трымаў яго ў сваёй кішэні. Былі выпадкі, калі мабільны тэлефон званіў ужо пасля таго, як абітурыент здаў сваю тэставую работу, але не паспеў выйсці з аўдыторыі. У некаторых мабільнікі звіняць літаральна падчас экзамену. Усё адно — тэставая работа анулюецца без права пераздачы тэсціравання ў рэзервовы дзень. Арганізатары ЦТ прызнаюцца, што не могуць знайсці тлумачэння ўпартасці некаторых маладых людзей, якія спрабуюць праігнараваць установленыя правілы.

— Справа ў тым, што ў нашай сітуацыі званок сябру цалкам выключаны, бо прадыктаваць умовы задачы і дачакацца правільнага адказу ніхто не дасць. Цэнтралізаванае тэсціраванне — не тэлевізійная перадача і не латарэя. Хацелася б, каб усе гэта зразумелі, — падкрэслівае дырэктар Рэспубліканскага інстытута ведаў Мікалай ФЯСЬКОЎ. — Між іншым, і ў гэтым годзе толькі на тэсціраванні па матэматыцы дзесяць чалавек былі адхілены ад удзелу з-за мабільных тэлефонаў, а адзін — з-за калькулятара, які быў адначасова і ўстройствам для перадачы інфармацыі.

Сёлета ўжо ў першы дзень правядзення цэнтралізаванага тэсціравання адбыўся таксама выпадак, які ўвогуле знаходзіцца за рамкамі разумення, хоць і раней здараліся прыкрыя выпадкі, калі на экзамен спрабавалі прайсці абітурыенты нападпітку. Падчас тэсціравання ў Горацкай сельгасакадэміі малатаксама, што прыкладна 20 працэнтаў маладых людзей пакідаюць экзаменацыйныя аўдыторыі на працягу першых 30 хвілін. І якія могуць быць у іх балы?

Але сапраўднай нечаканасцю для работнікаў Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў сталі ў 2008 годзе тэставыя работы абітурыентаў з Магілёўскай вобласці. Як высветлілася, аўтары «сюрпрызу» карысталіся на ЦТ па беларускай мове гелевымі ручкамі з серабрыстым адценнем. Праблема ў тым, што сканар добра бачыць толькі тэкст, які напісаны чорным чарнілам, а чорнае чарніла з серабрыстым адценнем ён «прачытаць» проста не змог. У гэтай сітуацыі для верыфікацыі тэставых работ спатрэбілася больш часу, чым звычайна, паколькі размова ішла пра сотні чалавек.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЦІКАВА ВЕДАЦЬ:

На верыфікацыі ў Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў задзейнічаны пераважна дзяўчаты-студэнткі. У інстытуце пераканаліся, што дзяўчаты больш падыходзяць для манатоннай работы. Справа ў тым, што сучаснае праграмнае забеспячэнне не гарантуе стапрацэнтнай якасці пераводу рукапіснага тэксту ў электронны фармат. Таму на верыфікатараў ускладзена адказная задача — прасачыць за правільнасцю распазнавання сімвалаў на бланках. Скажам, камп'ютар можа прыняць лічбу «3» за лічбу «8», калі яна напісана неакуратна. А чалавек гэта бачыць і папярэджвае памылку, якая можа абітурыенту вельмі дорага каштаваць. Ці, напрыклад, камп'ютар можа няправільна прачытаць прозвішча абітурыента, таму і сертыфікат будзе выпісаны затым з памылкай у прозвішчы ці ў пашпартных звестках. Верыфікацыя праводзіцца тры-чатыры разы рознымі людзьмі, і фактычна адзін кантралюе другога. У спрэчнай сітуацыі папяровы бланк заўсёды можна зверыць з электроннай выявай. Да прэтэндэнтаў у верыфікатары прад'яўляюцца два асноўныя патрабаванні. Яны не могуць удзельнічаць сёлета ў цэнтралізаваным тэсціраванні і не павінны курыць. Работа па верыфікацыі патрабуе максімальнай канцэнтрацыі ўвагі, таму рабочая змена доўжыцца толькі чатыры гадзіны. З 9 гадзін раніцы да 21 гадзіны за камп'ютарнай тэхнікай змяняюцца тры змены.

ФІЗІКА БЕЗ МАТЭМАТЫКІ?

23 чэрвеня абітурыентаў чакае бадай што самы складаны экзамен — тэсціраванне па фізіцы. Менавіта фізіку абітурыенты кожны год здаюць горш, чым іншыя прадметы.

Аналізуючы вынікі тэсціравання і рабочыя запісы абітурыентаў на працягу двух апошніх гадоў, спецыялісты Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў прыйшлі да наступных высноў.

Па-першае, тыповыя памылкі, якія дапускаюць удзельнікі ЦТ, звязаны з іх няўменнем прымяняць законы фізікі ў канкрэтных сітуацыях. Многія абітурыенты няправільна рашаюць задачы з-за фармальнага ведання фармулёвак асноўных фізічных законаў, іх матэматычных выражэнняў, няўважлівага чытання ўмоў задачы і малюнкаў, якія іх суправаджаюць.

Замест уважлівага аналізу ўмоў задачы ўдзельнікі тэсціравання спрабуюць проста падабраць формулу, якая, як ім падаецца, «падыходзіць», і «падставіць» значэнні зададзеных велічынь (адна з найбольш распаўсюджаных памылак). На жаль, некаторыя абітурыенты не ведаюць адзінак фізічных велічынь і суадносіны паміж імі, няправільна пераводзяць іх у сістэму СІ.

Па-другое, многія памылкі звязаны з недастатковай матэматычнай падрыхтоўкай. Правільна рашыўшы задачу «фізічна», абітурыенты дапускаюць памылкі ў рашэнні сістэмы ўраўненняў, у матэматычных пераўтварэннях формул, пры выкананні дзеянняў з вектарамі, трыганаметрычнымі функцыямі і гэтак далей. Некаторыя абітурыенты памыляюцца пры аналізе графікаў, не могуць прымяняць правілы прыблізных вылічэнняў, правільна акругліць канчатковы адказ. Для таго, каб справіцца з тэстам па фізіцы, неабходна выдатна валодаць усімі матэматычнымі аперацыямі. Для камп'ютара не мае ніякага значэння, чаму быў дадзены няправільны адказ (з-за матэматычнай памылкі або з-за фізічнай) — у любым выпадку балы абітурыент губляе. Зразумела, што ў выйгрышы будуць абітурыенты, у якіх развіты навык вуснага лічэння. Аднак на тэсціраванні па фізіцы няма заданняў, дзе была б складаная матэматыка, якая аднімае шмат часу.

Асаблівасць тэсціравання ў тым, каб выбраць рацыянальны шлях рашэння, таму, калі хтосьці сцвярджае, што рашэнне заняло ў яго некалькі старонак — гэта значыць, што абітурыент выбраў не самы кароткі шлях. Матэматычна больш простае рашэнне магчыма, калі выбраць пэўную сістэму адліку ці выкарыстоўваць законы захавання імпульсу і энергіі. Напрыклад, пры выкарыстанні другога закона Ньютана пры разглядзе руху цела праецыраванне вектараў найбольш рацыянальна на восі сістэмы адліку, адна з якіх супадае з напрамкам вектару паскарэння.

Пры разглядзе кароткатэрміновых узаемадзеянняў (удараў, выбухаў, сутыкненняў) рацыянальна выкарыстоўваць закон захавання імпульсу.

Калі ў задачы разглядаецца рух цела па крывалінейнай траекторыі, нічога не сказана пра сілы супраціўлення руху, зададзена малая колькасць фізічных велічынь, то найбольш рацыянальна выкарыстоўваць закон захавання механічнай энергіі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Два гады таму на тэсце па фізіцы было прапанавана заданне першага ўзроўню складанасці наступнага зместу: «Назавіце адзінку электрычнага напружання ў міжнароднай сістэме СІ» з варыянтамі адказаў: ампер, ом, вольт, ньютан і джоўль. 68,28 працэнта абітурыентаў далі правільны адказ. Але 31,72 працэнта не ведаюць, што электрычнае напружанне вымяраецца ў вольтах. Няўжо яны ніколі не бачылі, што напісана на бытавых разетках?

Кінапрагляд як прафілактыка

«ВЫШЭЙ ЗА НЕБА». У ДВУХ ВАРЫЯНТАХ

У офісе Праграмы развіцця ААН у Мінску журналістам прэзентавалі першую серыю моладзевага серыяла — 8-серыйнага фільма «Вышэй за неба». У эпізодах «засвяціліся» добра знаёмыя «зорныя» твары, у галоўных жа ролях — непрафесіяналы, якія недарэмна прайшлі сур'ёзны кастынг. Трэба прызнаць, апошнім удалося заслужыць сімпатыю прадстаўнікоў СМІ нават з адной серыі.

У мяне асабіста нарадзілася пара-тройка пытанняў да падачы пэўных эпізодаў, але гэта таму, што я не ўлічыла галоўнага: серыял мае цалкам канкрэтныя мэты, яго нельга разглядаць як камерцыйны праект, нашпігаваны «гарачымі» сцэнкамі... На жаль, я ўжо не трапляю ў мэтавую аўдыторыю, і, тым не менш, з нецярплівасцю буду чакаць, калі па айчынным тэлебачанні пакажуць поўную версію.

Чым скончыцца гісторыя няпростых узаемаадносін са знешнім светам галоўнага героя Мікіты, не так даўно можна было даведацца дзякуючы YouTube, дзе сцэнарыст фільма Андрэй Курэйчык прапанаваў сваю версію (літаральна днямі адміністрацыя інтэрнэт-партала YouTube выдаліла з яго старонак незаконна размешчаную версію «Вышэй за неба»). Гэтая версія не з'яўлялася чымсьці экстраардынарным. Проста Курэйчык прапанаваў твор у такім выглядзе, у якім падабаецца менавіта яму. Між тым, у ПРААН — донара праекта — была свая канкрэтная мэта.

У межах рэалізацыі гранта Глабальнага фонду для барацьбы са СНІДам, туберкулёзам і малярыяй нарадзілася ідэя стварэння ўнікальнага ў прафілактычнай практыцы праекта — серыяла, скіраванага на прафілактыку ВІЧ-інфекцыі, зніжэнне дыскрымінацыі ў дачыненні да ВІЧ-станоўчых людзей, на разбурэнне стэрэатыпаў, якія існуюць вакол тэмы ВІЧ/СНІД, акцэнтаванне ўвагі на важнасці і неабходнасці клопату пра сябе і блізкіх. Паколькі мэтавай аўдыторыяй — а гэта маладыя людзі ва ўзросце 19-27 гадоў — найбольш запатрабаваны фармат серыяла, то і было вырашана здымаць менавіта серыял. Андрэй Курэйчык узяў удзел у міжнародным конкурсе ПРААН на пасаду сцэнарыста і напісаў найбольш удалы сінопсіс (кароткае апісанне дзеяння з дабаўленнем вобразных элементаў). Паводле кантракта, Андрэй павінен быў напісаць сцэнарый, узгадніць яго з ПРААН, прасачыць адпаведнасць здымачнаму матэрыялу.

Асабліва непрыемны той факт, што спадар Курэйчык незаконна спекулюе матэрыялам ПРААН, спрабуе прыцягнуць да сябе ўвагу не толькі за чужы кошт, але і за кошт праблемы ВІЧ у Беларусі.

Зацверджаны сцэнарый быў падпісаны бакамі, узгоднены з Міністэрствам аховы здароўя, пратэставаны на мэтавай аўдыторыі — моладзі і людзях, якія жывуць з ВІЧ. Аднак, паводле пазіцыі ПРААН, Курэйчык парушыў умовы кантракта, што высветлілася на здымачнай пляцоўцы і падчас праверкі знятага матэрыялу.

Той факт, што фільм быў размешчаны на YouTube, ПРААН разглядала як парушэнне сваёй інтэлектуальнай уласнасці, аўтарскіх правоў. Спадар Курэйчык не меў права капіраваць матэрыял і, тым больш, ствараць уласную версію, якая з'яўляецца кантрафактнай.

— Наш серыял скіраваны на шырокую аўдыторыю, — тлумачыць **каардынатар кінапректа Марыя МАЛІНОЎСКАЯ.** — Ні пра якую аўтарскую версію ў гэтым выпадку не можа ісці размова. Нам асабліва непрыемны той факт, што спадар Курэйчык незаконна спекулюе матэрыялам ПРААН, спрабуе прыцягнуць да сябе ўвагу не толькі за чужы кошт, але і за кошт праблемы ВІЧ у Беларусі. Праект з'яўляецца сацыяльным, і яго галоўная мэта — змена паводзін моладзі на менш рызыкоўныя. «Вышэй за неба» — не проста фільм, а сацыяльны прадукт, які павінен быць выраблены па пэўных тэхналогіях, уключаючы тэставанне матэрыялу на фокус-групах. Версія Андрэя Курэйчыка ўхіляе фільм у бок ад асноўнай тэмы. Акрамя таго, у яго версіі выразаны сцэны, вельмі важныя менавіта для раскрыцця тэмы ВІЧ. Напрыклад, сход людзей, якія жывуць з ВІЧ, у групе ўзаемадапамогі, дзе яны ўзнімаюць тэмы, якія дагэтуль так шырока не абмяркоўваліся...

ПРААН некалькі разоў афіцыйна звяртаўся на партал YouTube, да ўсіх арганізацый, якія размясцілі відэаматэрыялы, што належаць ААН. Многія арганізацыі адрэагавалі адразу, YouTube — толькі нядаўна. Сёння ПРААН вядзе храналогію ўсіх фактаў парушэння аўтарскіх правоў і ў любы момант можа пачаць міжнародны арбітражны працэс, аднак гэта не самамэта, паколькі і без судовага разбору спадар Курэйчык нашкодзіў уласнай дзелавой рэпутацыі.

Тым часам творчая група прыступіла да мантажу астатніх сямі серый. На гэтым этапе не планавалася задзейнічаць ні сцэнарыста, ні рэжысёра Дзмітрыя Марыніна. Прозвішчы абодвух, зразумела, будуць указаны ў цітрах.

Стваральнікі праекта лічаць, што пэўныя непаразуменні, па вялікім рахунку, уладжаны, канфлікт можна лічыць вычарпаным, паколькі спадар Курэйчык дасягнуў сваёй мэты — выдаў уласную версію. Але гэта не азначае, што праца творчай групы фільма страціла сэнс. Паводле задуманага, гледачамі «Вышэй за неба» павінны стаць як сталічныя блогеры, так і сельская моладзь, якая не мае шырокага доступу да камп'ютара. Пакуль найбольш моцным каналам камунікацыі для вырашэння прафілактычных задач застаецца тэлебачанне. Стужку яшчэ не паказвалі ні БТ, ні іншым тэлеканалам. Мяркуецца, што максімальна якасны прадукт будзе паказаны на беларускім тэлебачанні праз некалькі месяцаў.

Святлана БАРЫСЕНКА.

З 2004 года ПРААН рэалізуе ў Беларусі гранты Глабальнага фонду для барацьбы са СНІДам, туберкулёзам і малярыяй. Сродкі грантаў атрымліваюць звыш 70 арганізацый-атрымальнікаў. З дапамогай праектаў, на якія ідуць сродкі, вырашаецца цэлы шэраг задач па захаванні і ўмацаванні здароўя нацыі, у тым ліку ў галіне прадухілення ВІЧ-інфекцыі. Гэта прафілактыка, лячэнне, догляд і падтрымка — а дакладней, удасканаленне нацыянальных стандартаў дыягностыкі і лячэння ВІЧ/СНІДу і бесперапынная пастаўка ў краіну антырэтравірусных прэпаратаў. Антырэтравірусную тэрапію ў нашай краіне атрымліваюць звыш 3,2 тысячы ВІЧ-інфіцыраваных, у тым ліку 143 дзіцяці. Асабліва ўвага надаецца зніжэнню ўзроўню дыскрымінацыі ў дачыненні да «станоўчых». У Беларусі дзейнічае таксама Інфармацыйная стратэгія па ВІЧ/СНІДзе — для ўкаранення стандартаў прагрэсіўнага сацыяльнага піяру.

УДЗЕЛЬНІЧАЮЦЬ УСЕ!

У Мінску прайшла першая «ФотаСушка»



Тым, хто днямі гуляў па вуліцы Рэвалюцыйнай у сталіцы, выпала бачыць шмат людзей з фотаапаратамі. Гэта былі ўдзельнікі «Сушкі». Дакладней, «ФотаСушкі» — акцыі па абмене фатаграфіямі, што адбывалася пры падтрымцы Музея гісторыі Мінска і часопіса citydog.by.

Уздоўж і ўпоперак унутранага дворыка музея расцягнулі вяроўкі для сушкі бялізны, і на іх за прышчэпкі вешалі фотаздымкі. Кожны ахвотны мог узяць сабе фота, што прыйшлося яму даспадобы, але ўзамен павінен быў пакінуць сваё — гэта адзіная абавязковая ўмова акцыі. На здымках таксама можна было пакідаць свае каардынаты і пажаданні іншым удзельнікам мерапрыемства.

— *Гэта першая «Сушка» ў Мінску,* — распавёў адзін з арганізатараў праекта Аляксей Ільін. — *Ініцыятыва ідзе з Расіі, там ужо ў многіх гарадах праводзіліся такія акцыі. Але і мы хутка плануем зладзіць «ФотаСушку» ў Гомелі.*

Падчас імпрэзы гледачоў і фатографаў сімвалічна частавалі сушкамі. Дарэчы, само слова «сушка» арганізатары звязваюць са свабодай. Гэта і вецер, што хістаў-сушыў-зрываў з прышчэпак фотаздымкі, і адсутнасць сцен выставачнай залы, і свабодны выбар тэм, і вольны абмен фатаграфіямі паміж шматлікай публікай. Ды і сама сутнасць акцыі заключаецца ў тым, каб зрабіць стасункі паміж фатографамі свабоднымі.

— *«ФотаСушка» ладзіцца для таго, каб фотааматары маглі абменьвацца кантактамі, магчыма, з далейшай перспектывай супрацоўніцтва. У акцыі могуць удзельнічаць абсалютна ўсе — як прафесіяналы з грувасткай тэхнікай, так і навічкі з «мыльніцамі», абмежаванняў ніякіх няма,* — падвёў вынік Аляксей Ільін.

Першая мінская «ФотаСушка» доўжылася з 14 да 19 гадзін, аднак, калі прыняць да ўвагі колькасць ахвотнікаў памяняцца фотаздымкамі, здавалася, што і цэлага дня для гэтага было б мала.

Дзіяна СЕРАДЗЮК.
Фота аўтара і Надзеі БУЖАН.

Гаспадары без чвэрцьфіналу

Сталі вядомыя ўсе ўдзельнікі чвэрцьфінальнай серыі чэмпіянату Еўропы па футболе, які сёлета сумесна прымае Польшча і Украіна.

Апошнія шчасліўчыкі вызначаліся ў квартэце D. Для таго каб прабіцца ў накаўт-раўнд, украінцам трэба было перамагаць Англію. Зборная Алега Блахіна прадэманстравала сапраўды выдатны футбол, але ўсё роўна саступіла брытанцам — 0:1. У другім тайме бакавы арбітр не залічыў стапрацэнтны гол украінцаў, калі капітан англічан Джон Тэры выбіваў мяч са сваіх варот, што яшчэ больш дадасць аргументаў на карысць увядзення ў сучасным футболе электроннай фіксацыі ўзяцця варотаў. У другім матчы шведы перайгралі французаў з лікам 2:0, але «вікінгам» для працягу барацьбы на чэмпіянаце сваёй першай вікторыі не хапіла. Далей ідуць французы і англічане.

У 1/4-й фіналу чэхі ўжо сёння сустрэнуцца з партугальцамі, заўтра Германія згуляе з Грэцыяй, 23-га чэрвеня іспанцы паспрабуюць на трываласць французаў, а 24-га англічане за пуцёўку ў паўфінал пасупернічаюць з італьянцамі.

Тарас ШЧЫРЫ.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
21 06 2012 г.

Няпісаныя правілы

А ГЭТА ВАМ «НА ЧАЙ»!

Амаль кожнаму з нас хоць раз у жыцці даводзілася абедаць у кавярні, бавіць час у бары ці святкаваць нейкае мерапрыемства ў рэстаране. Калі праблем з паводзінамі ў гэтых месцах, як правіла, не ўзнікае, то ў няёмкія сітуацыі, звязаныя з чаявымі, траплялі многія. Усім вядома, што так званыя грошы «на чай» пакідаць прынята. Аднак мала хто ведае, як правільна гэта рабіць, і самае галоўнае, колькі лішніх купюр выцягнуць са свайго кашалька.

«Падзяка» па-амерыканску і па-японску...

За мяжой сістэма чаявых склалася даўно і парушыць яе — значыць заслужыць маўклівую пагарду абслуговага персаналу. У ЗША, напрыклад, прынята пакідаць «на чай» даволі вялікія грошы. Тут бонтонам лічацца чаявыя ажно да 25 % ад кошту заказу. Сума залежыць ад штата і горада, дзе размяшчаецца рэстаран, а таксама ад яго ўзроўню і якасці абслугоўвання: чым даражэйшая ўстанова, тым больш грошай трэба пакінуць «на чай».

А вось у Італіі ўлада лічыць, што чаявыя павінны абкладацца падаткам. Але не так лёгка пракантраляваць гэты працэс. Таму аматары італьянскай кухні не здзіўляюцца, калі іх на ўваходзе з рэстарана можа спыніць фінінспектар і запатрабаваць прад'явіць рахунак, каб устанавіць, колькі яны заплацілі чаявых.

Дарэчы, не ва ўсіх краінах прынята пакідаць чаявыя. У адрозненне ад амерыканцаў аўстралійцы плацяць у рэстаранах толькі па рахунку. А вось у Японіі пакінутыя грошы «на чай» могуць успрыняцца як абраза. Калі іншаземец усё ж захоча падзякаваць японцам ці па звычцы пакіне лішнія грошы, то яго дагоняць на выхадзе і вернуць іх.

А ў Аўстрыі існуе цалкам законны спосаб увогуле не плаціць за абед ці вячэру. Калі вы тры разы папрасілі афіцыянта прынесці рахунак, а ён ніяк на гэта не адрэагаваў, то ў такім выпадку вы маеце поўнае права выйсці з рэстарана, нічога не заплаціўшы. Праўда, на вялікі жаль ці на шчасце, няпамятлівых афіцыянтаў у гэтай краіне не засталося.

А як у нас?

У нашай краіне чаявыя маюць досыць «свабодны» характар. У рахунках большасці беларускіх рэстаранаў графа «плата за абслугоўванне» адсутнічае. Даваць «на чай» ці не — асабістая справа кожнага. Але афіцыянты будуць не супраць, калі наведнік «падзякуе» не толькі словамі за добрае абслугоўванне. «Узнагарода афіцыянту вітаецца, але заўсёды застаецца на ваша вырашэнне», — напісана на многіх чэках.

— Чаявыя лічацца ўласнасцю таго, каму іх пакінулі, — расказвае афіцыянтка адной са сталічных кавярняў Ганна Чарнаморава. — Уладальнік рэстарана не мае права забараніць афіцыянтам прымаць грошы за абслугоўванне. У сваю чаргу ніводзін афіцыянт не павінен парушаць абавязкі дзеля карысталюбства.

На жаль, не ўсе афіцыянты добрасумленна ставяцца да сваёй працы. Часам можна назіраць такія сітуацыі, калі яны паводзяць сябе не самым лепшым чынам: папрашайнічаюць і нават пачынаюць крыўдзіць, на іх думку, не вельмі шчодрага кліента. У нашы дні такія на працы надоўга не затрымліваюцца. Не трэба забывацца абслуговаму персаналу і пра тое, што чаявыя не павінны нагадваць міласціну. Значна лепш, калі грошы «на чай» стануць узнагародай за добрую працу.

— Раней увогуле лічылася, што калі кліент пакідае «на чай», то ён зневажае чалавечую годнасць афіцыянта, — успамінае пенсіянерка Вера Мікалаеўна. — Сёння стала ўсё наадварот. Адсутнасць чаявых расцэньваецца як найгоршая абраза. На мой погляд, чаявыя залежаць ад культуры і «памеру» партманета таго, хто прыйшоў у рэстаран.

Не толькі афіцыянтам прынята пакідаць чаявыя. Ужо даўно ў нас прыжыліся заходнія традыцыі: беларусы лічаць сваім абавязкам «падзякаваць» за добрую паслугу таксістам, цырульнікам, пакаёўкам... Аднак часцей за ўсё пакідаюць чаявыя ў рэстаранах, таму што менавіта тут навідавоку не толькі якасць абслугоўвання, але і задавальненне ад смачна прыгатаванай ежы.

Чаявыя — гэта толькі добраахвотная падзяка за абслугоўванне, якое вам спадабалася. Традыцыі могуць быць рознымі, але ці варта даваць лішні рубель за сэрвіс, які не спадабаўся?

Цікава, а колькі не шкада наведнікам утульных кавярняў і бараў «ахвяраваць» за добра праведзены час?

Максім, дырэктар сталічнай музычнай крамы «Праспект»:

— Кожны раз я пакідаю «на чай» 10% ад кошту заказу. Нават калі мне не спадабалася абслугоўванне. І сітуацыя з павелічэннем цэн ніяк не паўплывала на мае прынцыпы. На мой погляд, калі ў цябе няма грошай, лепш нікуды не ісці. Бывае, што я вельмі задаволены якасцю абслугоўвання. Тады пакінутыя чаявыя перавышаюць суму за заказ, якую я павінен заплаціць.

Алена, індывідуальны прадпрымальнік, мінчанка:

— Мне давялося пабываць не толькі ў кафэ і рэстаранах нашай краіны, пашчасціла папіць кавы і ў лепшых барах Еўропы. І хачу адразу сказаць, што падчас адпачынку ў такіх установах там не ўзнікае такой думкі, якая абцяжарвае твой розум у нас: колькі пакінуць «на чай»? Бо еўрапейцы не прымаюць дадатковых грошай: у іх усё строга па рахунку. А калі ў цябе ўсё ж атрымаецца пакінуць чаявыя, то ніводны добрасумленны афіцыянт не забярэ гэтыя грошы сабе — усё пойдзе ў касу кавярні. Калі быць шчырай, то там не шкада аддзякаваць за добрае абслугоўванне. У нас сітуацыя іншая: дадаткова плаціць няма за што.

Дзмітрый, вадзіцель таксі «Іскра» ў г. Ліда:

— Еўрапейская традыцыя пакідаць «на чай» прыжылася ў Беларусаў. Я стаўлюся да гэта неадназначна. З аднаго боку, гэта спосаб падзякі і стымулявання абслуговага персаналу да добрага выканання сваіх абавязкаў. З іншага — гэта іх праца, за якую яны атрымліваюць заробак. Прадаўцам жа ніхто не хоча даваць лішніх грошай, калі яны параілі, які тавар выбраць. Што датычыцца мяне, то я не буду арыгінальным, калі скажу, што за добрую працу не шкадую пакласці афіцыянтам у разліковую кніжку некалькі лішніх тысяч, калі ж яна дрэнная — абавязкова буду чакаць рэшту, нават калі гэта дробязь.

Кацярына, студэнтка:

— Да пытання чаявых я падыходжу вельмі скрупулёзна. Калі прадстаўнікі абслуговага персаналу падчас майго знаходжання ў кавярні ставіліся да мяне ветліва, не грубіянілі, часта падыходзілі па просьбе, мянялі посуд пры неабходнасці, неназойліва раілі, якую страву выбраць, тады абавязкова пакіну прыкладна 10% ад рахунку пры ўмове, што ён не будзе складаць вялікую суму. І не больш, бо з майго рахунку яны і так маюць пэўны працэнт. Ды мяне ніколі і не абслугоўвалі так, каб было жаданне пакінуць звыш 10 %. На мой погляд, афіцыянты і бармены абавязаны ставіцца да кліентаў з павагай, бо яны — твар сваёй установы. Тады пакідаць «на чай» нават прыемна: гэта падзяка тым людзям, хто робіць твой адпачынак лепшым.

Падрыхтавала Вераніка КАНЮТА.

ЭЛЕКТРОННАЕ ГУЧАННЕ KOSTYA OUTTA

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Напрыканцы ён сказаў: «У апошні час у мяне нават сон не займае столькі часу, колькі музыка. Сон — гэта толькі адчуванне ў выглядзе больш працяглага фізічнага камфорту».

— Кім бы ты быў, калі б не стаў музыкантам?

....маўчанне

— Я думаю, што пытанне зададзена некарэктна *(смяёмся разам)*. Таму што я бачу сябе выключна ў музыцы. Гэта тое, што суправаджала мяне з самага пачатку, з першых прыкмет свядомасці. І я не развітваюся з ёй дагэтуль. Усё астатняе — прыходзіць і сыходзіць.

Я, шчыра, калі пазнаёміўся з музыкай, якая не мае меладычнага складніка, адразу не зразумеў, у чым тут прыкол.

— Як ты ацэньваеш нашу аўдыторыю прыхільнікаў электроннай музыкі?

— Яна нядрэнная, але часта прысутнічае такая з'ява, як безыніцыятыўнасць і прыняцце таго, што прасцей прыняць.

Не заўсёды людзі ходзяць на мерапрыемствы ў такой колькасці, у якой хацелася б іх бачыць. Аднак такога, каб увогуле не прыйшлі, яшчэ не было *(смяецца)*.

Я б прапаноўваў прыводзіць сваіх сяброў на нашы тусоўкі і паказваць, што музыка бывае не толькі такой, якую вы прызвычаіліся слухаць па радыё. Часам музыка толькі забруджвае вашы мазгі бескарысным тэкстам — песнямі, якія пішуцца толькі дзеля таго, каб трапіць табе ў галаву і пасля там гучаць і гучаць... Каб ты нарэшце зразумеў: «Ага, я памятаю гэтую песню, трэба купіць дыск, таму што мне гэта запомнілася, я гэта спяваю — значыць, мне падабаецца». А насамрэч, проста запомнілася.

— Аднак кожны шукае сваё...

— Не, каб кожны шукаў — гэта было б праяўленнем ініцыятывы. А так мы (можа, і не мы) прызвычаіліся, што нас усё задавальняе — навошта табе штосьці шукаць і мець нешта новае?...

— Што ўяўляе сабой беларуская электронная тусоўка, калі параўноўваць яе з іншымі?

— Кантраст вялізны. Давялося пабываць у Германіі і наведаць клуб у Дзюсельдорфе — вечарынка пачыналася ў пятніцу, а скончылася ў нядзелю-панядзелак. Самыя заўзятыя прыхільнікі электроннай музыкі прысутнічалі ад пачатку да канца. Так сталася, што мы прыйшлі амаль да самага пачатку — людзей было няшмат, выглядала як звычайная мінская вечарынка. Але бліжэй да паўночы, месца вольнага не заставалася. Прычым музыка, якая там іграла, — гэта музыка больш інтэлектуальнага характару, чым эмацыянальнага.

— Як бы ты гэта апісаў — інтэлектуальная музыка?...

— Возьмем, да прыкладу, два стылі — progressive і techno. У першым абавязкова прысутнічае мелодыя — адлюстраванне эмацыйнага стану. Techno не мае меладычнага складніка, ідэі закладзены ў саміх гуках, іх пабудове аднаго адносна другога, рытмічных малюнках.

Я, шчыра, калі пазнаёміўся з музыкай, якая не мае меладычнага складніка, адразу не зразумеў, у чым тут прыкол. Праз нейкі час усё ж такі ўцяміў, у чым справа: я не звяртаў увагі на дробязі, з якіх, здаецца, складаецца жыццё. Тое ж і ў стылі tehno. Сама ідэя закладзена ў дробязях, якія, на першы погляд, можна не заўважыць.

Бездань ідэй яшчэ не раскрыта ў такіх стылях, як techno, tech house, micro house, deep techno, leftfield і інш.

— Як пачалося тваё супрацоўніцтва з гуказапісвальнымі кампаніямі? Дзе ты іх «адкапаў». Ці яны цябе?..

— У пэўны момант я зразумеў, што пісаць музыку толькі для сябе — праяўленне чыстага эгаізму. Узнікла жаданне дзяліцца ўжо добрым прадуктам з астатнімі людзьмі, з тымі, каму гэта можа быць цікава. Усё прыйшло з вопытам не аднаго года працы. Я адправіў некаторыя свае трэкі на адзін лейбл, дачакаўся адказу аб тым, што іх зацікаўлены падпісаць.

— Як праходзяць твае выступленні ў клубах?

— Гэта можа быць дыджэй-сэт або лайв-выступленне, якое выконваецца з дапамогай кантролераў і праграмы Ableton Live, у якой пісаліся гэтыя трэкі. Атрымліваецца амаль жывое выступленне, калі музыка па падрыхтаванай схеме ствараецца практычна з нуля, з накладаннем эфектаў.

— Давай пагутарым пра тое, як нараджаецца электронны трэк...

— Што датычыцца тэхнічнага боку напісання, то гэта спецыяльныя праграмы. Я пішу партыі розных інструментаў, выбудоўваю іх адна адносна адной так, каб гучала цікава, прыгожа і выклікала нейкія эмоцыі або прымушала «варушыцца» мозг, бо без гэтага нічога не мае сэнсу.

— Што адбываецца пасля таго, як трэк гатовы?

— Далей, па завяршэнні ўсіх тэхнічных пытанняў, ён адпраўляецца на лэйбл. Лэйбл — гэта гуказапісвальная кампанія, якая займаецца продажам толькі праз інтэрнэт. Прадстаўнікі лэйбла адказваюць на адпраўлены ліст: калі іх цікавіць прадукт, то высылаецца кантракт, у якім пазначаны ўмовы, згодна з якімі яны выдаюць кампазіцыю. Праз пэўны час — вуаля! — можна ўбачыць свой трэк у продажы. Пры ўмове, што кампазіцыя добрая і лэйбл зацікаўлены, каб музыка не гучала ў нікуды, аўтар атрымлівае за яе грошы. Сума залежыць ад колькасці продажаў.

Большасць кампаній выпускае трэкі толькі ў інтэрнэце. Аднак ёсць і такія, што запісваюць іх і на фізічныя носьбіты — такія як CD, вініл.

— У наш час яшчэ выходзіць вініл?

— Так, выходзіць, і мае шмат прыхільнікаў музыкі, запісанай на вініле. Ёсць і розныя акцыі ў падтрымку гэтага руху, каб электронныя носьбіты не выцеснілі фізічныя.

— А што наконт творчага боку напісання трэка?

— Гэта даволі тонкі працэс. Патрэбен адмысловы стан або насычанасць нечым — у кожнага ў жыцці ёсць тое, што яго напаўняе. Калі гэтага становіцца дастаткова, чалавек творчы вылівае ўсё ў мастацтва. Я ў гэтым плане знайшоў сябе ў музыцы.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

ПРОСТЫ РЭЦЭПТ ТАГО, ЯК СТАЦЬ ДЫДЖЭЕМ, АД KOSTYA OUTTA:

- **Запісацца на курсы дыджэінга;**
- **Наведаць 15-20 заняткаў і атрымаць навык звядзення трэкаў;**
- **Зрабіць так, каб у табе былі зацікаўлены прамоўтары, якія маглі б запрасіць на вечарынку;**
- **Не сядзець пад замком, выходзіць на сувязь, абменьвацца, цікавіцца, як робяць іншыя, тыя, хто на ўзровень вышэй. Большасць з іх — дастаткова адкрытыя людзі і ніколькі не лічаць сябе нейкімі «зоркамі»;**
- **Галоўнае — любоў да музыкі, якая ўсіх аб'ядноўвае.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Аукцион состоится 26.07.2012 г. в 10.00
по адресу: 210600, г. Витебск, пр-т Черняховского, 19, конференц-зал.

Организатором аукциона является РУП «Белтелеком» в лице Витебского филиала РУП «Белтелеком», находящегося по адресу: г. Витебск, пр-т Черняховского, 19.

На аукционе выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества:

Лот 1. Помещение 2-го этажа здания, расположенного по адресу: ул. Якуба Коласа, 14 в г. Новополоцке Витебской области, удовлетворительного состояния, общей площадью 21,8 кв.м, срок аренды – не менее 3-х лет; начальная цена продажи – 5,45 базовой величины; размер задатка – 0,545 базовой величины; целевое использование – для производственных целей (за исключением вредных производств), размещения офисов, складского помещения, оказания услуг, коэффициент (п. 8.2 Указа № 150) составляет 3,0.

Лот 2. Помещения 8-го этажа в изолированном помещении, расположенном по адресу: г. Витебск, пр-т Черняховского, д. 19, пом. 1, удовлетворительного состояния, общей площадью 60,33 кв.м (48,35; 11,98), срок аренды – не менее 3-х лет; начальная цена продажи – 15,08 базовой величины; размер задатка – 1,508 базовой величины; целевое использование – для производственных целей (за исключением вредных производств), размещения офисов, складского помещения, оказания услуг, осуществления розничной торговли, коэффициент (п. 8.2 Указа № 150) составляет 3,0.

Документы на участие в аукционе принимаются с 21.06.2012 г. по 25.07.2012 г. в рабочее время (с 9.00 до 17.00), по адресу: г. Витебск, пр-т Черняховского, 19, каб. 509-п. Документы, поданные после 17:00 25.07.2012 г., не рассматриваются. Заключительная регистрация участников аукциона в день проведения аукциона с 9.00 до 10.00 по адресу: г. Витебск, пр-т Черняховского, 19, каб. 509-п.

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 №1049.

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе:

- перечисляет задаток на с/с № 3012072841543 в филиале № 200 – Витебском областном управлении ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 150801635, УНП 300977657 Витебский филиал РУП «Белтелеком»;
- подает заявление на участие в аукционе;
- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;
- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.

Помимо указанных документов:

- физическое лицо предъявляет документ, удостоверяющий личность;
- индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации;
- юридическое лицо (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на субсчет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись.

Срок заключения договора аренды: в соответствии с действующим законодательством.

Телефоны для справок: (0212) 27 29 42, 27 11 58, факс (0212) 27 18 81.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) извещает о проведении 24 июля 2012 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16

№ лота	Наименование объекта	Адрес объекта	Продавец	Краткая характеристика объекта	Начальная цена продажи, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.
1	**Здание очистных сооружений, инв. № 350/С-135550, общей площадью 159,3 кв.м**	г. Гомель, ул. Интернациональная, д. 49	Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при администрации Центрального района г. Гомеля.	Одноэтажное здание смешанных конструкций (кирпич, ж/б панели), перекрытия – ж/б плиты, электроснабжение.	1 488 413 759	10 000 000

Шаг аукциона – 5 %. К участию в аукционе допускаются лица, которые своевременно подали заявления на участие в аукционе по форме, определенной организатором аукциона, внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, представили другие необходимые документы и подписали соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Документы на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, каб. 2-16 по 23 июля 2012 года в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения.

Для участия в аукционе в адрес Организатора аукциона необходимо представить:

1. Заявление на участие в аукционе. 2. Копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком. 3. Организациям – резидентам Республики Беларусь – доверенность представителю организации (кроме случаев, когда организацию представляет ее руководитель), копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации (копию документа о создании организации, если она не подлежит государственной регистрации), заверенные юридическим лицом. 4. Индивидуальным предпринимателям – свидетельство о государственной регистрации. 5. Представителям физических лиц – резидентов Республики Беларусь – нотариально заверенную доверенность. 6. Организациям – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения. 7. Организациям и физическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык. 8. Представителям организаций и физических лиц – нерезидентов Республики Беларусь – легализованную в установленном порядке доверенность. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. В случае отсутствия у физического лица расчетного счета, необходимо открыть текущий расчетный банковский счет в любом банке РБ.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона (лот) продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается организатором аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения торгов. Победитель торгов обязан: подписать протокол о результатах аукционных торгов; согласно счету-фактуре, выписанному организатором аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, оплата которого осуществляется в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона; оплатить приобретаемое имущество в срок.

Задаток для участия в аукционе перечисляется на расчетный счет р/с № 3012209370018 в филиале ОАО «Белагропромбанк» Гомельское областное управление, код 912, ОКПО 02975763, УНП 400071204.

Дополнительная информация по телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 74 17 34, 74 89 64 и на сайте gomeloblreklama.by

04 июля 2012 г. в 10.30 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Брестский КСМ».

Повестка дня:

1. О приобретении акций ОАО «Брестский КСМ» на баланс общества.
2. О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Брестский КСМ»: г. Брест, ул. Гоздецкого, 28.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Гоздецкого, 28.

Время регистрации в день проведения собрания с 10.00 до 10.30.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 26.06.2012 г. (с 10.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

Совет директоров.

Изменения в проспект эмиссии третьего выпуска именных жилищных облигаций ОАО «Минскпромстрой»

Изложить п. 1.7. Размер уставного фонда в следующей редакции:

Размер уставного фонда 23 956 680 000 (Двадцать три миллиарда девятьсот пятьдесят шесть миллионов шестьсот восемьдесят тысяч) белорусских рублей. Уставный фонд сформирован полностью. На дату принятия решения о выпуске облигаций акции Эмитента полностью оплачены его акционерами.

УНП 100064639

Утерянные страховые полисы ЗСАО «БелИнгострах» добровольного страхования от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии ИС №№ 0423267, 0424461—0424466, 0424469, 0424475—0424476, 0424489—0424490, 0425191—0425193, 0425201, 0425204—0425210, 0425521—0425522, 0425529—0425530, 0427034, 0388285, 0409901, 0413041—0413042, 0413047, 0413050—0413052, 0413054, 0413058, 0413061—0413065, 0397499 **считать недействительными.**

УНП 100219645

БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ЭКОНОМИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ

объявляет прием в аспирантуру и докторантуру на 2012 год по следующим отраслям наук и специальностям:

АСПИРАНТУРА

	Дневная форма обучения*	Заочная форма обучения*
05.00.00 – ТЕХНИЧЕСКИЕ НАУКИ	**2**	**-**
05.19.08 – товароведение, экспертиза и безопасность непродовольственных товаров и сырьевых материалов	2	-
08.00.00 – ЭКОНОМИЧЕСКИЕ НАУКИ	**19**	**12**
08.00.01 – экономическая теория	-	-
08.00.05 – экономика и управление народным хозяйством	11	3
08.00.10 – финансы, денежное обращение и кредит	4	2
08.00.12 – бухгалтерский учет, статистика	-	6
08.00.13 – математические и инструментальные методы экономики	2	-
08.00.14 – мировая экономика	2	1
12.00.00 – ЮРИДИЧЕСКИЕ НАУКИ	2	2
12.00.02 – конституционное право; муниципальное право	-	-
12.00.03 – гражданское право; предпринимательское право; семейное право; международное частное право	2	2
12.00.14 – административное право; финансовое право; информационное право	-	-
23.00.00 – ПОЛИТИЧЕСКИЕ НАУКИ	**-**	**-**
23.00.01 – теория и философия политики, история и методология политической науки	-	-
23.00.02 – политические институты, процессы и технологии	-	-
23.00.04 – политические проблемы международных отношений глобального и регионального развития	-	-

Обучение в аспирантуре осуществляется: по дневной форме — 3 года, по заочной форме — 4 года, в форме соискательства — до 5 лет. Поступающие в дневную и заочную аспирантуру должны сдать кандидатские экзамены и зачеты по общеобразовательным дисциплинам до поступления.

Поступающие в аспирантуру предварительно проходят собеседование с заведующими соответствующих кафедр.

ДОКТОРАНТУРА

	Дневная форма обучения*
08.00.00 – ЭКОНОМИЧЕСКИЕ НАУКИ	**4**
08.00.01 – экономическая теория	-
08.00.05 – экономика и управление народным хозяйством	3
08.00.10 – финансы, денежное обращение и кредит	1
08.00.12 – бухгалтерский учет, статистика	-
08.00.13 – математические и инструментальные методы экономики	-
08.00.14 – мировая экономика	-

**Указано количество мест для обучения за счет средств республиканского бюджета.*

Обучение в докторантуре осуществляется: по дневной форме — 3 года, в форме соискательства — до 5 лет.

Прием лиц для получения послевузовского образования осуществляется в порядке, определенном Положением о подготовке научных работников высшей квалификации в Республике Беларусь (Указ Президента Республики Беларусь № 561 от 01.12.2011 г.).

Подготовка научных работников высшей квалификации осуществляется на договорной основе.

Зачисление в аспирантуру и докторантуру — **1 ноября 2012 г.**

По вопросам поступления в аспирантуру и докторантуру обращаться:
220070, г. Минск, пр-т Партизанский, 26, корпус 6, комн. 17
Тел.: (+375 17) 209 78 85. E-mail: aspirantura@bseu.by

Прием документов в аспирантуру и докторантуру: **с 1 августа по 28 сентября 2012 г.**

Время работы приемной комиссии: **с 9.00 до 17.00;** перерыв на обед: **с 13.00 до 14.00.**

Проезд: **трол. 3, 15, 16, 17, 34, 41, авт. 59, 79, 93 до ост. «Площадь Ванеева».**

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА С УСЛОВИЕМ по продаже права заключения договора аренды земельного участка

ЛОТ № 1	
Адрес объекта и его наименование	Земельный участок для строительства магазина в г. Мядель по ул. Красноармейской площадью – 0,1000 га (кадастровый номер 624050100001001340) **Начальная цена 13 381 500 белорусских рублей. Срок аренды 99 лет.** Шаг аукциона в размере 10 % от предыдущей цены.
Порядок оплаты	Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона возмещает расходы, связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка и публикацией объявлений об аукционе в средствах массовой информации, с потерями сельскохозяйственного производства. Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 10-ти рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.
Продавец	Мядельский районный исполнительный комитет
Организатор аукциона	Мядельский районный исполнительный комитет
Документы, представляемые для участия в аукционе	Заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка, паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, для юридического лица копия свидетельства о государственной регистрации. Сумма задатка: 10% от начальной цены на р/с 3602623001904 ЦБУ № 619 филиала № 601 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Молодечно, код 769, УНП 600097132
Конечный срок и адрес приема заявок	**18.07.2012 г. до 16.00,** г. Мядель, пл. Ленина, 1, каб. 14, Мядельский районный исполнительный комитет, тел.: (факс) (8 01797) 55 5 73, (8 1797) 55 4 00
Дата, время и место проведения аукциона	**24.07.2012 г. в 14.00** г. Мядель, пл. Ленина, 1, каб. 36, Мядельский районный исполнительный комитет

ХОЗЯЙСТВЕННЫЙ СУД ГОРОДА МИНСКА

ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, принадлежащего на праве собственности СООО «Строительно-инвестиционная компания «Александров-Групп», УНП 800008015.

Лот № 1. Торговое помещение (инв. № 500/D-708017400) площадью 329,7 кв. метров, расположенное по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 117, пом. 30, стоимостью 5 295 664 000 (пять миллиардов двести девяносто пять миллионов шестьсот шестьдесят четыре тысячи) белорусских рублей.

Указанное имущество обременено договорами ипотеки, договорами аренды, договорами субаренды, договором финансового лизинга.

Минимальная величина первого шага составляет 5% от стоимости лота, реализуемого с торгов.

Подробная информация об имуществе размещена на сайте: http://minsk.court.by/,
а также в помещении хозяйственного суда г. Минска:
г. Минск, ул. Академическая, 15/1.

Торги состоятся 20.07.2012 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Академическая, 15/1, каб. 201

За дополнительной информацией обращаться: судебный исполнитель Зюлькова С.И., Сидорок И.В., тел./факс: 294 93 88 (29), 8 029 177 32 43 (61) ст. судебный исполнитель Вярьвильский Д.А., тел. 294 93 67.

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть перечислен на депозитный счет № 3642900000072 в ОАО «АСБ Беларусбанк» Минск, код 795, УНП 101541763 хозяйственного суда города Минска не позднее чем за 24 часа до начала проведения торгов.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

УВЕДОМЛЕНИЕ О ВЫКУПЕ АКЦИЙ

Уважаемые акционеры ОАО «Универмаг «Солигорск»!

14.16.2012 года на внеочередном общем собрании акционеров принято решение о реорганизации ОАО «Универмаг «Солигорск» путем присоединения к нему Коммунального производственно-торгового унитарного предприятия «Солигорский комбинат школьного питания». В соответствии со статьей 78 Закона Республики Беларусь «О хозяйственных обществах» у акционеров, голосовавших против принятия решения о его реорганизации или не участвовавших в общем собрании акционеров, на котором было принято такое решение, возникает право требования выкупа принадлежащих им акций.

Принято решение:

1. Утвердить цену выкупа Обществом акций по требованию акционеров в размере 4400 (четыре тысячи четыреста) рублей.
2. Установить срок для подачи заявлений о выкупе акций по 2 августа 2012 года включительно.
3. Установить срок для выкупа акций Обществом с 3 августа 2012 года по 1 сентября 2012 года включительно. Форма оплаты — денежные средства.

Обращаться в планово-экономический отдел ОАО «Универмаг «Солигорск» в рабочие дни (время работы с 8.00 до 17.00) по адресу: 223710, г. Солигорск, ул. Ленина, 39, тел. (80174) 24 76 86.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
21 06 2012 г.

Выпрабавана на сабе

ПАЛЯВАННЕ НА «СЭКАНД»

Місія: *знайсці танны прыкід на лета.*
Аб'ект: *крамы з «сэканд-хэндам».*
Абавязковая умова: *укласціся ў 200 тысяч.*

Пачну я з высновы, а пасля паспрабую яе даказаць. На рынку другасных рэчаў сёння сапраўды можна знайсці неблагое адзенне. Гэта ўжо зразумелі не толькі дачнікі, якія шукаюць «робу», у якой не шкада корпацца на агародзе, маладыя мамы, якія заўважылі, што ў «сэканд-хэндзе» можна набыць малым майкі і байкі, што выглядаюць значна лепш, чым атрыманыя ў спадчыну ад сваякоў, ці студэнты, якія імкнуцца выжыць на стыпендыю. Сярод наведнікаў «сэканд-хэндаў» я часта бачу дагледжаных, стыльна апранутых жанчын. Усё часцей тут можна сустрэць і прадстаўнікоў моцнага полу.

Цудоўная спаднічка! Толькі даўгаватая...

Для некаторых прыгажунь паляванне на «сэканд» становіцца не тое што хобі — хваробай. З такім азартам асобныя прадстаўніцы слабага полу перасякаюць залы «сэканд-хэндаў», імкнуцца перахапіць тавар з-пад носу канкурэнтак. Ёсць дамы, якія адсочваюць дні, калі ў крамах адбываецца поўная змена тавару. Некаторыя за дзень аб'язджаюць некалькі пунктаў, што гандлююць «еўрапейскай вопраткай». Часта яны завязваюць кантакты з прадавачкамі, дамаўляюцца, каб тыя за пэўную ўзнагароду адкладалі ім рэчы. Прыхільнікі другасных рэчаў рэгіструюцца на пэўных сайтах альбо пакідаюць нумар свайго мабільніка ў краме і рэгулярна атрымліваюць інфармацыю пра ўсе акцыі і распродажы.

Між іншым, пункты продажу другасных рэчаў значна розняцца па асартыменце. Але крамы, у якіх пападаюцца не моцна паношаныя шматкі, — ужо рэдкая з'ява. Малыя памяшканні са звалеными ў вялікія карзіны рэчамі саступаюць месца прасторным плошчам у крамах. Прычым часам у іх пакупкі рабіць зручней, чым там, дзе прадаецца новая вопратка, — рэчы развешаны на кранштэйнах так, што іх можна хутка разглядзець, не «выцягваючы на свет». У вялікіх крамах з таварам для «другіх рук» рэчы спецыяльна рыхтуюцца для продажу. У асобных памяшканнях вядзецца апрацоўка паравымі прасамі. У выніку на кранштэйнах мы ўжо бачым прывабны тавар. А спецыфічны пах — гэта напамін пра бяспечнасць: яшчэ за мяжой рэчы апрацоўваюцца сродкамі дэзынфекцыі.

Розняцца і прыхільнікі «сэканду». Хтосьці палюе на танныя рэчы — напрыклад, у дні распродажу кошт на «сэканд» у некаторых крамах паніжаецца на 20, 40, 60 працэнтаў. У такі час можна дазволіць сабе маленькую слабасць — набыць цэлы мех абновак. Нярэдка можна пабачыць, як да прымерачных шпацыруюць дамачкі, абвешаныя спадніцамі, сукенкамі, майкамі. Чым не шопінг-тэрапія?

А нехта шукае «фірму». Прычым такія пакупнікі выбіраюць з найбольш дарагіх рэчаў, што маюцца ў продажы. Праўда, каб адхапіць «эксклюзіў», патрэбны настойлівасць, вопыт, шанцаванне, чуццё, і, адпаведна, добрая рэакцыя. У дзень поўнай змены тавараў ужо праз хвілін 15 пасля адкрыцця магазіна ля прымерачных — чэргі. Нават дзіву даешся: як за такі кароткі час з кучы шмотак можна паспець выцягнуць менавіта тыя, у якіх не сорамна паказацца на людзях. Між іншым, як заўважаюць прадаўцы буйных крам рэчаў, што былі ў карыстанні, ёсць сэнс завітаць сюды не толькі на новыя завозы — кранштэйны на дзясяткі-сотні рэчаў папаўняюцца штодня (за выключэннем часу распродажу). На ярлычках рэчаў з «сэкандаў» сапраўды часта можна пабачыць брэндавыя назвы: Marks&Spenser, Calvin Klein, Lacoste , FredPerry, Mexx, Moshino, Hugo Boss, Topshop, Jack & Jones, D&G, Atmosphere, Dorothy Perkins, Muchacha. А пра рэчы з лэйбламі Next, George, Cherokee можна было б і не ўзгадваць — яны, напэўна, маюцца ў гардэробе ўсіх аматараў рэчаў з чужога пляча. Ёсць сёння і маладыя моднікі, якія палююць менавіта на пэўныя брэндавыя рэчы. Па словах прыхільнікаў «сэкандаў», тут трапляюцца нават Versace і Armani.

Праўда, часам вызначыць фірму не так ужо проста. На некаторых рэчах ярлычкі зрэзаны. За мяжой кампаніі, якія здаюць непрададзены ў сезон тавар як другасны, плацяць прыёмшчыкам за «знішчэнне» фірмовых метак. Калі пашанцуе, ёсць магчымасць перахапіць у такіх крамах рэчы з этыкеткамі. Але як правіла, усё гэта выдаляецца.

Тыя, хто пастаянна пасвіцца ў «сэкандах», запэўніваюць, што часам яны апераджаюць моду. Як правіла, хваля еўрапейскай моды да нас прыходзіць са спазненнем, і перш чым модная вопратка з'явіцца ў магазінах і на кірмашах, падобныя рэчы ўжо могуць быць спісаныя іх замежнымі гаспадарамі і дайсці да «другіх рук».

Дарэчы, за «сэкандам» палююць не толькі модныя і эканомныя людзі, а таксама прадпрымальныя. Добрыя рэчы скупляюцца гандлярамі, якія пасля «заганяюць» іх на кірмашах па больш высокім кошце, выдаючы за новыя.

У дзень поўнай змены тавараў ужо праз хвілін 15 пасля адкрыцця магазіна ля прымерачных — чэргі. Нават дзіву даешся: як за такі кароткі час з кучы шмотак можна паспець выцягнуць менавіта тыя, у якіх не сорамна паказацца на людзях.

Уласнае паляванне на «сэканд» я распачала з гандлёвага рынку «Ждановічы». Безумоўна, тут самы вялікі выбар патрыманых рэчаў, і самыя вялікія «разбежкі» ў коштах на іх. Маладыя хлопцы зазываюць да сталоў, дзе ўсе шмоткі звалены ў кучы. На сталах з «абсалютна новымі» рэчамі, можна выбраць любую па кошце 50 ці 100 тысяч, патрыманае мужчынскае і жаночае адзенне прадаецца за 30 тысяч, на асобным стале — шапкі, кепкі — за 20, купальнікі — за 40, дзіцячыя рэчы — за 20, 30 тысяч. Калі пабадзяцца сярод гэтых развалаў, можна выйсці і на прадаўцоў, якія гандлююць таварам па 10 (а то і па 5 тысяч) за любую рэч. Пасля пачутага чарговага прызыву далучыцца да распродажу, ды яшчэ (як запэўніваў «зазывала») выбраць «рэчы, якія носяць алігархі», далучаюся да капальнікаў у шмотках. Побач са мной вядуць «раскопкі» муж з жонкай. У іх ужо ёсць такія-сякія здабыткі, хаця мужчына жаліцца, што ў яго ўжо рукі баляць «капаць». Патраціўшы пэўны час на падобную справу, адыходжу ні з чым. Больш за тое, падалося, што корпалася ледзьве не ў сметніцы — сярод усяго гэтага «багацця» трапляліся і рэчы брудныя, і забароненыя для продажу. Між іншым, продаж «з кучы» — адзін з прыёмаў зацягвання кліента. Чалавеку, які столькі часу патраціў на пошук, проста крыўдна будзе пайсці без пакупак.

Ярка, крэатыўна і, галоўнае, нядорага.

У развалах з дзіцячай вопраткай пакапацца, напэўна, усё ж варта — мае «калегі» набіраюць стосы маек, шортаў і штонікаў на гадавалага малога. Дзіцячы тавар трапляе на прылаўкі ў больш прывабным стане. Проста еўрапейская дзятва, як і любая іншая, вырастае так хутка, што не паспявае «забіць» сваё адзенне.

Калі не хапае вытрымкі на «раскопкі», можна збочыць да сталоў і палатак, дзе прадаецца ўжо адсартаваны «сэканд». Але вы адразу адчуеце розніцу ў коштах. Дарэчы, я бачыла, як самі прадаўшчыцы «дапамагалі» асобным рэчам з развалаў перакачваць у «адборны» сэканд.

Між іншым, адсартаваны ждановіцкі «сэканд-хэнд» па кошце можа быць вышэйшым за той, што прадаецца ў крамах, дзе ўсё гэта акуратна развешана па кранштэйнах. Для параўнання, на «Жданах» жаночыя блузкі, майкі, сарочкі ідуць па 75-95 (і вышэй) тысяч, а ў краме на цэнніках я бачыла лічбы ад 28 да 115 тысяч (пры гэтым найбольш часты кошт — у межах 50-60 тысяч, за такія грошы можна набыць сапраўды добрую рэч). Шорты, брыджы, што пабывалі ў карыстанні, на Ждановічах каштуюць адпаведна каля 65 і 95 тысяч, а ў краме грашовы адлік пачынаецца з 20 (за паўсотні рэальна набыць незаношаную рэч). На кранштэйнах «сэкандаў» я бачыла сукенкі за 15-165 тысяч, штаны і джынсы за 50-160. Для параўнання, ждановіцкія штаны прадаюцца ад 120.

Ёсць разбежкі і ў цэнах на дзіцячае адзенне, прычым зноў жа не на карысць сартаванаму «сэканду» Ждановіч, дзе мне прапаноўвалі майкі на дашкольнікаў за 40-75, джынсы, брыджы за 100-180, шорты, спадніцы за 45-65 тысяч (у краме першае можна набыць за 15-40 тысяч, другое каштуе ад 40, трэцяе — ад 20).

Ёсць яшчэ крамы, у якіх «сэканд» прадаецца на вагу. Калі на выхадных я завітала ў адну з такіх, кошт за кілаграм быў 179.900, прычым магазін толькі папоўніўся новым таварам. Чым далей ад завозу, тым менш каштуе кіло. Напэўна, набываць рэчы для дарослых на вагу не так ужо выгадна. Выйграць можна хіба на майках, топах і спадніцах, якіх на кілаграм прыпадае некалькі.

Пасля доўгага бадзяння па «сэкандах» мне ўсё ж удалося сёе-тое для сябе прыгледзець.

Мае трафеі: спадніца фірмы «Dorothy Perkins» (абышлася ў 50 тысяч), як варыянт спадніца Atmosphere (68 тысяч). Каб дабраць да камплекта і ўкласціся ў 200 тысяч, спыняюся на майцы Next (52) ці сарочцы за 76 тысяч. Мне падалося, што было б нядрэнна, каб пры такіх крамах працавалі спецыялісты, якія дапамагалі б пакупнікам знаходзіць «сваю» вопратку. Зарыентавацца ў моры карыстаных рэчаў не так проста. Асабіста мне сапраўды не хапала спрыту, часам я ацэньвала рэч, толькі калі бачыла яе ў руках маіх суседак у чарзе да касы.

Калі знайсці рэчы «пад сябе» ўдалося не так хутка, то дзіцячыя «трафеі» аказаліся больш удалымі. Прычым сукенкі, спадніцы, байкі і джынсоўкі на малых тут можна знайсці сапраўды больш цікавыя, чым у крамах і на кірмашах з новымі рэчамі.

Палявала Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.
Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Hawwwiны :)

КАЖЫ ДОБРА, АБО МАЎЧЫ

Айчынны шоу, прабачце, бізнэс у чаканні «Славянскага базара» нібыта ўпаў у спячку. На гэтым «бязрыбным» зацішшы, зрэшты, здараюцца ўсплёскі актыўнасці асобных персанажаў з катэгорыі «Хто гэтыя людзі?». З адным такім персанажам надоечы завочна пасварыўся вядомы музычны крытык, стваральнік сайта experty.by Зміцер Безкаравайны.

Рызыкоўна параўнаўшы ў сацыяльных сетках дэбютны альбом маладога гурта Green Pepper з адыходамі жыццядзейнасці чалавека, крытык нарваўся на жорсткі адлуп ад менеджара — і па сумяшчальніцтве бацькі вакаліста гурта. І хоць канфлікт адбыўся віртуальны, але пагрозы і абразы ў допісе ў адказ цягнуць на цалкам рэальную судовую справу. Але яна, хутчэй за ўсё, не адбудзецца: усё ж гаворка не пра Кіркорава і ружовую кофтачку. Дый, як яхідна заўважаюць у калямузычных колах, піяр, нават з душком — усё адно піяр... Можа, хоць цяпер шырокая грамадскасць даведаецца, хто такія гэтыя «Зялёныя перцы» і чаму да іх трэба ставіцца з асаблівым піетэтам?

Ахвотныя да падрабязнасцяў — зазірайце ў сеціва.

ФУТБОЛ ЯК РУХАВІК РЭГРЭСУ

Ёсць рэчы, якія падзяляюць усякую супольнасць на два лагеры: адным безумоўна падабаецца, другім катэгарычна не. Так, пакуль заўзятары ці не з усіх краін свету не зводзяць вачэй з экранаў тэлевізараў і камп'ютараў, адсочваючы навіны Еўра-2012, ахоўнікі правапарадку спяць і бачаць, каб найхутчэй скончыўся гэты галаўны боль... Але хто б ведаў, што з крытыкай футбола — дакладней, футбольных фанатаў — выступіць царква!

Найсвяцейшы патрыярх Кіеўскі і ўсяе Русі-Украіны Філарэт выказаўся даслоўна так: «Царква не бласлаўляе ажыятаж і псіхоз, у які ўпадае чалавек, калі глядзіць гэтыя матчы. Вы паглядзіце на гэтых людзей. Гэта ўжо не людзі, яны тады больш да малпаў падобныя, чым да людзей, бо яны выходзяць з раўнавагі. Гэта грахоўны стан, калі чалавек не валодае сабой».

Між тым, прадстаўнікі іншых канфесій не далучаюць азартны прагляд футбольных матчаў да спісу грахоў. Больш за тое, у 2010 годзе каталіцкая царква ў ПАР, а ў 2002-м — паўднёвакарэйскія будысты рыхтавалі адмысловую малітву з бласлаўленнем футбольнага форуму. Можа, прычына ў тым, што, як прызнаўся сам Кіеўскі патрыярх, ён нават у дзяцінстве ў футбол не гуляў?

«УСАВІЛІ»

Падкормліваць кацянят ці шчанюкоў — з'ява звычайная. А вось супрацоўнікам Віцебскай ДАІ дасталіся больш рэдкія падапечныя — проста пад вокнамі начальніка ўстановы пасялілася савіная сям'я.

Праўда, хто з іх каго ўзяў пад крыло, так адразу і не скажаш. З аднаго боку, міліцыянеры прыглядваюць, каб крылатых суседзяў ніхто не пакрыўдзіў, а савяня, якое выпала з гнязда, тэрмінова даставілі назад. З другога ж, совы, як начныя актывісты, — выдатная (і бясплатная) жывая сігналізацыя. Праўда, не вечная: рана ці позна падрослыя птушаняты пакінуць гняздо. Абмяжоўваць ім свабоду перамяшчэння ніхто не збіраецца, але дактыласкапію — у сэнсе, кальцаванне — адмыслова запрошаныя арнітолагі на ўсякі выпадак правялі. Усё ж практычна ўсе віды соў у Беларусі — «чырвонакніжнікі», а значыць, як бы пафасна гэта ні гучала, іх трэба берагчы.

Дзяжурыла па сеціве Вікторыя ЗАХАРАВА.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»; грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказны за выпуск — намеснік галоўнага рэдактара Анатоль СЛАНЕЎСКІ.
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактны тэлефон: 292-44-12.
e-mail: posts@tut.by; info@zvyazda.minsk.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 30.015.
Нумар падпісаны ў 19.30 20.06.2012 г.

Крынічка
«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.
Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ, тэл. 287 18 27.
№ 15 (437)

НАРОДНЫЯ ПРЫКМЕТЫ

❍ На пагоду рогі маладога месяца яркія і прыўзнятыя ўверх. Такі «серп» у народзе завуць «коўш не пралі вады».

❍ Пакаты малады месяц з апушчанымі ўніз рагамі завуць «коўш пралі ваду» — да дажджоў на некалькі дзён.

ПРАФІЛАКТЫКА ЗАХВОРВАННЯЎ ТРУСКАЛАК

Сярод усіх ягадных культур самай працаёмкай па барацьбе са шкоднікамі і захворваннямі з'яўляецца трускалка. Збіраць саспелыя ягады трэба штодня, у крайнім выпадку — праз дзень, не дакранацца рукамі, а браць за пладаножку.

Трускалкі вельмі далікатныя і доўга захоўвацца не могуць. Ужо праз 6—8 гадзін захоўвання пры пакаёвай тэмпературы іх знешні выгляд пагаршаецца. У халадзільніку яны захоўваюцца не больш чым двое сутак.

У перыяд збору ўраджаю паліў трускалак трэба скарачаць да мінімуму, каб аптымізаваць смак ягад і прадухіліць захворванне **шэрай гніллю**, якая можа знішчыць больш за палову ўраджаю. Асноўныя прычыны хваробы — загушчаныя пасадкі, лішак вільгаці і азотных угнаенняў. Хвароба заражае бутоны, кветкі, завязі і асабліва ягады. На пашкоджаных частках узнікаюць барвовыя плямы, пасля гэтага іх паверхня пакрываецца шэрым пушыстым налётам.

Меры барацьбы з шэрай гніллю, галоўным чынам, прафілактычныя, эфектыўных хімічных мер, на жаль, няма. Пад плантацыю трускалак трэба адводзіць сонечныя ўчасткі, якія добра праветрываюцца, не дапушчаць загушчаных пасадак, устрымлівацца ад унясення вялікіх доз азотных угнаенняў, у вільготныя гады падвязваць расліны да працягнутага ўздоўж радоў шпагату або дроту, на пачатку росту завязі мульчыраваць глебу саломай, пілавіннем і г. д., папярэдне пасыпаўшы попелам (па 1 шклянцы на 1 кв. м). Пашкоджаныя шэрай гніллю ягады збіраюць у асобны посуд і знішчаюць. Саджаюць гатункі, адносна ўстойлівыя да шэрай гнілі.

Калі на лістах трускалак з'явіліся масіўныя адтуліны, а ягады выедзеныя — значыць, на градках пасяліліся **смаўжы**. Яны сілкуюцца па начах, а днём хаваюцца пад мокрыя дошкі, анучы, лісце лапухоў і г. д. У перыяд збору ўраджаю такія хованкі-пасткі трэба адмыслова раскладваць вакол трускалкі. Раніцай вы заўсёды знойдзеце няпрошаных гасцей.

Вельмі карысна, пачынаючы з чэрвеня, глебу вакол кустоў бесперапынна апыльваць попелам. Пры вялікім распаўсюджванні смаўжоў міжраддзі з вечара трэба двухразова апыліць вапнай-пушанкай або тоўчаным суперфасфатам (10 — 30 г на 1 кв. м), парашком гарчыцы або жалезным купарвасам, змяшаным з дробным пяском.

З выпадковым пасадкавым матэрыялам на ўчастак можна занесці трускалкавую **нематоду**. Гэта ніткападобны чарвяк мікраскапічных памераў. Заражаныя ёю расліны становяцца нізкарослымі, з патоўшчанымі кветканосамі, выродлівымі суквеццямі, зморшчаным лісцем на тоўстых хвосціках. Пласцінкі і хвосцікі атрымліваюць чырванаваты колер. У перыяд цвіцення трускалкі такія кусты трэба выбракоўваць і неадкладна знішчаць.

Сунічны клешч. Даўжыня цела самак 0,2 мм, самца — у 1,5 раза меншае. Кляшчы і іх лічынкі высмоктваюць сок з маладых лісточкаў, пасля чаго апошнія зморшчваюцца, набываюць жаўтлява-буры колер і звычайна засыхаюць. Кусцікі, пашкоджаныя кляшчамі, становяцца карлікавымі, дрэнна пладаносяць, а ўзімку вымярзаюць. Колькасць кляшчоў дасягае максімуму ў жніўні. Меры барацьбы — адразу пасля збору ягад трэба скасіць лісце і вынесці яго з участка.

Павуцінны клешч. Пашкоджанне часцей развіваецца ў гады з сухім гарачым летам. Кляшчы пасяляюцца на старых лістах, якія набываюць бронзавае адценне, бурэе. На ніжнім боку лісця відаць дробныя бураватыя кропкі, а ў месцах збірання кляшчоў з'яўляецца павуцінне. Сталыя асобіны зімуюць пад сухім лісцем і раслінными рэшткамі. Меры барацьбы — уборка апалага лісця і раслінных рэшткаў. На зіму міжраддзі перакопваюць.

Так (на гідрапоніцы) вырошчваюць трускалкі ў Ізраілі.

БУРАЧНЫЯ САКРЭТЫ

❍ Павялічыць цукрыстасць бурака можа звычайная кухонная соль. Паспрабуйце падкормку, складзеную па такім рэцэпце: чайная лыжка солі на вядро вады (норма на 1 кв.м). Падкормка праводзіцца ў тры этапы. Спачатку — калі вырастуць шэсць лісточкаў. Потым — калі вылезе сам караняплод на 10 см, а праз два тыдні — у апошні раз. Для гэтага бярэцца звычайная кухонная (але не ёдаваная) соль. Пры такой падкорцы ёсць адзін нюанс. Перш чым пачаць яе, буракі неабходна паліць, замульчыраваць і прарыхліць.

❍ Прарэджваць буракі лепш у вячэрні час пасля дажджу ці паліву: з вільготнай глебы расліна лёгка выдаляецца, а тыя, што засталіся на градцы, змогуць за ноч адужэць.

❍ Расліны бурака, якія неабходна выдаліць пры прарэджванні, можна не вырываць, а ўсяго толькі прышчыпнуць на ўзроўні глебы, пры гэтым у раслін, якія застаюцца, каранёвая сістэма не пашкодзіцца.

❍ Не адрывайце ў раслін бурака асобныя лісточкі падчас яе росту і імкніцеся не пашкоджваць іх, асабліва калі жадаеце атрымаць добрыя караняплоды. Расліны хваравіта пераносяць такія траўмы, і абламаны ці адарваны ліст вядзе да сур'ёзнай страты ўраджаю.

❍ Калі караняплоды бурака моцна выходзяць з зямлі, іх трэба акучыць.

❍ Бурак добра рэагуе на асвяжальныя паліванні, калі невялікай колькасцю вады арашаецца лісце. Таму, калі ёсць магчымасць, бурачныя градкі трэба паліваць метадам дажджавання.

МАЛЕНЬКІЯ ХІТРЫКІ

❍ Прасушыць склеп ад вясновай волкасці хутка і проста можна пры дапамозе міні-вентылятара, усталяванага на вентыляцыйную трубу, якая ўсмоктвае.

❍ Драўляныя і металічныя слупы для садова-дачных агароджаў, шпалер і іншага даўжэй захоўваюцца, калі надзець на верх слупа вялікую пластыкавую бутэльку са зрэзаным горлам і акунуць у вядро з кіпенем. Пластык, размякчыўшыся, створыць надзейны герметычны каўпак.

ПРЫРОДНЫ ГАДЗІННІК

❍ У тры-чатыры раніцы спяваюць першыя пеўні.

❍ Да чатырох гадзін раскрываюцца цыкорый і шыпшына, да пяці — мак.

❍ У шэсць раніцы раскідваюць пялёсткі дзьмухавец, палявы гваздзік, у сем гадзін — белы гарлачык, званочкі і агародная бульба, да васьмі — аксаміткі і бярозка, да 9—10 — наготкі, падбел, а ўвечары, да 21 гадзіны, — светнік і начная фіялка.

❍ З'явіліся першыя вераб'і і падалі свой голас — шэсць гадзін раніцы.

❍ Палявы асот закрыў пялёсткі — наступіў поўдзень.

❍ Бульба і дзьмухавец закрываюць пялёсткі каля дзвюх гадзін дня.

❍ Да трох гадзін — мак, да чатырох — наготкі.

❍ У пяць вечара закрываюцца падбел і ястрабінка парасонавая.

❍ У шэсць гадзін белы гарлачык стуліць сваё венца і сыдзе пад ваду.

❍ У сем вечара засынае казялец, у восем — шыпшына.

ПАРАДЫ БЫВАЛЫХ

❍ Робячы бетонную адмостку вакол дачнага дома, не забудзьцеся зрабіць тэмпературныя швы шырынёй 0,5-1 см праз кожныя 0,5-0,6 метра. Каб зрабіць швы, закладзіце ў бетон драўляную рэйку, апрацаваную адпрацаваным машынным маслам. Тады цэментна-бетонная сумесь не будзе рэпацца з-за сезонных змен тэмпературы.

❍ Садоўнікам для таго каб рабіць замеры пры працы ў садзе, вельмі карысна наступнае простае ўдасканаленне рыдлёўкі — нанясіце на ручку каляровыя кольцы на адлегласці 10 см адно ад другога.

НЕ ГУБЛЯЦЬ ПІЛЬНАСЦЬ!

«Безадказныя адносіны да важнейшай справы», «Жулікі ў саўгасе «Слабада», «Вораг яшчэ не выкарчаван», «Недапушчальная самасупакоенасць», «Абаронцы ворагаў з Белдзяржспірта», «Выкараніць ашуканства і бескантрольнасць», «Не выкрываюць шкоднікаў», «Да канца выкрыць шкодніцтва ў МТС», «Гняздо жулікаў і аферыстаў», «Плады бесклапотнасці Кіраўскага райкома», «Двурушніцтва і шкодніцтва», «Варожая рука ў Насентрэсце», «Да канца выкрыць і выкарчаваць польскіх шпіёнаў і шкоднікаў», «Аб некаторых метадах дыверсійна-шпіёнскай работы замежных разведак і іх трацкісцка-бухарынскай агентуры» — гэта загалоўкі, змешчаныя ў «Звяздзе» 1937 года, усяго толькі на працягу аднаго месяца — ліпеня. Прычым я выпісала яшчэ далёка не ўсе. Я спецыяльна пачала з гэтага сумнага пераліку назваў тэксту. Ужо толькі па іх можна здагадацца пра тэматыку газет у гэты час.

«Звязда» заўсёды вызначалася тым, што спрабавала змагацца з недахопамі. Яшчэ ў 20-ых гадах яе аўтары (штатныя і асабліва пазаштатныя) распавядалі пра безгаспадарчасць, няўважлівае, а то і грубае стаўленне кіраўніцтва да працоўнага калектыву, пра нядобрасумленных работнікаў і г.д. Але ў 1937 г. крытыка дапаўняецца, а то і падмяняецца абвінавачваннямі. «Шкоднікі», «аферысты», «подлыя банды агентаў» «прытаіліся» ці не ў кожнай установе. Такі быў час...

ВОРАГ ЗА КОЖНЫМ КУСТОМ?

Побач з ворагамі, шпіёнамі і агентамі не менш «папулярнае» ў гэты час слова «бесклапотныя». Такая характарыстыка давалася тым, хто «губляў пільнасць» і не высочваў тых самых «ворагаў».

«Кіраўнікі кіраўніцтва лесааховы і лесанасаджэнняў хварэюць ідыёцкай хваробай — бясклапотнасцю. Яны рашылі вывучаць людзей па анкетах. У раёны былі пасланы тэрміновыя патрабаванні аб прысылцы запоўненых спісаў на леснікоў і аб'езчыкаў.

...Сапраўдным вывучэннем па гэтых спісах у кіраўніцтве не займаюцца, бо інакш адразу б заўважылі пікантную дэталь, якая вызначае каштоўнасць гэтых анкет... Калі верыць гэтым характарыстыкам, то амаль усе ляснікі і аб'езчыкі дасканалейшыя, сумленнейшыя работнікі без усялякіх заган.

Карыстаючыся бясклапотнасцю работнікаў кіраўніцтва аховы лясоў, класавы вораг праводзіць сваю варожую работу на разбурэнне лясной гаспадаркі...» — напісана ў артыкуле «Караеды» ў лясной гаспадарцы».

Далей высвятляецца, што ворагі «разбазарваюць лес налева і направа», п'юць і слухаюць няправільную музыку: *«Полацкі райком саюза лесу і сплаву... паслаў у лесгас для культурнага правядзення часу патэфон, які быў перададзены ў старыжоўскую дачу леснічу Пестунову. Апошні скарыстаў патэфон для сваіх варожых мэт. Ён дастаў 50 старых пласцінак, частка з іх контррэвалюцыйнага зместу, і збіраў у лесе народ, каб слухалі».*

Умець убачыць ворага там, дзе яго не бачаць іншыя — таксама ці не здольнасць тагачасных аўтараў?

«У апошні час у кіраўніцтва лесааховы і лесанасаджэння паступае паток заяў на атрыманне работы ў яго сістэме... Прычым некаторыя ўказваюць нават раёны і чамусьці пагранічныя. Кіраўніцтва не знайшло нават патрэбным задумацца над гэтым немалаважным пытаннем. Зусім зразумела, што шкоднікі і дыверсанты цягнуцца туды, дзе зручней праводзіць свае гнусныя справы..

Пажары, якія маюць месца ў лесе. Хіба гэта не работа класавага ворага?»

АБАРОНА МАЛАДЫХ КАДРАЎ

У артыкуле «Мсціслаўскія сляпцы» таксама віна перакладаецца на ўяўнага ворага. А як жа:

«Мсціслаўль — месца, дзе пачыналі «працаваць» і напэўна да апошняга часу працавалі ворагі народу.

Партыйная арганізацыя Мсціслаўля не зрабіла з гэтага сур'ёзных палітычных вывадаў, навучальнымі ўстановамі не займалася. Яскравым сведчаннем гэтага з'яўляецца справа інстытута глуханямых. Гэты інстытут мае вялікі выкладчыцкі калектыў і некалькі сот выхаванцаў. Не гледзячы на гэта, інстытут нічога навуковага не даў для рэспублікі... Тут на ўчастку даследчай складанай работы і работы па выхаванню, несумненна прыклаў сваю руку вораг.

У інстытуце працвітаюць зазнайства, групоўшчына і сямейная парука, несавецкія метады выхавання і антысавецкія адносіны да маладых кадраў.

На працягу апошніх трох год з інстытута сістэматычна выжываюць, часамі груба, нахабна, маладыя, адданыя партыі кадры».

ТЭХНІЧНЫЯ НЕПАЛАДКІ — НЕ ВЫПАДКОВЫЯ

Даставалася ад звяздоўцаў і калегам-журналістам. Так, у матэрыяле «За большэвіцкую якасць радыёвяшчання», яны папярэджвалі, што *«Далёка не рэдкі выпадкі выключэння актуальных перадач па так званых «тэхнічных» прычынах, за якімі хаваецца наглая морда ворага».*

«... Найярчэйшым пацвярджэннем таго, да якіх сумных вынікаў прыводзіць бескантрольнасць радыёвяшчання і палітычная бесклапотнасць на гэтым участку, могуць служыць справы Радыёкамітэта БССР. На працягу раду год на вачах СНК БССР (чыім органам з'яўляецца Радыёкамітэт) пры падтрыманні ворагаў народу, якія пралезлі ў партыйны аппарат, у Радыёкамітэце БССР арудавалі трацкісты, нацдэмы розных колераў і іншая контррэвалюцыйная нечысць. Верхаводы гэтай гнуснай зграі былі выкрыты і абясшкоджаны, але карэнні іх падрыўнай дзейнасці да канца яшчэ не вырваны...

Трацкісцкае і нацдэмаўскае ахвосце ўжо пры новым кіраўніцтве, неаднаразова і не без поспеху, прабавала выкарыстаць радыёвяшчанне ў сваіх контррэволюцыйных мэтах. Рукамі ворагаў у радзе раёнаў БССР была сарвана трансляцыя па радыё гістарычнага даклада таварыша Сталіна аб праекце Канстытуцыі СССР... Не менш абураючы факт перадачы менскай радыёстанцыяй, пад выглядам канцэрта, жалобнай музыкі следам за абвінаваўчым заключэннем па справе трацкісцка-зіноўеўскай банды. Засмечанасць аппарата Радыёкамітэта варожымі, чужымі і выпадковымі элементамі, расхлябанасць і безадказнасць аппарата адбіваецца на якасці вяшчання. Праграмы перадач у большасці выпадкаў складаюцца наспех або парушаюцца самімі ж складальнікамі іх. Такая ж важная перадача, як «Апошнія паведамленні», нярэдка дубліруе газеты. Дыктары чытаюць матэрыял некультурна, скажаюць мову. Нізкая ідэйная і мастацкая якасць вяшчання асабліва рэзка адчуваецца ў дзіцячых перадачах і ў перадачах на яўрэйскай і польскай мовах...»

НЕБЯСПЕЧНЫ ХЛЕБ

24 ліпеня «Звязда» пісала пра тое, што ў некаторых гарадах рэспублікі, пачынаючы з восені 1936-га, сталі ўтварацца чэргі па хлеб. У асобных гарадах і раённых цэнтрах каля хлебных магазінаў ледзь не з ночы выстройваліся чэргі ў сто і больш чалавек. Але праблема пачала вырашацца пасля таго, як былі выкрыты вінаватыя — зноў жа, «ворагі народу».

Але хлебныя праблемы толькі чэргамі не абмяжоўваліся:

«Ворагі народу часта падкідвалі і падмешвалі ў муку і цеста розныя пабочныя прадметы. На менскім хлебзаводзе... варожая рука часта падкідвала вострыя кавалкі жалеза ў цеста. У другой менскай пякарні некалькі месяцаў таму ў цесце былі знойдзены кавалкі шкла ад электрычнай лямпы... падкінуты былі кавалкі ад старых іржавых гаек. На мозырскім хлебзаводзе подлая банда запякла ў хлебе вострыя цвікі...».

ДЭФІЦЫТ НАСТАЎНІКАЎ

Напярэдадні новага навучальнага года «Звязда» ўскрывала такую праблему, як недахоп настаўнікаў:

«...Былое шкодніцкае кіраўніцтва Наркомасветы БССР... нямала папрацавала над тым, каб стварыць востры недахоп кадраў настаўнікаў, асабліва для сярэдніх школ і ў першую чаргу па лініі выкладчыкаў мовы і літаратуры...»

Але ў наступных абзацах хіба мы не бачым прычыну такога дэфіцыту:

«Выхаванне нашых дзяцей можа быць даручана толькі праверaным настаўнікам, да канца адданым справе Леніна—Сталіна. Сістэматычна ачышчаючы рады настаўніцтва ад чуждых і выпадковых людзей, неабходна забяспечыць правільнае скарыстанне ўсіх чэсных настаўнікаў па сваёй спецыяльнасці».

У той час не хапала і падручнікаў:

«Трэба прама сказаць, што такой бясклапотнасці, якая пануе ў гэтай справе, цяжка яшчэ знайсці. З 18 падручнікаў для пачатковай школы выдана 12, а з 59 падручнікаў для сярэдняй школы — толькі 8! У пошуках віноўнікаў гэтага ганебнага становішча з выпускам падручнікаў, Дзяржаўнае выдавецтва БССР спасылаецца на Наркомасветы БССР, а апошні — на рэдактараў і аўтараў і іншыя прычыны. Паміж арганізацыямі, якія павінны займацца выданнем падручнікаў, ідзе ажыўленая папяровая перастрэлка, а на паліцах магазінаў пакуль што падручнікаў зусім мала...

План выпуску вучнёўскіх сшыткаў за першае паўгоддзе 1937 года выканан на 90 проц., прычым якасць сшыткаў (іх выпускае «Палесдрук») па-ранейшаму нізкая».

НЕБЕЛАРУСКАЕ КІНО

Яшчэ адно пытанне, якое ўзнімае «Звязда», — адсутнасць сапраўды беларускіх фільмаў.

«...ворагі народу, якія арудавалі на фронце беларускага совецкага мастацтва, прынеслі значную шкоду кінематаграфіі. З 40 з лішнім мастацкіх карцін, пастаўленых Белдзяржкіно за час яго існавання, толькі тры ў некаторай ступені можна аднесці да ліку ўдалых карцін, якія правільна паказваюць мінулае або сучаснае БССР.

Пад шыльдай «беларуская» існавала кіностудыя, якая мала чым адрозніваласа па тэматыцы сваіх карцін ад іншых кіностудый Совецкага Саюза».

Уласна, тлумачэнні гэтай з'явы можна ўбачыць, так бы мовіць, паміж радкоў:

«...Калі ж здаралася ставіць карціны, маючыя якія-небудзь адносіны да Беларусі, то тут былі характэрны нацдэмаўскія і бундаўскія скажэнні.

У спісках пастаўленых карцін і сцэнарных заказаў можна знайсці імёны ярых ворагаў, як Вольны. На пастаноўку халтурных і палітычна-шкодных сцэнарыяў якіх Белдзяржкіно затраціла не адзін мільён рублёў. У свой час у Белдзяржкіно прыкармліваліся на сцэнарнай рабоце нацыянал-фашысты Зарэцкі, Жылуновіч, Чарот, Дудар».

Аб праблемах нацыянальнай кінематаграфіі сведчаць і такія радкі:

«...Вялікадзяржаўны шавінізм асабліва наглым быў у пытанні падрыхтоўкі нацыянальных творчых кадраў.

У выніку гэтага на сённешні дзень Белдзяржкіно не мае ні аднаго падрыхтаванага беларускага рэжысёра, аператара або сцэнарыста...

Ранейшае кіраўніцтва Белдзяржкіно часта любіла тлумачыць сваё палітычнае банкруцтва адрывам кіностудыі ад БССР... Некалькі раз падымалася пытанне аб пабудове кіностудыі у Менску, але не было ніякага практычнага вырашэння яго. Трэба сказаць, што зрываў пабудову кінофабрыкі ў Менску ў першую чаргу былы старшыня СНК БССР Галадзед.

На тэхнічную рэканструкцыю нацыянальных кіностудый саюзны ўрад з кожным годам асігноўваў буйныя сумы. А Галадзед штогод падкідаў на капітальнае абсталяванне беларускай кіностудыі мізэрныя, смехатворныя падачкі.

Тэхнічная база беларускай кіностудыі год ад году драхлела, зношвалася і даведзена да катастрафічнага становішча».

«ЗВЯЗДА» ПРАДБАЧЫЛА ВАЙНУ

1 жніўня ў «Звяздзе» выходзіць цэлая паласа пад агульнай шапкай «Фашызм рыхтуе вайну. Шпіёны, шкоднікі, дыверсанты — перадавы атрад падрыхтоўкі вайны. Працоўныя БССР! Бязлітасна выкарчоўвайце германа-японскіх і польскіх шпіёнаў!»

У адным з тэкстаў пад загалоўкам «Фашызм — гэта вайна» гаворыцца:

«Падпальшчыкі вайны ўжо даўно агаласілі свае «права» на захоп чужых тэрыторый...

Германскі фашызм агаласіў праграму захопу совецкіх тэрыторый, адрывання Украіны. Ён адкрыта прапаведуе праграму германскай гегемоніі ў Еўропе...» Так, «Звязда» прадбачыла вайну, але ў адным з прадказанняў яна памылілася:

«... гора таму, хто папрабуе ажыццявіць свае шалёныя планы нападу на Совецкі Саюз. Чырвоная армія, якая ўзброена навейшай тэхнікай і ўладае выдатнымі кадрамі адданых сыноў соцыялістычнай радзімы, здолее адказаць не толькі хуткім, сакрушаючым пераможным ударам. Але, як заявіў народны камісар абароны першы маршал Совецкага Саюза тав. Варашылаў, — будзе біць ворага на той тэрыторыі, адкуль ён прышоў». Удар быў пераможным, але зусім-зусім не хуткім...

СЁННЯ ТАКІХ ДЗЯЦЕЙ НЕ ЗНОЙДЗЕШ

Не ведаю, як каго, асабіста мяне раздражняюць выразы пра тое, што «дзеці і моладзь — наша будучыня», за якімі, як правіла, ідзе выснова, што ўсе абавязаны пра іх клапаціцца і што амаль ці не ўсе ім вінны. Дзятва 30-х не сядзела і не чакала, пакуль іх забяспечаць усім неабходным, а самастойна спрабавала змагацца з праблемамі, ствараць тое, што ёй падабаецца. Пра гэта можна пачытаць у «Звяздзе»:

«У запушчаным і брудным двары дома № 62-64 (Менск, Совецкая вуліца) кіпела дружная і крапатлівая работа па арганізацыі піонерскага фарпоста. Вучань 8 класа Хіля Вінер пры дапамозе Хоні Генкіна ўзяў на сябе ўсе сталярныя і малярныя работы. Неўзабаве пад лесніцай была абсталявана бібліятэка. Загадчыца гэтай своеасаблівай бібліятэкі Ліза Гранат разам са сваімі шматлікімі сяброўкамі сабрала сярод дзяцей больш 70 кніжак. Адразу ж з'явіліся і чытачы.

Потым на двары была пабудавана трыбуна і мачта для пад'ёму сцяга... Заўзятыя плотнікі пабудавалі яшчэ два сталы і скамейкі да іх. Запушчаны і брудны двор набыў прыемны выгляд...

Настаў урачысты дзень адкрыцця фарпоста. Дзеці загадзя апавясцілі аб такім урачыстым дні Сталінскі гарком камсамола і рэдакцыю газеты «Піонер Беларусі»... На двор сабраліся шумлівыя і надзвычай непаседлівыя гаспадары двара. У тэрміновым парадку былі арганізаваны стуллі...

Ішлі гадзіны... З райкома камсамола дзяцей не з'яўляліся — гэта тыя дзядзі, якія не адзін раз робяць прыгожыя прамовы аб арганізацыі карыснага і цікавага адпачынку дзяцей...

Прыйшлося без іх удзелу пачынаць урачыстасць... Пачалася багатая і разнастайная праграма самадзейнасці. Жадаючых выступаць аказалася надзвычай многа... дэкламацыя змянялася пляскамі, пляскі фізкультурнымі выступленнямі...

Калі на двор спусціліся змрокі, сцяг быў апушчан. І дзеці арганізавана разышліся спаць. Раніцой сцяг будзе зноў падняты, дзеці правядуць фізкультурную зарадку. На двары закіпіць дружная дзіцячая самадзейнасць.

Такі двор, дзе дзеці самі імкнуцца цікава і карысна арганізаваць свой адпачынак — не адзіны ў Менску...»

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Утерянные представительством Белгосстраха по Центральному району г. Минска бланк квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1СУ серии КВ № 1766537 и страховой полис по добровольному страхованию наземных транспортных средств формы 2РНП серии ТС № 0199150 считать недействительными. УНП 101883943.

У **суд Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці** паступіла заява УКПП «Касцюковіцкі жылкамунгас» аб аб'яўленні без вестак адсутным грамадзяніна Лакоты Уладзіміра Віктаравіча 29.08.1959 г.н., ураджэнца г. Касцюковічы, які пражываў па адрасе: г. Касцюковічы, пасёлак Будаўнікоў, дом 4, пакой 30. Апошняе месца жыхарства і знаходжання — 2008 год, г. Касцюковічы, пасля чаго звестак ад яго не паступала.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асоб, якія маюць звесткі пра грамадзяніна Лакоту Уладзіміра Віктаравіча, паведаміць іх суду Касцюковіцкага раёна на працягу двух месяцаў з дня публікацыі.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ С УСЛОВИЯМИ
на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) в г. Бресте

Предмет аукциона	Право на заключение договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий и сооружений) на земельном участке по ул. Куйбышева, 9, площадью 0,1904 га
Функциональное назначение земельного участка	Строительство объекта административно-торгового назначения, без права использования объекта под развлекательную функцию и общественное питание
Срок аренды зем. участка	5 лет
Объекты недвижимости, подлежащие сносу	Здания и сооружения КУП «ЖРЭУ г. Бреста» по ул. Куйбышева, 9
Снос объектов недвижимости производится в установленном законодательством порядке. Объект расположен в районе с развитой инженерной инфраструктурой	
Начальная цена продажи (руб.)	192 042 284
Сумма задатка (руб.)	38 400 000
Расх. по подг. земел.-кадастр. документации, тех. условий, АПЗ (руб.)	4 261 458
Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельных участков и сносом расположенных на них объектов недвижимости, возмещаемый победителем аукциона землепользователям	
Рыночная стоимость нежилых объектов недвижимости, руб.	**2 404 969 000**

Условия продажи:
- в день проведения аукциона будет подписан акт выбора места размещения земельного участка;
- в установленном порядке будет заключен с проектной организацией договор на разработку проектной документации на строительство объекта (с выделением при необходимости отдельных этапов) с учетом ее государственной экспертизы в срок, не превышающий двух лет, со дня утверждения акта выбора места размещения земельного участка;
- в срок, не превышающий одного года, со дня утверждения акта выбора места размещения земельного участка, будет предоставлен в ДУП «Проектный институт Брестгипрозем» генеральный план объекта строительства с проектируемыми инженерными сетями, разработанный в составе проектной документации – архитектурного проекта или утверждаемой части строительного проекта, с учетом прохождения в установленном порядке согласования в управлении архитектуры и градостроительства Брестского горисполкома, и заключен договор подряда на разработку проекта отвода земельного участка под объект строительства;
- в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения об изъятии и предоставлении земельного участка в аренду на р/с городского бюджета будут внесены суммы платежей, отраженных в протоколе о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в размерах, определенных соответствующим протоколом аукционных торгов в счет оплаты за предмет аукциона (победителем аукциона – в размере цены продажи, сформированной по результатам аукциона, а единственным участником – в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов) и компенсации расходов, понесенных городским бюджетом, по подготовке земельно-кадастровой документации, архитектурно-планировочного задания и технических условий на размещение объекта;
- до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка, подписания договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений), а также договора аренды земельного участка будут выполнены условия, предусмотренные в решении об изъятии и предоставлении земельного участка в аренду.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан приступить к освоению (занятию) земельного участка в течение шести месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство объекта).

Организатор торгов –
КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»

Аукцион проводится в соответствии Положением о порядке организации и проведения аукциона с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений), утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462, и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать юридические лица и индивидуальные предприниматели.

Перечень документов, представляемый участником аукциона: заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем** – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; **иностранным юридическим лицом** – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык; **представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель)** – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Порядок осмотра предмета аукциона (лота) осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. **Задаток в размере до 20% от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № 3012000002678 в филиале № 126 АСБ «Беларусбанк» г. Бреста, код 252, УНП 290433924.** В случае признания участника победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона, выразившим согласие на предоставление ему предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, данное лицо обязано в течение 10 рабочих дней с даты проведения торгов возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников.

Аукцион состоится 26 июля 2012 г. в 11.00
по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 605.
Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 21.06.12 г. до 17.30 20.07.12 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.)
по адресу: г. Брест, ул. Комсомольская, 46.
Контактные телефоны: 23 81 92, 23 18 13, 23 45 56.
Сайты: www.bgcn.by, www.city.brest.by и www.gki.gov.by

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «СтанкоГомель» (продавец) извещает о проведении 25 июля 2012 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16

№ лота	Наименование	Адрес объектов	Начальная цена продажи объекта, с учетом НДС, бел. руб.	Задаток, с учетом НДС, бел. руб.
1	Вертикально-сверлильный станок модели 2С132 (инв. № 9863), 1990 г.в.	г. Гомель, ул. Интернациональная, 10	29 280 000	2 900 000
2	Вертикально-фрезерный станок модели 6Т13Ф20-1 с ЧПУ (инв. № 9870), 1990 г.в.		42 000 000	4 000 000

Продавец: Открытое акционерное общество «СтанкоГомель», 246050, г. Гомель, ул. Интернациональная, 10.

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет Продавца (Открытое акционерное общество «СтанкоГомель») р/с 3012111882016 в Региональной дирекции № 300 ОАО «БПС-Сбербанк», УНП 400085002 МФО 153001369 **по 23 июля 2012 года до 17.00.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: ул. Гагарина, 20, каб. 2-16, г. Гомель от даты опубликования настоящего извещения **по 23 июля 2012 в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 17.00.**

К заявлению прилагаются следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении (информационном сообщении);

индивидуальным предпринимателем – копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица; иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией; представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона (имущество продается одним лотом) продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается продавцом в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в срок не позднее 20 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в сроки, определенные в договоре купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы по изготовлению и предоставлению участникам аукциона документации, необходимой для его проведения в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала аукциона. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с действующим гражданским законодательством Республики Беларусь, в т.ч. Положением ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Дополнительная информация по телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 74 17 34, 74 89 64 и на сайте gomeloblreklama.by

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

Государственное производственное объединение «Минскстрой»
220050, г. Минск, ул. К. Маркса, 13А
режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв 13.00–14.00, тел.: 327 52 36, 326 03 01

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Выполняя функции заказчика, объединением с 2006 по 2011 год построены и введены в эксплуатацию жилые дома:

- ул. Матусевича, д. 90, пр-т Рокоссовского, д. 76, д. 78, пр. Рокоссовского, 80, пр-т Независимости, д. 168, корп. 1, пр-т Независимости, д. 168, корп. 2, пр-т Независимости, д. 168, корп. 3, ул. Есенина, д. 40, ул. Есенина, д. 42, ул. Есенина, д. 36, д. 38, ул. Матусевича, д. 52, д. 72, ул. Папанина, д. 18, ул. Стариновская, д. 2, ул. Колесникова, д. 16, д. 18, д. 20.

Объединение осуществляет строительство объекта «Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-3. Жилой дом № 13 (по генплану)» в г. Минске.

Свидетельство (удостоверение) № 500/962-1762 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права собственности на него от 15.10.2009 г.

Земельный участок площадью 0,1873 га. Проектом предусмотрено устройство подъездов, пешеходных связей, установка малых архитектурных форм, озеленение, организация детских игровых, спортивных, хозяйственных площадок.

Здание жилого дома – 23-этажное, односекционное со встроенно-пристроенными помещениями общественно-торгового назначения, расположенными на первом и втором этажах. Количество жилых помещений жилого дома – 126. Серия жилого дома – индивидуальная.

Начало строительства – декабрь 2009 года.

Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию – декабрь 2012 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу от 26.05.2009 № 1164-5/09 с дополнением от 08.06.2011 № 384-15/11.

Договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться на строительство нежилых помещений – продовольственного магазина, кафе с магазином кулинарии.

Предметом договора будет являться строительство нежилого помещения.

Стоимость строительства 1 кв. метра площади по экспликации нежилых помещений без учета выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет: кафе с магазином кулинарии – 9 760 310 руб.; продовольственный магазин – 9 532 030 руб.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в долевую собственность, входят: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, элементы инженерной инфраструктуры, озеленения и благоустройства, а также отдельно стоящие объекты, служащие целевому использованию здания и право землепользования.

Договор строительного подряда от 03.12.2009 № 27/09, генподрядчик – ОАО «Стройтрест № 7».

Принятие и регистрация заявлений на участие в долевом строительстве нежилых помещений будет осуществляться через 7 календарных дней после опубликования проектной декларации в каб. 401, по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А.

Генеральный директор Н.В. Милошевский

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
по продаже земельного участка в частную собственность гражданам или негосударственному юридическому лицу Республики Беларусь 27.07.2012 г. в 11.00 в здании Обуховского сельского исполнительного комитета (аг. Обухово, ул. Центральная, 4) состоится аукцион по продаже в частную собственность земельного участка

Номер лота	Кадастровый номер и адрес земельного участка	Площадь земельного участка, га	Целевое назначение земельного участка	Вещное право	Начальная цена предмета аукциона, руб.	Подлежащие возмещению расходы, связанные с проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения, руб.*	Инфраструктура и условия инженерного развития земельных участков
1	2	3	4	5	6	7	8
1	422086006601000079, Республика Беларусь, Гродненская область, Гродненский район, Обуховский сельсовет, д.Новосёлки, участок № 2 (по генплану).	0,1209	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	Частная собственность	3 595 090	3 500 000	Ограничения в использовании земель в водоохранной зоне водных объектов, 0,1209 га

Для участия в аукционе гражданин или негосударственное юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) со дня опубликования настоящего извещения и **до 17.00 23.07.2012 г.** представляет в комиссию по организации и проведению аукциона на право заключения договора аренды и продажи в частную собственность земельных участков по адресу: **аг. Обухово, ул. Центральная, 4,** документы:

заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка, который предполагается получить в частную собственность по результатам аукциона;

заверенную копию платежного поручения о внесении задатка в размере 10 % от начальной цены предмета аукциона на расчетный счет Обуховского сельисполкома, филиал № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк» код банка 752 № **3600514060119**, УНН 500027360, назначение 04901 – продажа в частную собственность;

гражданин – копию документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

представитель гражданина – нотариально удостоверенную доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом негосударственного юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан и негосударственных юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанный в извещении срок соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток в размере, порядке и сроки, определенные в настоящем извещении.

Осмотр земельных участков осуществляется претендентами на участие в аукционе в сопровождении члена комиссии по организации и проведению аукциона в любое согласованное рабочее время в течение установленного срока приема заявлений.

Контактные телефоны: **974 071, 968 573, 968 787**.

Аукцион проводится при наличии не менее двух участников. Аукцион проводится в порядке, определенном Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденными постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462.

Шаг аукциона – 10 % от предыдущей цены, называемой аукционистом.

БЕЛАРУСКІЯ САНАТОРЫІ МЯНЯЮЦЬ АБЛІЧЧА

У гэтым можна пераканацца, калі завітаць у курортны пасёлак Нарач. На ўрачыстым адкрыцці лячэбнага корпуса санаторыя «Прыазёрны» Упраўлення справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь было заўважана, што гэта мерапрыемства можна лічыць другім днём народзінаў установы. Дарэчы, работы па мадэрнізацыі і абнаўленні лячэбнай базы санаторыя праводзіліся ў межах рэалізацыі дзяржаўнай праграмы развіцця Нарачанскага краю.

Санаторый не проста ўвёў у эксплуатацыю новыя аб'екты — змяніліся і падыходы ў абслугоўванні турыстаў. Прычым карыстацца паслугамі ўстановы могуць не толькі гаспадары пуцёўкі ў «Прыазёрны», а любы чалавек, які адпачывае на Мядзельшчыне. Ужо сёння ўрачы-тэрапеўты санаторыя працуюць без выхадных, і медыцынскія паслугі можна атрымліваць круглы тыдзень.

— Адпачывальнікі не павінны думаць пра тое, які сёння дзень тыдня — панядзелак ці нядзеля. Мы павінны быць мабільнымі і падстройвацца пад патрэбы людзей, каб неабходныя працэдуры і кансультацыі яны змаглі атрымаць тады, калі ім зручна, — заўважыў **дырэктар санаторыя «Прыазёрны» Дзмітрый РЫБКО.**

Трэба адзначыць, што з абнаўленнем базы дзяржаўнае прадпрыемства «Санаторый «Прыазёрны» зможа не толькі значна пашырыць пералік і аб'ём паслуг, але і заняцца раскручваннем адпачынку ў выхадныя дні.

— Сёння не так шмат месцаў, куды на выхадных можна выехаць, адпачыць, атрымаць пэўныя працэдуры і кансультацыі, прычым на высокім узроўні. Па сутнасці, да апошняга часу гэта заставалася праблемай, — заўважыў **начальнік дзяржаўнай установы «ЦэнтрКурорт» Алег МІХАЙЛАЎ.**

На санаторый «Прыазёрны» якраз і ўскладзена місія прывучыць беларусаў, якія раней выязджалі на адпачынак за межы рэспублікі, рабіць гэта дома.

Дарэчы, якімі вы ўяўляеце лячэбныя карпусы? Белыя сцены, чэргі каля працэдурных кабінетаў, санвузлы са старым абсталяваннем? Спадары, вы адсталі ад жыцця. Сёння санаторыі Беларусі мяняюць сваё аблічча. Нават знешне яны ўжо зусім не падобныя да тых установ, што працавалі яшчэ за савецкім часам.

Сучасны «Прыазёрны» больш нагадвае з густам аформленую гасцініцу, прычым і адпачынак ён прапануе не горшы, чым у замежных атэлях. Тут з'явіўся 20-метровы басейн з зонай для воднай гімнастыкі, абсталяваны воднымі пушкамі, масажным каскадам, ваннамі-джакузі, ёсць дзіцячы басейн з цёплымі фантанамі і атракцыёнамі. Да паслуг — комплекс з трыма відамі лазняў (рускай, турэцкай і фінскай) і пакоем штучнага лёду, памяшканнямі для адпачынку і рэлаксацыі.

Акрамя таго, дадайце да адпачынку яшчэ такі бонус, як аздараўленне. Профіль санаторыя — хваробы органаў кровазвароту, нервовай сістэмы, касцёва-мышачнай сістэмы і злучальных тканак, хваробы органаў страваванння. Сёння тут аказваецца больш за 70 відаў паслуг.

З'явіўся ў санаторыі і СПА-цэнтр, дзе праводзіцца 10 відаў масажу. У кожным з шасці кабінетаў цэнтра — свая атмасфера, свае дэталі, колеры, пахі, гукі. Прычым сярод жанчын, якія завіталі сюды, каб пазнаёміцца з новай паслугай санаторыя, былі і дасведчаныя дамы, якія пабывалі ўжо не ў адным СПА-салоне. Яны адзначылі, што СПА-цэнтр «Прыазёрнага» не саступае еўрапейскім.

Трэба сказаць, што санаторый не толькі змяніў «абалонку» і пашырыў паслугі. Вялікая ўвага надавалася навучанню ўсіх супрацоўнікаў. Медыкі, супрацоўнікі СПА, абслуговы персанал праходзілі навучанне ў лепшых у Беларусі спецыялістаў. Напрыклад, для пакаёвак было арганізавана навучанне ў чатырохзоркавым атэлі «Мінск».

— Безумоўна, каб ствараць усё тое, што мы сёння маем, давялося шмат паездзіць, — распавядае дырэктар санаторыя «Прыазёрны» Дзмітрый Рыбко. — Мы знаёміліся з тым, якія ў свеце ёсць падыходы да санаторнага лячэння, гасцінічнага бізнэсу і нават гасціннасці. Я асабіста ездзіў у Друскінінкай, абышоў усе лепшыя атэлі і СПА-комплексы. Каб нашы спецыялісты адчулі, як трэба працаваць, як стварыць пэўную атмасферу, іх адпраўлялі ў Літву. Яны жылі ў «СПА-Вільнюс», атрымлівалі СПА-працэдуры. І сёння я настройваю свой калектыў працаваць так, каб людзі зразумелі, што да нас варта прыязджаць.

У бліжэйшы час арганізацыяй адпачынку на выхадныя дні зоймуцца і іншыя санаторыі Беларусі.

— Плануем развіваць такія паслугі і, адпаведна, паляпшаць матэрыяльна тэхнічную базу ў санаторыі «Баравое», «Сосны». У бліжэйшы час пачнецца рэканструкцыя санаторыя «Юнацтва», рамонт будзе праведзены ў корпусе «Марскі», і ў хуткім часе гэты санаторый мы зробім такім жа шыкоўным, як «Прыазёрны» , — паведаміў **намеснік кіраўніка справамі Прэзідэнта Іосіф РОЛІЧ.** Іосіф Баляслававіч заўважыў, што ўжо сёння многія замежныя госці, якія знаёмяцца з беларускімі санаторыямі, маюць адчуванне, што яны трапляюць у Еўропу.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

СЁННЯ

Месяц

Маладзік 19 чэрвеня. Месяц у сузор'і Рака.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.37	21.46	17.09
Віцебск —	4.18	21.44	17.26
Магілёў —	4.27	21.36	17.09
Гомель —	4.33	21.23	16.50
Гродна —	4.54	21.59	17.05
Брэст —	5.04	21.50	16.46

Імяніны

Пр. *Васіля, Канстанціна, Фёдара, Яфрэма.*

К. *Аліцыі, Марты, Алоіза, Рудольфа, Тодара.*

ЗАЎТРА



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗВАНЫЯ ГОСЦІ ГОРШ ЗА...

У Пастаўскі раённы аддзел унутраных спраў мясцовая жыхарка паведаміла, што з яе дома зніклі 10 еўра, мільён рублёў і банкаўская картка. Адбылося гэта пасля гасцявання ў дамы непрацуючых 1985 і 1980 гадоў нараджэння. А да верхнядзвінскіх міліцыянераў звярнулася па дапамогу пенсіянерка, жыхарка вёскі Бароўка, якая паведаміла, што пасля таго як з яе дома сышла знаёмая, яна не змагла знайсці 3 мільёны рублёў. Было ўстаноўлена, што ў госці заходзіла жыхарка вёскі Жыгулі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

УСМІХНЕМСЯ

Каму ні скажаш, што хадзіў з жонкай у тэатр, дык першае пытанне — не «Нашто?», а «За што?».

Званок на радыё:

— Мой муж з'ехаў на дачу на ўсё лета. Пастаўце, калі ласка, песню: «Я так хачу, каб лета не канчалася...»

Мужчыны як кнігі: бываюць сумныя, бываюць цікавыя, а бывае, у іх грошы схаваны.

Жонка пытаецца ў мужа: «Ты паеў?» Той яе перадражнівае: «Ты паеў?»

Жонка: «Хопіць мяне перадражніваць!» Муж зноў: «Хопіць мяне перадражніваць!»

Жонка: «Я цябе кахаю!» Муж: «Так, я паеў».

■ Інфарм-укол

Каб не адолелі мікробы

Кішэчныя інфекцыі суправаджаюцца ванітаваннем, млосцю, расстройствам стулу, болем у жываце, павышэннем тэмпературы цела, што на доўгі час выбівае чалавека з каляіны. **Інструктар-валеолаг 23-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Ірына ШЫМАНСКАЯ** расказвае, як пазбегнуць такой непрыемнасці.

1. Старанна мыць не толькі рукі, але і ўсе паверхні і кухонныя прылады, якія выкарыстоўваюцца для гатавання ежы.

2. Аддзяляць сырыя і гатаваныя харчовыя прадукты. Аддзяляць сырое мяса, птушку і марскія прадукты ад іншых харчовых прадуктаў.

3. Для апрацоўкі сырых прадуктаў карыстацца асобнымі дошкамі для раздзелкі.

4. Добра праварваць прадукты (асабліва мяса, птушку, яйкі, марскія прадукты). Прычым сок у іх павінен быць празрыстым, а не ружовым.

5. Цеплавая апрацоўка прадуктаў пры тэмпературы 80 градусаў можа значна абараніць ад мікробаў.

6. Нельга пакідаць гатаваную ежу пры пакаёвай тэмпературы больш як на 2 гадзіны.

7. Гатаваныя стравы трэба трымаць гарачымі амаль да сервіроўкі стала.

8. Нельга доўга захоўваць гатаваную ежу нават у халадзільніку.

9. Нельга размарожваць прадукты пры пакаёвай тэмпературы.

10. Ужывайце толькі свежыя прадукты, не сапсаваныя гародніну і фрукты.

На што здольна сода

Пітной содай можна не толькі мыць посуд, але і... лячыцца.

❍ Добры сродак ад кашлю — 1 ч.л. соды ў гатаванае малако, прымаць на ноч.

❍ Можна рабіць содавыя інгаляцыі — сталовая лыжка на літр гатаванай вады.

❍ Ад насмарку — закапваць содавы раствор 2-3 разы на дзень.

❍ Кажуць, што раптоўны прыступ сэрцабіцця можна папярэдзіць, калі прыняць палову чайнай лыжкі соды.

❍ Сода — эфектыўны сродак ад укалыхвання ў транспарце.

❍ Першая дапамога пры цяжкіх траўмах, вялікай кровастраце, атручэннях, якія працякаюць з ванітамі і паносам, працяглай ліхаманцы. Содава-салявы раствор: палову ч. л. соды і ч.л. солі развесці ў адным літры цёплай гатаванай вады. Даваць па 1 ст. л. кожныя 5 хвілін.

❍ Калі змяшаць соду з мыльнай стружкай, можна праціраць гэтай сумессю твар двойчы на тыдні.

❍ Содай можна выдаліць налёт на зубах (галоўнае, моцна не церці).

❍ Сода не прыпыняе выдзяленне поту, але нейтралізуе яго кіслае асяроддзе. Карысна праціраць падпахавую ямку ваткай, змочанай у растворы соды — паху не будзе ўвесь дзень.

❍ Пасля працоўнага дня зняць стомленасць і ацёчнасць ног дапамогуць нажныя ванны з содай на (15 хвілін): 5 ст. л. на 10 л цёплай вады.

Святлана БАРЫСЕНКА

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 30.015. Індэкс 63850. Зак. № 2725. Нумар падпісаны ў 19.30 20 чэрвеня 2012 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12